891.7/2-3

Г 21

# ЦІШКА ГАРТНЫ

творы

1

ЦІШКА ГАРТНЫ

# ЗБОР ТВОРАЎ

З ПРАДМОВАЙ ПРОФ. М. ПІОТУХОВІЧА
І ПАРТРЭТАМ АЎТАРА

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

891.7З/-3
Г21

ЦІШКА ГАРТНЫ

# ЗБОР ТВОРАЎ

ТОМ ПЕРШЫ

ІНВ. ПРАВЕРКА 1948 г.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

Инв.
1954 г.

Вокладка і сарочка
мастака Б. Малкіна

Заказ № 29. 3.000 экз. (21½ арк.). Галоўлітбел № 279.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

## ТВОРЧАСЬЦЬ ЦІШКІ ГАРТНАГА

Зьміцер Тодаравіч Жылуновіч нарадзіўся 23 кастрычніка 1887 г. у м. Капылі. Яго літаратурны псэўдонім—Цішка Гартны. Гэта кароткае, але выразнае слова добра характарызуе сабою перш за ўсё жыцьцёвы шлях пісьменьніка. Бязрадае маленства ў беднай сям'і сялян-чорнарабочых, маленства, абагрэтае толькі ледзь прыметным блядым сьвятлом лучніка, апавітае нясьціханымі нудлівымі песьнямі енку і гора; вучоба ў багамольнага „дарэктара“ з яе нямінучымі атрыбутамі розных кар, як стаяньне на жарстве; ужо з 11 год—праца падпаска, кінуўшая адразу талентнага хлопчыка ў цёмны вір барацьбы за існаваньне; далей, брудная і смуродная майстэрня гарбара; бяспрытульнае вандраваньне па абшарах Беларусі; пецярбурскі завод, потым зноў беспрацоўе і г. д.—вось тыя колы жыцьцёвага пекла, праз якія прышлося прайсьці нашаму пісьменьніку на шляху барацьбы за існаваньне. Трагічнасьць гэтай асабовай барацьбы ўскладнялася для Гартнага яшчэ і тым, што яму трэба было змагацца за свой мастацкі талент. Рана, яшчэ з маленства, адчуў ён у сабе замілаваньне да мастацкага слова. Яшчэ падпаскам, гонячы каровы з поля, успрымае ён розныя вершы, якія переказваў яму Тодар Чарнушэвіч. У сваёй аўтобіографіі пісьменьнік адзначае, што тыя творы Някрасава, якія яму асабліва спадабаліся, як „Дедушка“ і „Жалезная дарога“, ён перапісваў і вучыў напамяць урыўкамі, „прысядаючы каля пянчукоў“. Ляпідарная нататка ў даным выпадку зарысоўвае жаласьлівы малюнак, варты памазка Шардэна; гэта смутная постаць вясковага хлопчыка, што схіліўся „каля пянчукоў“ над вершамі Някрасава, паказвае

нам усю трагічнасьць маленства талентнага самародка, яна прыадчыняе нам усю глыбіню нязбыўнага гора поэты-пастуха. Далей, па меры нарастаньня агульнай напружанасьці жыцьцёвай барацьбы, фарбы робяцца яшчэ больш змрочнымі. У другім месцы сваёй аўтобіографіі пісьменьнік дадае: „Вандруючы з 1908 па 1912 г. па Беларусі, я пісаў вершы, прозу і корэспондэнцыі ў дарозе, у вагонах, на вакзалах, у цесных і брудных каморках, у начлежках, пісаў пасьля работы 11-гадзіннай“. Такім чынам, шлях інтэлектуальнага самасьцьвярджэньня Цішкі Гартнага такі-ж цяжкі, як і шлях яго барацьбы за фізычнае існаваньне. Хлопчык, які першы свой дотык да горкіх карэньняў вучобы купляе дарагою цаною стаяньня на жарстве; бедны падпасак, постаць якога жаласьліва схіляецца „каля пянчукоў“ над вершамі Някрасава; юнак-поэта, вымушаны свае першыя творы пісаць у цесных і брудных каморках, у начлежках,—вось колы гэтага другога жыцьцёвага пекла беларускага пісьменьніка. На шчасьце, таленавіты юнак надта рана, яшчэ на парозе свайго сьвядомага жыцьця, пачаў уважліва прыглядацца да складаных соцыяльных абставін, якія атачалі яго; ён хутка сваім яшчэ юнацкім розумам пачаў цяміць, што пекла яго ўласнага жыцьця—гэта толькі маленькі куточак другога вялізнага, сапраўды дантаўскага пекла, якім была ўся Расія дарэволюцыйных часоў. Але юнак-поэта далёкі быў ад рэзыньяцыі дантаўскага надпісу; на фронтоне струхнелага будынку царскай Расіі бачыліся яму ня гэтыя поўныя роспачы словы: „пакінь надзеі ўсякі, хто ўваходзіць сюды“,—перад духоўным зрокам поэты на гэтым фронтоне вырысоўваліся грозныя: „мэнэ, факел, фарэс“; пісьменьнік пачаў рана ўсьведамляць, што соцыяльны лад, пабудаваны на няроўнасьці і эксплёатацыі, варты толькі таго, каб дашчэнту зьнішчыць яго. Справу зьнішчэньня гэтага ладу Цішка Гартны яшчэ з 1905 г. робіць справаю свайго жыцьця. З гэтага часу ён уваходзіць у склад соцыял-дэмократычнай організацыі; у сакавіку месяцы 1905 г. прымае ён удзел у вялізнай дэмонстрацыі, якая была наладжана ў Капылі з поваду ўгодкаў забойства Аляксандара II; у кастрычніку месяцы таго-ж году Цішка Гартны

прымае актыўны ўдзел у агульнай забастоўцы. Увесну 1906 г. Гартны, безмаль дзевятнаццацігадовы юнак, уваходзіць у камітэт Капыльскай організацыі соцыял-дэмократыі і з гэтага часу прымае ўдзел у рэволюцыйным рабочым руху; у 1913 г. ён робіцца членам міжраённага аб'яднаньня с.-д. у Пецярбурзе. Вышаўшы на інтэрнацыянальны шлях барацьбы рабочай клясы за сваё вызваленьне, Гартны адначасова не пакідае і межаў нацыянальных,—яму дорага было вызваленьне яго шматпакутнай бацькаўшчыны—Беларусі. Апроч удзелу ў агульным рабочым руху, ён з 1908 прымае ўдзел і ў беларускім адраджэнцкім руху, становячыся з гэтага часу сталым супрацоўнікам „Нашай Нівы". Калі ў 1917 г. пад націскам працоўных разбурылася самаўладзтва, Цішка Гартны ўвесь захапляецца рэволюцыйна-грамадзкай дзейнасьцю, працуючы, як член комуністычнай партыі, на адказных мясцох фронту грамадзянскай вайны... Адгрымелі гарматы гэтай вайны, жыцьцё савецкай дзяржавы пачало ўваходзіць у паласу спакойнага будаўніцтва,—на руінах старога трэба было будаваць новы гмах соцыялістычнай гаспадаркі і культуры, і ў гэты момант Цішка Гартны знаходзіцца ў першых шэрагах будаўнікоў, яму даручаюцца самыя адказныя пасады: у 1919 г. ён робіцца першым старшынёю Савету народных камісараў Беларусі, потым ідзе кіраўніцтва Беларускім дзяржаўным выдавецтвам адказная праца ў Наркамасьветы і г. д.

Такім чынам, на ўсім жыцьцёвым шляху пісьменьніка каляровай істужкай разгортаецца праца рэволюцыянэра і будаўніка грамадзкае ў яго дзейнасьці пераважае асабовае, індывідуальнае.

Узятае ўцалку ўсё жыцьцё Цішкі Гартнага запоўнена адным зьместам. На сваіх плячох яму прышлося вынесьці ўсю цяжкасьць патройнай барацьбы: барацьбы за фізычнае існаваньне, за свой мастацкі талент і за вызваленьне рабочай клясы і працоўных Беларусі. У вогнішчы гэтай барацьбы сапраўды загартавалася асоба пісьменьніка, загартавалася яго воля, выпрацавалася магутная актыўнасьць, выхавалася жалезная мэтаімкнёнасьць да перамогі. Беларускі пісьменьнік у

сваім жыцьці сапраўды прадстае перад намі, як Гартны: гэты літаратурны псэўдонім дае нам як-бы згустак яго носьбіта.

Вытокі творчасьці Цішкі Гартнага пачынаюцца яшчэ ў данашаніўскі дарэволюцыйны пэрыод беларускай літаратуры.

У 1913 годзе ў Пецярбурзе вышаў першы зборнік яго лірычных твораў пад назваю „Песьні“, дзе Цішка Гартны выступае пераважна як пясьняр асобавых індывідуальных пераживаньняў: тры чвэрці зборніка займаюць „Песьні каханьня“ і потым „Жальбы і жаданьні“; разьдзел „Песьні працы“ таксама грунтуецца на асабовай аўтобіографічнай падставе („Песьні гарбара“, „Гарбар на вандроўцы“ і інш.). Шчыры лірызм, які бруіць непасрэдна з самага сэрца, становіць сабою дадатны бок гэтых першых песень Цішкі Гартнага, але ідэёвы бок іх вызначаецца вузкасьцю: вычэрпваецца двума мотывамі— мотывамі працы і свабоды, прычым свабода бярэцца як нейкае абстрактнае паняцьце:

Я убачыў яе аддалёк
Сярод ночы цямлівай, глухой,
Што ўбірала яе ў цёмны змрок
І пяяла літаньні над ёй.

*(„Свабода“).*

Калі свабода стала фактам, калі адбылася рэволюцыя, то яна акрыліла музу песьняра; зьявіліся новыя крыніцы яго творчасьці; з гэтых жыватворчых крыніц вынікаюць „Песьні працы і змаганьня“ (Бэрлін, 1922 г.).

Тут дыяпазон творчасьці поэты робіцца значна шырэйшым. „Песьні працы і змаганьня“ грунтуюцца ня толькі на аўтобіографічнай аснове: апроч працы гарбара, якая была знаёма Гартнаму па асабістай спробе, тут абмаляваны і другія працоўныя процэсы („Каваль“, „Ткачыха“, „Песьня жняі“, „Касьба“ ды інш.); кола назіраньняў поэты значна павялічваецца.

Узятыя ў цэлым песьні першага разьдзелу—гэта натхнёны гімн працы: у іх адбіта псыхолёгія працоўнага чалавека, абмалявана трагедыя беспрацоўя, якое нясе з сабою ня толькі матэрыяльныя, але, галоўнае, моральныя пакуты.

Лепшымі ў зборніку зьяўляюцца яго „Песьні змаганьня“; яны прысьвечаны сучаснасьці, у іх выявілася захапленьне песьняра рэволюцыяй; яго радасьць перамогі ў цяперашнім і пэўнасьць у будычыні; бадзёры ўздым барацьбіта і жыцьцярады оптымізм рэволюцыянэра афарбавалі сабой „Песьні змаганьня“,—Цішка Гартны выступае тут як пясьняр Кастрычніка.

Далейшы і пры гэтым найбольш значны крок наперад у разьвіцьці мастацкай лірыкі поэты становіць сабою яго трэці зборнік „Урачыстасьць“ (Менск, 1925 г.).

У Цішкі Гартнага заўсёды зьяўляюцца характарнымі самыя назвы яго зборнікаў; яны трапна адзначаюць галоўны тэматычны кірунак таго ці іншага зборніка, падкрэсьліваючы яго асноўныя рысы і асаблівасьці.

„Песьні“—гэта проста песьні бяз пэўнай тэматычнай установкі ў цэлым. „Песьні працы і змаганьня“—тут ужо самая назва выяўляе два тэматычныя колы, якія ахопліваюць сабой зьмест данага зборніка. Назва трэцяга зборніка таксама вельмі адпавядае яго агульнаму характару. Тут сапраўды выяўлена „ўрачыстасьць“—успрыманьне жыцьця, як чагосьці сьвяточнапекнага, прыгожага ды адначасна ўзвышанага.

У зборніку дзьве часткі, органічна адна з аднэй зьлітыя: „Урачыстасьць рэволюцыі“ і „Урачыстасьць жыцьця“. У першым разьдзеле знайшоў сабе вышэйшы выраз рэволюцыйны патос аўтара. Гэты патос яшчэ больш уздымаецца ў параўнаньні з папярэднім зборнікам, дасягаючы тут свайго кульмінацыйнага пункту, даходзячы часам да нейкага экстазу ў захапленьні сучаснасьцю. Пекнай зьяўляецца рэволюцыя ў сваім развоі:

Яна ідзе:
Ў зялёнай пышнай руні,
Ў развойным шумным веснаходзе,
На стрэчу царственнай свабодзе,
Ў абдымы сьветлае Комуны.

*(„Яна ідзе“).*

Руйнуецца стары сьвет, але ў гэтым руйнаваньні ёсьць свая прыгожасьць, як ёсьць яна ў бурнай навальніцы. Атмос-

фэра катаклізму, зрухаў—родная стыхія поэты; гэтую стыхію ён называе сваёй, кажучы аб ёй:

Ў буры, ў навальніцы,
Ў громе, ў бліскавіцы,
У сіберным гулу
Ветранае сілы,
Ў хваляваньні мора,
Ў калыханьні бору—
Многае мне міла,
Многае мне блізка.

*(„Мая стыхія“).*

Бадзёра ды ўпэўнена глядзіць поэта на будучыню: нішто ня можа спыніць стыхійнага руху рэволюцыі, ніхто ня можа кола гісторыі павярнуць назад. Самыя цяжкія нягоды, як, напрыклад, падзел роднае краіны,—гэта толькі часовая зьява, толькі часовыя плямы на агульным сьветлаперыможным шляху рэволюцыі:

Ня скрыць сузор'яў цені ночы,
Вясны марозу ня спыніць.

Вечнае для поэты ў тым, што „ўперадзе сьвецяць—агні“, насустрач гэтым агнём імкнецца муза песьняра.

Такі даецца ў Цішкі Гартнага сынтэтычны малюнак рэволюцыі ў яе пераможным і нясупынным развоі—малюнак, абагрэты настроем бадзёрага ўздыму з боку аўтара. Але часам гэты агульны сынтэтычны малюнак разьбівзецца на часткі, поэта малюе дробныя праявы сучаснасьці, выхапляе з яе паасобныя кавалкі жыцьця, з якіх складаецца каляровае цэлае нашых дзён. Поэта, напрыклад, вітае зьезд саветаў, малюе сельскі мітынг, замілавана спыняецца на вобразе рабфакаўца, які грызе „граніт навукі“, упарта і рашуча змагаючыся з рознымі перашкодамі на шляху вучобы.

Тэматыка разьдзелу „Урачыстасьць рэволюцыі“, такім чынам, становіць сабою часткова далейшае пашырэньне і паглыбленьне мотываў, якія ўжо намячаліся ў песьнях змаганьня. І там поэта апяваў стыхійны ўздым рэволюцыі, яе нясупыннасьць, яе пераможны развой, і там маляваў дробныя мініа-

туры, выхапленыя з сучаснай рачаіснасьці. Але дыяпазон творчасьці ў зборніку „Урачыстасьць“ значна шырэйшы. Пясьняр выходзіць тут за межы Беларусі і Савецкага Саюзу. Ён часткова занатоўвае свае ўражаньні ад падарожы ў Нямеччыну. Поглядам поэты-пролетара акідае ён сучасны Бэрлін; пад мішурнай абалонкай, поўнай надворнага бляску, бачыць ён тут хваравітае нутро, якое разьядаюць унутраныя соцыяльна-клясавыя супярэчнасьці.

Але вартасьць зборніка ня толькі ў гэтым топографічным пашырэньні творчасьці поэты; галоўная асаблівасьць „Урачыстасьці“ ў тым, што тут больш сакавітай і яскравай зьяўляецца эмоцыянальная афарбоўка рэволюцыйных тэм; тут выяўляецца сапраўдная пролетарская эстэтыка песьняра, эстэтыка рэалістычная, далёкая ад якой-небудзь містыкі, ад якога-небудзь імкненьня ў невядомыя далі. У сучаснасьці, у пераможным разьвіцьці рэволюцыі поэта знаходзіць свой вышэйшы ідэал хараства. Але сучаснасьць—гэта толькі асноўны адыходны пункт эстэтыкі Цішкі Гартнага. Рэволюцыя, праходзячы праз сьвядомасьць поэты, адкідае далёка ад сябе праменьні хараства на ўсё існуючае; і ўвесь космос, уся прырода перад зрокам поэты-барацьбіта стаіць у сваім сьвяточным убраньні. Так органічна нараджаецца другі цыкль зборніка „Урачыстасьць жыцьця“, які знаходзіцца ў цеснай сувязі з першым цыклем „Урачыстасьць рэволюцыі“. Поэта моцна адчувае хараство прыроды, яго вабяць да сябе чары ночы, чары вясны; ён імкнецца нібы растаць у бяздоньні прыроды, зьліцца з ёй,—адсюль прызнаньне:

У маёй душы—любові мора
Да вас, зялёныя гаі,
Да вас, міргаючыя зоры,
Да вас, захмарныя краі.
Вялікай сілай сьветавою
Мая істота ўся гарыць.
І прагне сэрца маладое
З прасторам вечным крэпка зьвіць.

Але Цішка Гартны далёкі ад ідылічнага назіраньня прыроды; яна сваім адвечным рухам абуджае сугучныя настроі

ў душы поэты: дзівы і чары прыроды клічуць яго не да супакою і цішы,—наадварот, яны:

Трывожаць душу, родзяць зовы
Ляцець-ляцець, зьнябыўшы жаль,
Шукаць красы вавекі новай,
Здымаць заслону з цёмных даль...
Ляцець і сэрцам гартавацца
І душу ўзмоцніваць ў агні,
Каб сілу мець вавек змагацца
За волю й шчасьце на зямлі...

Такім чынам, прырода абуджае ў песьняра імкненьне да напружанага жыцьця, такога-ж поўнагучнага і шырокага, як поўнагучны і шырокі рытм космосу. У сфэры грамадзкай—мы бачылі—у поэты абуджаецца прагнасьць барацьбы, у сфэры асабовай этыкі ў яго ўзьнікае імкненьне да жыцьця, багатага зьместам. Зарука гэтага багацьця—імкненьне ва ўсё новыя і новыя далі; поэта ня любіць спыненьня, само слова „годзе“ для яго нешта сібернае, бо там, дзе пануе гэта „годзе“,—там холад застою, духоўнага акасьцяненьня, там холад магілы; поэта, наадварот, прагне

...быць там, дзе дрыжыць калыханьне жыцьця,
Дзе нябачны, а моцны развой яго ходзе.

*(„Зьлітасьць“).*

У другім месцы ён кажа:

Душой шчасьлівы, палкі сэрцам,
Хачу я жыць, кіпуча жыць.

Гэтае кіпучае жыцьцё мысьліцца, як жыцьцё сугучнае з прыродай; у поэты зьяўляецца жаданьне „белым матылёчкам, лёгкім ды вяртлявым“ аблятаць зялёныя прасторы, калыхацца за адно з ветрыкам нячутным, крылатай птушкай насіцца „у моры праменнага сонца“ і г. д. У Цішкі Гартнага, такім чынам, мы знаходзім некаторы выраз косьмізму, гэтай асобнай настраёвасьці зьліцьця з сусьветам, якая была ўласьціва шмат якім пролетарскім поэтам сучаснасьці і выклікала адмоўную ацэнку з боку некаторых крытыкаў (Воронскі, Дубоўскі, Троцкі і інш.), але косьмізм Цішкі Гартнага далёкі ад містычнага парыву да

бязьмежнага, ён пазбаўлены элемэнтаў надзвычайнага гіпэрболізму, штучнага патосу („візгізму“, паводле гіронічнай тэрмінолёгіі Дубоўскага) і ўцёкаў ад жыцьця; гэты косьмізм носіць у беларускага песьняра больш натуральны характар і вытрыманы больш у рэалістычных, чым фантастычных, тонах. Косьмізм Цішкі Гартнага—гэта свайго роду мастацкае сьветаадчуваньне, якое ўзьнікае на глебе рэальнага адухаўленьня прыроды і зьліцьця з ёй чалавечай асобы. Такое сьветаадчуваньне поэты ў сваю чаргу становіць сабой вынік яго эстэтыкі і этыкі. Эстэтыка песьняра адзначаецца, як мы бачылі, захапленьнем яго пекнасьцю рэволюцыі і пекнасьцю сусьвету; этыка поэты выяўляецца ў яго імкненьні да напружанага і шырокага жыцьця—жыцьця інтэнсыўнага і экстэнсыўнага, кажучы словамі Гюйё. Такім чынам, радасьць быцьця—вось той цэнтральны пункт, дзе сходзяцца паасобныя ніткі эстэтычнай і этычнай настраёвасьці Цішкі Гартнага. Як натуральны вынік гэтай радасьці быцьця, якая насычае сабой усю духоўную істоту песьняра, зьяўляецца косьмізм поэты: віно хмельнай радасьці выплёскваецца з свайго келіха, поэта адчувае сябе часткай цэлага.

Але ня толькі ў разрэзе эстэтычным і этычным выяўляецца ў зборніку „Урачыстасьць“ поэтычнае сьветаадчуваньне Цішкі Гартнага: яно выяўляецца тут і ў разрэзе онтолёгічным, агульнафілёзофскім.

У поэзіі Цішкі Гартнага мы знаходзім некаторыя адзнакі дыялектычнага погляду на сьветабудову. Для песьняра нічога няма застылага, акамянелага; для яго прырода і жыцьцё—ня статыка, а бязупынны рух, бязупынная дынаміка. Усё, уключаючы і псыхічныя зьявы, для поэты толькі

Нязжытое праяўленьне
Сілы творчай ў вечным лёце,
Што захована ў істоце
Размаітага тварэньня.

*(„Мая хата—постаць нівы...“).*

Так, падстава космосу для Цішкі Гартнага—творчая сіла ў вечным лёце: усё цячэ, усё зьмяняецца; жыцьцё—гэта про-

цэс, і прытом процэс, які разьвіваецца з супярэчнасьцю. Выходзячы з такіх поглядаў на жыцьцё, як дыялектычны процэс, поэта трапна асьвятляе некаторыя вобразы прыроды. Напр., колькі поэтаў апявалі восень, як сумную пару году! Накідваць на восень змрочны флёр жалобы зрабілася свайго роду трафарэтам у поэзіі. У беларускай творчасьці, напрыклад, Алесь Гарун рысуе восень заўсёды ў змрочных фарбах, гаворачы аб ёй:

Восень халодная, чорная, хмурая
Сунецца ціха, нячутна штодзень.
Хварбы наўкола паклала панурыя,
Сонца хавае за чорную цень.

Янка Купала зьвяртаецца да восені з такім трагічным зваротам:

Восень панурая, восень маўклівая
Страшна ты чуткаму сэрцу душы.

У расійскай поэзіі нават Пушкін, для якога, як вядома восень была ўлюбёнай парой году, які называў яе „очей очарованьем“, сьпяшаецца дадаць і другі сумна-контрастны эпітэт: „унылая пора“.

Для большасьці поэтаў восень—гэта нібы спыненьне жыцьця. Для Цішкі Гартнага, які бачыць у прыродзе бязупынны рух, бязупынны процэс разьвіцьця з супярэчнасьцяй, восень—толькі адна з доўгага ланцуга супярэчнасьцяй; поэта піша:

Мне кажуць: восень—заміраньне,
Жуды глыбокай час ўрачысты...
А я кажу: хто глыбей гляне,
Той жыцьця ўгледзіць промень, іскры!

І ў цэлым шэрагу папярэдніх вобразаў зялёнай руні палёў, „хмар мяккіх“, „шоўку шамкага“, „пухкіх лісьцяў“ і г. д. пясьняр выяўляе гэты жыватворчы промень.

Але, бачачы ў жыцьці прыроды такі бязупынны процэс, Цішка Гартны бачыць у ім цесную органічную сувязь паасобных частак ды зьяў. У гэтай галіне, як і заўсёды, поэтычныя вобразы становяць сабой вынік пэўнай сыстэмы сьветаадчуваньня песьняра, якое абумоўлена яго соцыяльнай прыродай.

Поэта-індывідуалісты заўжды бачыць і ў вакольнай прыродзе пераважна адмяжованасьць, спыняецца на абмалёўцы ізоляваных зьяў і прадметаў. Такі поэта з замілаваньнем малюе адзінокі месячык на небе, адзінокія зоркі, адзінокія хмары—вобразы, якія таксама зрабіліся шаблёнам у поэзіі. У зусім іншым аспэкце прадстаўляецца прырода вачом поэты-колектывістага: ён пераважна ў надворным сьвеце будзе бачыць злучнасьць і зьлітасьць рэчаў. Напрыклад, ва ўспрыманьні пролетарскага поэты Самабытніка, зоркі—гэта колектыў неба, які змагаецца з цемрай („Моим собратьям"). Кірылаў апявае „Голубых созвездий созвон". У поэзіі Казіна ўвесь космос прадстаўляецца, як „синекаменный завод", дзе сонца, хмаркі, маланка і ўсё іншае працуюць, як людзі. Цішка Гартны таксама назірае ўзаемную злучнасьць і зьлітасьць рэчаў. Ён далёкі ад таго, каб апяваць адзінокі месячык і адзінокія зоркі; у яго, наадварот:

Цеснай роднай сям'ёй
Зоркі з неба ўсяго
Міргацяць над зямлёй.

*(„Начныя чары").*

У другім месцы сонца выступае ў Цішкі Гартнага як барацьбіт, які змагаецца з цемрай („Каля бору сонца ходзіць"), і мастацкая ўвага яго, далей, спыняецца на сузор'ях, якіх ня „скрыць цемні ночы" ды інш.

Так, зборнік „Урачыстасьць" становіць сабою яскравы выраз бадзёрага сьветаадчуваньня песьняра, які бачыць усюды рух, дынаміку барацьбы і адначасна ўзаемную сувязь рэчаў. Прасякнуты такімі бадзёрымі настроямі, Цішка Гартны адгукаецца на ўсё пекнае і прыгожае: і рэволюцыя, і прырода, і ўсё жыцьцё ў цэлым стаіць тут у сваім сьвяточным убраньні; нават народная фантастыка не абмінута поэтай; у яго выступаюць цені—

Доўгакосых
Тоўстаносых,
Цёмнатварных
Грозных, ярых
Лясуноў.

На зьмену ім вынікае іншая, больш пекная зьява:

Шнуруюць скокам ёмкім
Німфы-ведзьмы, фэі-панны.

Рачаіснасьць і фантастыка, праўда жыцьця і мара, такім чынам, стаяць тут у Цішкі Гартнага ў адзіным абагульняючым сынтэзе.

Ня толькі тэматыка лірыкі Цішкі Гартнага значна пашыраецца зборнікам „Урачыстасьць“: тут заўважваюцца пэўныя дасягненьні і ў галіне формальна-мастацкай, галоўным чынам, у галіне эўфоніі і рытмікі. Цішка Гартны зьяўляецца тут зусім у новай постаці музычнага песьняра, які трапным злучэньнем асонансаў і алітэрацый можа ўтвараць сапраўдныя гукавыя мэлёдыі. Напрыклад, яго „Сымфонія“ становіць сабою сапраўды музычны твор:

Мята, рожа, півонь,
Вішань сьвежых чырвонь—
Пах, мілаваньне...
Ветру павей у лісткох,
Дрэўцаў ціханькі ўздох—
Рух, калыханьне.

Тут і рытм, і самы падбор гукаў, і злучэньне рыфм,—усё робіць музычнае ўражаньне.

Цішка Гартны шукае новых для сябе рытмаў, у якіх можна было-б адбіць наш хуткабежны час. І сапраўды, некаторыя яго вершы адбіваюць рытм працы і рытм барацьбы. Яго верш „Праца“ перадае грукат і вярчэньне „працьмы кол“, якія—

Нясупынна,
Стройна, чынна
Ўюць кругі чарадою.

Трапныя гукавыя вобразы тут сапраўды даюць нам уяўленьне таго, як—

Шасьцярні
мятусяцца,
Імчацца
Стралою
Пасы.

Другі прыклад: у вершы „Яна ідзе“ ў самым рытме мы сапраўды адчуваем цьвёрдыя крокі рэволюцыі, якая ў полымі барацьбы ідзе ўперад.

Форма, такім чынам, у Цішкі Гартнага вельмі часта адпавядае зьместу. Пясьняр руху, дынамікі знаходзіць адпаведныя рытмы, якія адбіваюць гэтую дынаміку; „Урачыстасьць“ становіць сабою мастацкае цэлае.

Але постаць лірыка—гэта толькі адзін бок мастацкай істоты Цішкі Гартнага; творчасьць яго вызначаецца сваёй жанравай рознастайнасьцю: Гартны—поэта-лірык, драматург і адначасна бэлетрысты. І можна сказаць, што ў разьвіцьцё беларускай мастацкай прозы пісьменьнік даў асабліва значны скарб як у адносінах колькасных, так і якасных. Гартнаму належаць у данай галіне наступныя творы: зборнік апавяданьняў „Трэскі на хвалях“ (Менск, 1924); першы ў беларускай літаратуры соцыяльна-псыхолёгічны роман „Сокі цаліны“, які вышаў пакуль-што ў дзьвюх частках (1-я ч. „Бацькава воля“, Бэрлін, 1921 г. і 2-я ч. „На перагібе“, Менск, 1926); нарэшце, апошні зборнік „Прысады“ (Менск, 1927 г.).

3303

На кожным з гэтых твораў мы спынімся паасобку. Сам аўтар дае нам тлумачэньне назвы свайго першага прозаічнага зборніку „Трэскі на хвалях“. Сэнс вобразу выкрываецца ў перажываньнях героіні апавяданьня „На новым месцы“. Акіліна, як кажа пісьменьнік, „стала цёсачкай, якая плавае на бурных хвалях жыцьця; адны з іх пакорна плывуць па цячэньні, другія змагаюцца“. Адсюль у зборніку дзьве істотныя тэмы: пакуты людзей і іх барацьба.

Гэтыя дзьве галоўныя тэмы Цішка Гартны распрацоўвае ў аспэкце соцыяльна-псыхолёгічным; пісьменьнік выкрывае нам трагічныя колізіі ўнутраных перажываньняў, ён выкрывае нам глыбіню людзкіх пакут і адначасна выяўляе прычыны гэтых пакут, якія таяцца ў ненормальных соцыяльных умовах дарэволюцыйнага ладу жыцьця. І вось перад намі ў апавяданьнях зборніка праходзіць даўгі рад пакутнікаў, якія зрабіліся ахвярамі гэтага ладу, поўнага супярэчнасьцяй соцыяльна-экономічнага парадку. Пісьменьнік імкнецца ўзварушыць нас

усёй глыбінёй чалавечага гора, ён расчыняе прорву трагічных колізій і сутычак, жыцьцё дарэволюцыйнага часу стаіць перад намі ў змрочных фарбах уціску і пакуты. Пісьменьнік, напрыклад, вядзе нас у бедную сялянскую хату; маленькі хлопчык Янка тут зьяўляецца ўжо працоўнай сілай, служыць у пана, але цяжкія ўмовы службы, панскі зьдзек прыгнятаюць чулую душу хлопчыка; дарэмна шукае ён паратунку ў маці, уцякаючы да хаты; беднасьць прымушае маці вярнуць сына эканому, няшчасны Янка ня вытрымлівае пакуты і канчае жыцьцё самагубствам („Лайдак“). Тут беднасьць, соцыяльныя супярэчнасьці паказаны ў трагічным асьвятленьні: беднасьць руйнуе нормальныя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, яна зьнішчае нават інстынкт самазахаваньня, соцыяльныя фактары аказваюцца больш моцнымі, чым біолёгічныя. У такім-жа трагічным асьвятленьні паказана беднасьць і ў апавяданьні „Вялікодная каробка“. У героя гэтага апавяданьня, беднага рамесьніка Антона Ступы, сваё цяжкае гора; ён ня можа справіць вялікоднага стала, ня можа нават і ў сьвята парадаваць сям'ю; у ваччу яго ўвесь час стаяць галодныя тварыкі дзяцей; добрасумленны чалавек лютай беднасьцю даводзіцца да злачынства: ідзе красьці. Гэтай тэме выпадковага злачынства асабліва пашанцавала ў беларускай літаратуры; раней яна выяўлена была Якубам Коласам у апавяданьні „Малады дубок“, зачэплена Бядулям у творы „Сярод ночы“. Але ў Цішкі Гартнага і ў даным выпадку ёсьць свая ўстаноўка: ён імкнецца пераважна выявіць трагічны бок соцыяльных супярэчнасьцяй, паказаць беднасьць у яе руйнуючым аспэкце. З гэтага трагічнага патосу аўтара вынікае ў яго прыём антытэзы: злачынства паказана на фоне сьвяточнага побыту, і такі фон яшчэ больш адцяняе трагічнасьць становішча героя; псыхіка яго сапраўды—„бяздонная студня, поўная гора і сьлёз“. Напрыклад, вельмі трапна перададзены перажываньні Антося Ступы ў вялікодную ноч: „... Чулася навокал нейкая ўрачыстасьць, але на душы Антося было брыдка: ён ішоў на звон, пакінуўшы ў дому засмучоную жонку і пакрыўджаных дзетак. Уся ўрачыстасьць была для яго ня толькі чужою, а нават і ва-

рожаю. Гэта адчуваў Антось з таго моманту, калі выясьнілася, што надышоўшае сьвята прынесла многа дарэмных клопатаў і парушыла наладжаную ходу жыцьця. Чуючы звон і бачачы сьвяточны рух, ён даходзіў да злосьці і праклінаў сваё жыцьцё і грамадзкі лад. Антося дзівіла ўся заблытанасьць і супярэчнасьць яго, якая выглядала перад ім ва ўсёй сваёй прыкрасьці. Вялікае сьвята для адных—другім цяжкая мука і клопаты. Чаму гэта так?“ (стар. 19—20).

У апавяданьні „Распусьніца“ малюецца сямейная трагедыя, але і гэта апошняя, як заўсёды ў Цішкі Гартнага, угрунтавана на пэўнай соцыяльнай аснове. У даным творы перад намі выступае гаротная сям‘я, пакінутая гаспадаром, які зьехаў у Амэрыку: жонка, ня маючы сродкаў да існаваньня, робіцца распусьніцай; у душы дачкі, маленькай Анелі, сьпее пачуцьцё помсты і абурэньня проці бацькі—вінавайцы разбурэньня сям‘і. Пісьменьнік схапляе журбліва-драматычны момант, калі гэтыя пачуцьці дзіцятка моцна выбіваюцца вонкі: Аўдоцьця піша ліст чалавеку, і маленькая Анеля дыктуе ёй словы, поўныя злосьці на бацьку. „Напішы, матулька, кажа яна, што я лічу яго нашым згубіцелем, катам нашым“ (стар. 33). У гэтых простых і ў сваёй прастаце жудасных словах выказваецца ўся глыбіня чалавечага гора, якое забівае натуральна позытыўныя адносіны дзяцей да сваіх бацькоў і пераварачае іх у яскрава нэгатыўныя, калі бацька ў сьвядомасьці дачкі стаіць у постаці ката і згубіцеля.

Вобраз абяздоленай сям‘і зьмяняецца ў Цішкі Гартнага вобразам беспрацоўных, якія бяздомнымі тулягамі бадзяюцца па сьвеце, і ў якіх люты лёс адбірае астатні прамень надзеі.

Так, у абмалёўцы Цішкі Гартнага людзі—нібы тыя трэскі на бурліва-пеністых хвалях жыцьця. Такімі хвалямі, папершае, зьяўляюцца жалезныя законы экономікі: беднасьць, соцыяльныя супярэчнасьці парушаюць нормальны ход жыцьця і зьяўляюцца галоўнымі крыніцамі людзкіх пакут; яны руйнуюць нормальныя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, яны даводзяць да злачынства, самагубства і распусты, робяць людзей тулягамі.

Але агульная концэпцыя жыцьця ў беларускага пісьменьніка далёка ад змрочнага фаталізму, у яго мы хутчэй знаходзім здаровы дэтэрмінізм. Пісьменьнік заўсёды паказвае абумоўленасьць чалавечых учынкаў надворнымі соцыяльна-экономічнымі фактарамі, але гэтыя фактары стаяць перад ім не як нейкая таемная „мойра“, а рысуюцца яму ў выглядзе надворных умоў, над якімі магчыма перамога. Шлях да гэтай перамогі—шлях барацьбы. Адсюль у творчасьці Цішкі Гартнага органічна вынікае мотыў барацьбы; гэты мотыў ён падае ў розных аспэктах. Пісьменьнік, папершае, малюе нам барацьбу ўнутраную, якая адбываецца ў душы чалавека; ён вельмі трапна выкрывае розныя душэўныя колізіі і сутычкі. Амаль кожнае яго апавяданьне мае даную псыхолёгічную сытуацыю. Напрыклад, у памянёным ужо апавяданьні „Вялікодная каробка“ з пачатку да канца праходзіць перад намі ўнутраная трагедыя Антося Ступы, у душы яго сутыкаюцца ў цяжкі конфлікт здаровае сумленьне і бацькаўскі інстынкт, пачуцьцё жалю да дзяцей. Той-жа псыхолёгічны конфлікт становіць сабою і аснову апавяданьня „Штрэйкбрэхер“, дзе абмалёвана сутычка паміж бацькаўскім інстынктам і таварыскім абавязкам, працоўнай солідарнасьцю: сьвядомы рамесьнік Анупрэй у часе забастоўкі ня можа выцярпець галадоўлі свае сям‘і і дапушчае зраду сваім таварышом, але пасьля гэтай зрады ён перажывае цяжкія пакуты. „Праз усю ноч Анупрэй ня мог супакоіцца і заснуць як сьлед. Толькі надыходзіў сон, плюшчыліся вочы і мярцьвела цела, як раптам унутры штосьці адрывалася, прабягала па ўсёй постаці калючая дрыготка—і сон прападаў. Чарадой віліся горкія думкі-сумленьні, і натужана працавалі мазгі над пытаньнем, як-жа назавецца яго паступак“ (стар. 75). „Слова „штрэйкбрэхер“, як малатком, стукнула яму па галаве, разьліваючы ўнутры балючую трывогу“ (стар. 78). Малюнак унутранай барацьбы разьвінаецца і ў другіх апавяданьнях пісьменьніка. У апавяданьні „Больш за ўсіх“ паказана барацьба ў душы героя Платона Кічкі паміж рэволюцыйным абавязкам і пачуцьцём любасьці да хворай і канаючай маці. Герой апавяданьня—сьвядомы,

загартаваны ў барацьбе рэволюцыянэр; для яго справа рэволюцыі, грамадзкія абавязкі—вышэй асобных адносін. „Дзеля рэволюцыі ён ахвяраваў пачуцьцём каханьня, пакінуўшы без адказу просьбу каханай дзяўчыны не выяжджаць на падпольную працу пры немцах. Дзеля ідэі рэволюцыі ён забываў бацькоў, ня ведаючы, як яны жывуць, як іх становішча пад палякамі". Але адначасна ў душы Платона Кічкі ў момант хваробы яго маці адбуджаюцца глыбокія пачуцьці спагады і жалю да хворай, і гэтыя пачуцьці сутыкаюцца з усьведамленьнем рэволюцыйных абавязкаў. У апавяданьні „Помста" маем конфлікт паміж рэволюцыйным героізмам і дробязямі жыцьця. На працягу досыць вялікага твору „Панкел Ліпа" праведзена драматычная колізія паміж абавязкам чырвонаармейца ды іншымі рухамі душы, якія адхіляюць героя апавяданьня ад гэтага абавязку і ледзь не даводзяць да зрады рэволюцыі. У Панкела, паводле слоў аўтара, „душа раздваілася, і паміж дзьвюма яе часткамі ўзгарэлася барацьба, якая пачала мучыць Панкела, дратаваць усю яго істоту. Страшныя вобразы-здані і мары-выгляды панесьліся перад ім. Панкел раз-за-раз зрабіўся бязвольным і бязьлюдным стварэньнем" (стар. 94). Нарэшце, у апавяданьні „На новым месцы" падана напружаная барацьба жаночага абавязку і пачуцьця каханьня; на фоне гэтай барацьбы разьвязаны дзьве тэмы: тэма жаночай зрады, адультэру і тэма зайздрасьці, цёмнай і бязгрунтоўнай па сваіх вытоках.

У Ц. Гартнага, такім чынам, псыхіка чалавека малюецца зазвычай, як арэна барацьбы паміж сьветлым і цёмным пачаткам; аголеная ад свайго конкрэтнага зьместу, гэта ў канчатковым выніку—барацьба розуму і пачуцьця, сьветлага абавязку і цёмнага інстынкту.

У творах пісьменьніка ёсьць цэлы шэраг пасыўных натур, якія мала здольны да жыцьцёвай барацьбы, якія зьяўляюцца сапраўднымі „трэскамі" на хвалях; у такіх натур надворныя акалічнасьці, абуджаючы сфэру эмоцый ды інстынктаў, атрымліваюць перамогу; абавязак падпарадкуецца цёмным рухам душы.

Але такім эмоцыянальна-пасыўным натурам Цішка Гартны проціставіць у сваёй творчасьці цэлы шэраг разумова-актыўных пэрсонажаў, якія зьяўляюцца сапраўднымі будаўнікамі.

Адсюль другім аспэктам, у якім выяўлена ў Цішкі Гартнага тэма барацьбы, зьяўляецца аспэкт надворнай социяльнай барацьбы; рэволюцыя і зьвязаная з ёй грамадзянская вайна ў нашага пісьменьніка абмаляваны досыць шырока.

Зарысоўкі рэволюцыйных праяў вызначаюцца ў Цішкі Гартнага сваёй многагранназсьцю і рознастайнасьцю. Напрыклад, паказаны ўплыў рэволюцыі на хатні сямейны быт, зачэплена тэма бацькоў і дзяцей: у апавяданьні „Спатканьне“ ў асобе Агаты абрысаваны новы тып жанчыны, у якой ужо выяўляецца сваё асабовае „я“, якая вызваляецца з-пад сямейнага ўціску бацькоў і сваё жыцьцё імкнецца пабудаваць згодна запатрабаваньняў свайго сэрца. З асаблівым замілаваньнем спыняецца пісьменьнік на абмалёўцы героічнага боку рэволюцыі. Так, у апавяданьні „Сымонка-інжынэр“ гэты героізм выступае ў сваім трагічным асьвятленьні: у барацьбе з белапалякамі гіне бацька і разам з ім гіне яго маленькі сынок, таксама захоплены рэволюцыйным настроем. Вобраз таленавітага маленькага хлопчыка Сымонкі трапна выяўляе тыповыя асаблівасьці дзіцячай псыхолёгіі з яе інстынктам насьледваньня дарослым; адначасна паказана, як рэволюцыйныя абставіны барацьбы надаюць гэтаму інстынкту сваю мэтаімкнёнасьць; тут мастацка прасочаны ўплыў рэволюцыі на дзіцячую псыхіку. Сымонка паступова заражаецца настроямі змаганьня. „Запала і ў яго чулую дзіцячую душу гарачае пачуцьцё крыўды і помсты да агульнага ворага. І з гэтага часу ў сваіх гульнях з дзяцьмі Сымонка перамяніў характар і выразнасьць дзеяў, ахрысьціўшы немцаў палякамі, а расійцаў чырвонаармейцамі. Кожны раз ішла бойка ў іх між двума гэтымі станамі. Сымонка заўсёды быў начальнікам чырвонаармейцаў. Ён чуў, як бацька цішком паведваў мацеры аб хуткім прыходзе чырвонаармейцаў у Ступы, і з нецярплівасьцю чакаў. Абы раніца, выходзіў з хаты на вуліцу, узлазіў на шуло і глядзеў на ўсход, ці ня ідуць чырвонаармейцы. Сымонка чакаў, што яны прынясуць яго

бацьку работу, а для ўсіх вызваленьне—штосьці вялікае і каштоўнае, бо вельмі ўсімі пажаданае“ (стар. 55). На такім фоне трапна схопленай дзіцячай псыхолёгіі паказаны сумны і велічны кавалак жыцьця. Тое самае героічнае аблічча рэволюцыі выступае перад намі ў апавяданьні „Дойдзем, сынок“, дзе перададзены просты і ў сваёй прастаце жахлівы эпізод грамадзянскай вайны, у часе якой маці-сялянка з сваім 6-гадовым сынам пакідае вёску ды ідзе ў сьвет абы толькі не апынуцца ў руках белапалякаў.

Так Цішка Гартны здолеў у мастацкіх вобразах выявіць героічны патос рэволюцыі, здолеў паказаць гэтую вялікую волю да жыцьця, якая выявілася ў падзеях рэволюцыі. У творах Цішкі Гартнага знайшлі сабе адбідак два бакі рэволюцыі—яе руйнавальная і будоўная стыхіі. Адно з лепшых апавяданьняў зборніка „Трэскі на хвалях“ так і названа—„На руінах“. Мастацка зарысавана тут пісьменьнікам тое разбурэньне, якое пакінула пасьля сябе грамадзянская вайна, паказана сумная спадчына, якую пакінулі пасьля сябе драпежныя польскія паны. Вось, напрыклад, адзін з такіх сумных абразкоў: „На станцыі перад вачыма Несьцера паказаўся цяжкі малюнак. Калісьці, ён помніць, гэта станцыя была шумнай і бойкай. Новы, з чырвонае цэглы, мастацка зложаны будынак станцыі цешыў сваім прыгожым выглядам. Высока падымалася, як вежа, вадакачка. Народу заўсёды так і кішэла. А цяпер... Ох-ха! Як нейкі забыты вартаўнік, стаіць пабітаю, пашарпанаю, з паваленаю страхою тая-ж вадакачка, а ад будынку станцыі—адны разьбітыя падмуры. Для прыпынку прыязджаючых зьбіты насьпех з дошчак барак. У вагонах месьціцца і білетная, і комэндант, і начальнік станцыі. Зусім выпадкова асталіся няпрыметныя лямпавыя ліхтары, якія маркотна сьвецяць то там, то сям на пустэльным абшары“ (стар. 81). Але, падаючы такія сумныя малюнкі, Цішка Гартны адначасна паказвае, як на руінах расьце загартаванасьць у барацьбе, расьце сьвежая рунь новага. Так, у апавяданьні „На новым месцы“ абмалёвана і будаўнічая стыхія рэволюцыі: тут у асобах мэханіка і кіраўніка саўгасу паданы тыповыя фігуры савецкіх працаўнікоў, якія шчы-

ра аддаены сваёй справе, захоплены будаўніцтвам новай гаспадаркі на асновах колектывізацыі. У мэханіка Ладымера Ложкі ёсьць свой акрэсьлены погляд на жыцьцё. „Цяперашняе жыцьцё, кажа ён, не павінна спыняцца на адным месцы; яно мусіць вярцецца, віраваць, бегчы наперад. Бач, мы творым рэволюцыю, перабудоўваем усё на новы лад, нішчым старое да астатку“ (стар. 229). Але ў Ладымера слова не разыходзіцца са справай, ён далёкі ад красамоўнага фразёрства: сваю кіпучую энэргію ён усю дарэшты аддае адбудове саўгасу, культурна-асьветнай справе і г. д.

Побач з такімі дадатнымі тыпамі паказаны і адмоўныя, выяўлены асобы, якія адзінока стаяць здалёк ад вялікага гасьцінцу жыцьця. Такой адзінокай асобай зьяўляецца, напрыклад, жонка Ладымера—Акіліна, сантымэнтальна-нікчэмная мяшчанка, якая думае толькі аб асабістых асалодах, для якой кіпучая будаўнічая чыннасьць зьяўляецца зусім чужой і незразумелай. Такім-жа лішнім чалавекам зьяўляецца далей шляхціц у апавяданьні „Бягунец“: ён ухіляецца ад барацьбы, уцякае ад бальшавікоў, аднак люты лёс пасвойму помстуе яму—ён гіне ад рукі белапалякаў. Але асабліва трапна фігура такога лішняга ў нашы часы чалавека зарысавана ў апавяданьні „Трэскі на хвалях“, дзе абмалёвана расслаеньне ў шэрагах інтэлігенцыі, і на фоне гэтага расслаеньня паказана, што Сідары Браваркі, ухіляючыся ад сучаснай будаўнічай працы, зьяўляюцца трагічнымі адзіночкамі, якія асуджаны гісторыяй.

Няцяжка, такім чынам, заўважыць, што зборнік „Трэскі на хвалях“ вызначаецца цікавым зьместам; у ім адбіўся цэлы шэраг актуальных тэм: барацьба ўнутраная і барацьба надворная, праменістае сьвятло сучаснасьці і разам некаторыя цёмныя плямы на ёй,—усё гэта ўвабрала ў сябе мастацкая проза пісьменьніка. Але галоўная ўстаноўка аўтара заключаецца ў тым, каб абхапіць жыцьцё працоўнага чалавека ва ўсім багацьці і разнастайнасьці яго соцыяльна-псыхолёгічных праяў. Носьбітамі гэтых праяў зьяўляюцца дзеючыя пэрсонажы пісьменьніка; кожны з іх ёсьць пэўны соцыяльна-псыхолёгічны комплекс. На абмалёўцы такіх комплексаў концэнтруецца

галоўная мастацкая ўвага пісьменьніка: адсюль вынікае рэльефнасьць і пукатасьць яго портрэтнага мастацтва. Пэрсонажныя вобразы Цішкі Гартнага, бы жывыя, стаяць перад нашымі вачыма; у іх няма нічога фальшывага і надуманага, яны ўзяты аўтарам непасрэдна з самага жыцьця.

У featureнастайнай портрэтнай галярэі, якая разьвінаецца перад намі ў зборніку „Трэскі на хвалях“, асабліва вызначаецца вобраз чалавека-змаганьніка, надзеленага актыўнай воляй, загартаванага ў барацьбе. На абрысоўцы пэрсонажаў-актывістых спыняецца Цішка Гартны з асаблівым замілаваньнем, гэта яго ўлюбёныя вобразы.

Большаю часткаю Гартнаму ўласьціва дыялектычная пабудова вобразаў, яны бяруцца ім у жывым струмені зьмен, напружанага росту, які разьвіваецца з супярэчнасьцяй. Героі беларускага пісьменьніка, як мы бачылі вышэй, або праходзяць праз вогнішча ўнутраных супярэчнасьцяй, або адпіхаюцца ад надворных супярэчнасьцяй соцыяльнага парадку, імкнучыся перамагчы і тое і другое.

Концэнтруючы сваю ўвагу, галоўным чынам, на трапнай композыцыі пэрсонажных вобразаў, Цішка Гартны менш увагі аддае сюжэтнай композыцыі. Сюжэт для яго ня ёсьць нешта самамэтнае,—ён толькі фон, на якім разьвінаецца портрэтная галярэя вобразаў. Адсюль вынікае прастата і нескладанасьць сюжэтаў у апавяданьнях Цішкі Гартнага. Каханьне дзяўчыны проці волі бацькоў, сустрэча двох братоў пасьля доўгай разлукі, вандраваньне з мэтай дастаць працу, уцёкі маці з сынам ад белапалякаў, жаночая здрада, — вось найбольш тыповыя сюжэтныя асновы апавяданьняў Гартнага. У яго пераважае эпізодычны тып композыцыі з біографічным стрыжнем. Навакол асобы галоўнага пэрсонажу нанізваецца цэлы шэраг паасобных эпізодаў з яго жыцьця. І звычайна ў выбары гэтых эпізодаў адсутнічае мастацкая тэлеолёгічнасьць; паасобныя часткі ня ўвязваюцца шчыльна з мастацкім цэлым; напрыклад, у апавяданьні „На руінах“ зусім лішнім зьяўляецца даўгое апісаньне начаваньня герояў у карчме; у апавяданьні „На новым месцы“ зусім з боку прыцягнута сцэна зайздрасьці, што

Акіліна, якая сама апусьцілася да адультэру, робіць свайму чалавеку: гэта сцэна ня можа быць апраўдана ні псыхолёгічна, ні композыцыйна; у апавяданьні „Шукаючы працы“ мы маем падбор паасобных эпізодаў, якія зьвязаны толькі надворнай рамай вандраваньня, але ня маюць унутранай сувязі. Так у композыцыйнай пабудове вялікіх апавяданьняў у Цішкі Гартнага назіраецца большай часткай мэханічная сувязь паасобных эпізодаў; сувязі органічнай няма. Больш удаюцца пісьменьніку невялічкія апавяданьні, як, напрыклад, „Сымонка інжынэр“, „Дойдзем, сынок“, „Лайдак“ і інш. Яны зазвычай вызначаюцца напружанасьцю дзеяньня і ня маюць залішняй расьцягнутасьці. Некаторыя з гэтых невялічкіх апавяданьняў Цішкі Гартнага пабудаваны па тыпу новэлістычнай композыцыі. Такая композыцыя найбольш адпавядае характару творчасьці пісьменьніка; яна становіць сабою органічны выраз тэй драматычнай барацьбы, якая прадстаўляе сабою лейт-мотыў яго творчай концэпцыі; новэлістычная пабудова ў Цішкі Гартнага, такім чынам, адзін са сродкаў раскрыцьця яго тэматыкі ў яе спэцыфычнай аснове. Напрыклад, у апавяданьні „Сымонка-інжынэр“ у самым пачатку дана трапная экспозыцыя—характарыстыка Сымонкі, як здольнага хлапчука; завязка дае выбуховы дынамічны мотыў вайны; кульмінацыйны пункт новэлі—удзел Сымонкі ў барацьбе разам з бацькам, разьвязка—трагічная сьмерць Сымонкі, прычым вастрата канцоўкі тут узмацняецца трапнай экспозыцыяй, усе часткі аказваюцца зьвязанымі паміж сабой, нічога лішняга. Прыблізна паводле такога-ж тыпу новэлістычнай композыцыі пабудаваны апавяданьні „Лайдак“, „Спатканьне“ ды інш.

Зазвычай у Цішкі Гартнага дыспозыцыя, г. зн. рэальная пасьлядоўнасьць сюжэтнага руху, супадае з композыцыяй, пасьлядоўнасьцю яго ў мастацкім афармленьні. Таму ў сюжэтнай пабудове апавяданьняў Цішкі Гартнага няма інтрыгуючых і напружваючых увагу чытача момантаў; у яго звычайна эпізоды разьвінаюцца паступова, адзін за адным. Адступленьні ад гэтай звычайнай для пісьменьніка схэмы трапляюцца параўнальна рэдка. Напрыклад, у апавяданьнях „Распусьніца“ і „Дой-

дзем, сынок“ чытач адразу ўводзіцца ў сярэдзіну дзеяньня: у першым апавяданьні адразу перад намі разьвінаецца драматычны эпізод укладаньня распусьніцай ліста пакінуўшаму яе чалавеку, у другім творы ў самым пачатку дана журлівая сцэна вандраваньня бяспрытульнай маці з сваім дзіцем. У тым і другім выпадку толькі ў далейшым ходзе апавяданьняў выкрываецца падстава гэтых драматычных момантаў.

Стыль Цішкі Гартнага ў зборніку „Трэскі на хвалях“ мае пераважна сынтэтычны характар. Пісьменьніку ўласьціва большай часткаю пэрыядычная пабудова мовы часам з цэлай сыстэмай даданых сказаў, што пазбаўляе яго стыль рухавасьці і дынамічнасьці. Апроч таго, аўтар вельмі скупа і ашчадна ўжывае маляўнічыя сродкі; яго слоўная эйдолёгія разьвінута ня досыць шырока і ня мае яскрава сакавітых фарбаў.

Асаблівасьці Цішкі Гартнага як бэлетрыстага, вызначаныя ў яго зборніку „Трэскі на хвалях“, пуката выявіліся і ў яго романе „Сокі цаліны“.

Пакуль-што роман яшчэ не закончаны, вышла дзьве першыя яго часткі: „Бацькава воля“ і „На перагібе“.

Сюжэт першай часткі вызначаецца прастатою... Рабочы Рыгор Нязвычны прыяжджае ў госьці ў мястэчка Сілцы, дзе жыве яго каханая Зося; бацькі проці гэтага каханьня, яны хочуць выдаць дачку за багатага хлопца Васіля Берага, але Зося кахае ўсё-ж такі Рыгора і нават аддаецца яму; пасьля гэтай прыгоды ў Лужкох Рыгор выяжджае на месца свае працы ў Рыгу.

Сюжэт другой часткі больш складаны; тут крыжуюцца дзьве сюжэтныя лініі з двума топографічнымі цэнтрамі: падзеі адбываюцца ў Сілцох і Рызе. У Сілцох адбываюца ўладзіны і вясельле Зосі, арышты мясцовых рэволюцыянэраў. У Рызе разьвінаецца багатае падзеямі романічнага і грамадзкага характару жыцьцё Рыгора Нязвычнага—разьвінаецца на агульным фоне барацьбы рабочай клясы за сваё вызваленьне; канчаецца дзея арыштам Рыгора і яго трэцяй па ліку каханай Наталі.

У першай частцы пераважаюць мотывы жанравыя; тут добра абмалёваны быт местачковага мяшчанства з яго затух-

лым консэрватызмам, тупой нянавісьцю да бядняцтва і чыста „дамастроеўскім“ сямейным дэспотызмам: над праявамі маладога юнацкага жыцьця тут вісіць „бацькава воля“. Але сямейная драма, як зазвычай у Цішкі Гартнага, пераходзіць у драму соцыяльную, адсюль мотывы жанравыя ў яго цесна перапляпаюцца з мотывамі соцыяльнымі; трапна паказана расслаеньне мястэчка на кулакоў і беднякоў, выяўлена вострая соцыяльная барацьба паміж гэтымі пластамі, мастацка акрэсьлены фігуры мясцовых рэволюцыянэраў, загартаваных у барацьбе, ды інш.

У другой частцы на першы плян высоўваецца соцыяльны зьмест. З душнага, атручанага дэспотызмам провінцыяльнага мястэчка аўтар выводзіць нас на шырокую прастору буйнага прамысловага цэнтру. Тут зарысавана фабрычнае жыцьцё, мастацка паказаны рабочы рух з яго дэмонстрацыямі, забастоўкамі ды іншымі праявамі актыўнай рэволюцыйнай барацьбы. У гэтай насычанасьці багатым рэволюцыйным зьместам раскрываецца сэнс назвы роману: „Сокі цаліны“—гэта маладыя рэволюцыйныя сілы, якія пачалі актыўную барацьбу з царызмам. Стары рэволюцыянэр Міхась з вялікім здавальненьнем бачыў, „што з кожным часам новыя і новыя шэрагі ваяк выступаюць на арэну змаганьня за вялікія ідэі вызваленьня працоўных: багатая сокамі цаліна агромнай краіны пусьціла маладыя пасынкі“. („На перагібе“, стар. 84).

У цэнтры роману стаіць Рыгор Нязвычны. Гэта тыповы рабочы барацьбіт; ён максымалісты па сваіх пераконаньнях і ўчынках; на сходзе ён, наўпрэкі памяркоўнаму настрою іншых рабочых, стаіць за ўзброенае паўстаньне, выступае з гарачымі, палкімі прамовамі: першы сьпевам марсэльезы ўцягвае рабочых у дэмонстрацыю, у часе гэтай дэмонстрацыі кідае ў паліцэйскіх каменьні і г. д. Але адначасна Рыгор не парваў яшчэ сувязі з вёскай, у яго прабіваецца і некаторая цяга да вясковага побыту, замілаваньне да вясковай прыроды. Вось, напрыклад, як малюецца адзін з момантаў яго перажываньняў: „Нейкая магутная сіла цягі к далёкім вобразам затуліла шэрай плеўкай шырокую галу яго небасхілу,

Бліснулі павабныя думкі—хаценьне выйсьці з пакою і накіравацца не ў завод, ня ў дым, дзе смурод, а на вакзал, дзе стаіць нарыхтаваны да адпраўкі ў Ліцк цягнік. Лясы і поле, паплавы з зялёнаю атаваю, жанцы з іх песьнямі, матляньнем жытніх каласоў, белы лунь над капусьнікамі, а пасьля нечаканае і таму глыбока натхнёнае спатканьне з маце раю, таварышамі... з Зосяю". („На перагібе", стар. 186—187).

У Рызе Рыгор Нязвычны жыве дваістым жыцьцём: грамадзкім і асабовым. „Рыгор—кажа аўтар пра гэта—марыў перш усяго аб шчасьці агульна-людзкім, як чалавек ідэі, як шчыры пасьлядовец рэволюцыі. Але тым самым ён ня цураўся лепшага жыцьця для сябе самога. Праўда, яно бачылася яму ў асаблівай форме, асаблівым зьмесьце". („На перагібе", стар. 204). Так, Рыгор Нязвычны—барацьбіт-рэволюцыянэр; як такі, ён шукае новых соцыяльных форм і адначасна, відаць, шукае новых форм асабовай моралі; ён адкідае мяшчанства і, шукаючы асаблівай формы і асаблівага зьместу свайго індывідуальнага існаваньня, жыве напружаным эмоцыянальным жыцьцём; на працягу двух месяцаў ён перажывае тры романы.

Вобраз Рыгора Нязвычнага, такім чынам, двоіцца: ён—прадстаўнік рабочай клясы, сьвядомы ўдзельнік вызваленчага руху, сьвядомы змаганьнік; у даных адносінах перад намі пэўны грамадзкі тып. Але, з другога боку, Рыгор Нязвычны стаіць перад намі ў постаці нейкага пераможніка над жаночымі сэрцамі.

У канчатковым выніку вобраз Рыгора ня мае суцэльнасьці: грамадзкі ды індывідуальны бок яго істоты цяжка пагадзіць паміж сабою. Да гэтага трэба дадаць яшчэ, што, спыняючыся падрабязна на абмалёўцы асабовага жыцьця свайго героя, аўтар часам дае нам эротычныя зарысоўкі, ён любіць маляваць праявы інстынкту ў яго аголеным выглядзе (сцэна ў Лужкох, спатканьне з Ганнай ды інш.).

Композыцыя роману вызначаецца расьцягнутасьцю. Агульная пабудова яго эпізодычна-„ступенчатая", з асобай галоўнага героя ў цэнтры, вакол якога і групуецца большасьць

эпізодаў. Пісьменьнік мала клапоціцца аб тэлеолёгічным адборы гэтых эпізодаў; наадварот, ён імкнецца з нейкай эпічнай паўнатой абрысаваць усе драбніцы жыцьця, спыняючыся нават на падрабязнай абмалёўцы звычайных фізыолёгічных процэсаў, як сон, яда ды інш. Вельмі часта малюнкі ў романе разьвінаюцца на падставе асоцыяцыі сумежнасьці. Апісаўшы, напрыклад, прыезд Рыгора на станцыю, аўтар спыняецца на такіх драбніцах, як пакупка білету, уваход у вагон ды інш.; потым, пакінуўшы свайго героя ў Рызе, ён лічыць патрэбным затрымацца на апісаньні звароту Сёмкі да Сілцоў. У выніку— перавага статычных мотываў і брак мотываў дынамічных, выбуховых.

Значны крок наперад становіць сабою апошні зборнік Цішкі Гартнага „Прысады“.

Тэматыка зборніка зьвязана з сучаснасьцю: перад намі сапраўды шырокі гасьцінец нашага бурлівага жыцьця, прычым мы бачым, як абапал гэтага гасьцінца, замест старых прысад, падымаюцца парасткі новага. Перад намі, бы жывыя, праходзяць розныя тыповыя пэрсонажы, выхапленыя з вакольнай сучаснасьці. Вось, напрыклад, скромны працаўнік, начальнік райміліцыі, самаахвярна адданы сваім абавязкам: тут і мары аб новых прысадах, і прыём у канцылярыі, і барацьба з бандытызмам і, урэшце, раненьне пры паездцы ў шляхецкі засьценак („Прысады“). Другі аналёгічны вобраз — партыец адданы будаўнічай справе да забыцьця асабовага („Чапіла душы“). Або, вось, два сябры, дзьве процілеглыя натуры: адзін разумны, асьцярожны, другі эмоцыянальны, палкі і рашучы,— два процілеглыя псыхолёгічныя тыпы, але ў абодвух адна мэта, адзін ідэал—служэньне рэволюцыі („Таварышы“). На зьмену гэтым пэрсонажам выступае скромная фігура вясковага працаўніка, які, ня гледзячы на ўсе перашкоды, дабіваецца свае мэты, правіць млын („Свае блінцы“).

Можна сказаць, што сучаснае савецкае будаўніцтва становіць сабою лейт-мотыў усяго зборніка. Цішка Гартны ўмее ў нашым штодзенным жыцьці бачыць захованы рытм новага будаўнічага жыцьця. Гэты рытм выяўляецца ім ня толькі

ў колах савецкіх і партыйных працаўнікоў, але і ў сучаснай вёсцы: распластаваньне вёскі, перараджэньне серадняка, варожыя адносіны якога да савецкай улады зьмяніліся на прыхільныя; новыя зьявы ў жыцьці вёскі, як кальцавая пошта, захапленьне газэтамі, радасныя праводзіны ў армію,—усё гэта мастацка адбіта Цішкам Гартным („Праводзіны").

Побач з дадатнымі праявамі сучаснасьці пісьменьнік малюе і адмоўныя: прастытуцыя ў горадзе, дрэннае становішча яўрэйскага рамесьніка, якога вызваляе толькі дапамога сваякоў з Амэрыкі („Хільшчык Шлёма Брыкер"), матэрыяльныя недахопы ў жыцьці дзіцячай коленіі; гэткія ды ім падобныя плямы таксама знайшлі сабе адбітак у зборніку.

Так на высокіх хвалях сучаснасьці ўздымаецца муза Цішкі Гартнага.

Некалькі асобна стаяць у зборніку апавяданьні, прысьвечаныя псыхолёгічным тэмам, спэцыяльна выяўленьню псыхолёгіі жаночай душы. У гэтых апавяданьнях пісьменьнік пераходзіць ад абмалёўкі—значнага з грамадзкага пагляду, да абрысоўкі—значнага з пагляду людзкасьці. Так, у апавяданьні „Ядзя Жучок" зарысавана цяжкая сутычка жаночага самаахвярнага каханьня і мужчынскай здрады; біолёгічная трагедыя жанчыны, пазбаўленай дзяцей, становіць сабою тэму апавяданьня „Дыягноз"; нарэшце, псыхолёгія маладой адзінокай дзяўчыны, якая закінута лёсам у вясковую глуш, выяўлена ў творы „Таварыш інспэктар".

Але і ў даных, пераважна псыхолёгічных, апавяданьнях Цішка Гартны не адрываецца ад сучаснасьці: цікавыя псыхолёгічныя перажываньні ён рысуе на фоне сучаснага быту. Такая моцная ўвязка з вакольным жыцьцём, бясспрэчна, становіць сабой каштоўны бок зборніка: Цішка Гартны выступае тут як сапраўдны бард сучаснасьці.

Бязумоўную вартасьць надаюць зборніку і значныя дасягненьні ў галіне формальна-мастацкай.

Композыцыя апавяданьняў зьяўляецца тут больш рухавай і дынамічнай; эпізоды хутка зьмяняюцца адзін адным, апавяданьні насычаны дзеяньнем, некаторыя апавяданьні будуюцца

нават паводле тыпу кінэматографічнай композыцыі: замест цэльных разьдзелаў—паасобныя маленькія эпізоды, якія вельмі хутка зьмяняюцца адзін другім („Таварыш інспэктар“, „Таварышы“).

Пэрсонажы выяўляюць сябе пераважна ў дзеяньні; зрэдку Цішка Гартны ўжывае спосаб гатовай характарыстыкі. Статычныя элемэнты—пэйзаж, жанр, літаратурны портрэт—зрэдку трапляюцца.

Дынамычнай композыцыі адпавядае і стыль твораў; замест сынтэтычнага стылю пераважна сустракаецца тут аналітычны, прычым характарнай адзнакай яго зьяўляецца дзеяслоўнасьць; вельмі часта ўжываюцца няпоўныя сказы бяз дзейніка. Напрыклад, „Прывык, прынаравіўся, падладзіўся, агойтаўся. Абыходзіцца, глядзіць і нават шануе. Куды-ж пагоніш небажатку“. Або вось другі прыклад. „Плаціць пяць рублёў Муні, а гадоў тры жыў дарэмна. Лічыў, што мае права на гэта, бо заслужыў перад рэволюцыяй“.

Так, адбіваючы дынаміку сучаснасьці, Цішка Гартны ўжывае дынамічныя прыёмы композыцыі і адпаведныя прыёмы стылю.

Цішка Гартны ня толькі поэта і бэлетрысты,—адначасна ён і драматург. Надрукаваны яго драматычныя творы: „Хвалі жыцьця“, драма ў 3 дзеях („Зажынкі“, зборнік, Масква, 1918), „Соцыялістка“, драма ў 5 дзеях („Сцэнічныя творы“, кн. 2-я, Менск, 1914), „На стыку“, п‘еса ў 5 дзеях, і „Дзьве сілы“, драматычная сцэна з жыцьця прамысловага цэнтру („Прысады“, апавяданьні, Менск, 1927).

У драматычных творах Гартнага, таксама як у лірыцы і эпосе, пераважае соцыяльны зьмест. Драма „Хвалі жыцьця“ рысуе распластаваньне вёскі напярэдадні рэволюцыі 1905 г. Яскрава абмалявана тут драпежніцтва і ліхвярства вясковага кулака і опозыцыйныя настроі бядняцтва. Драма „Соцыялістка“ па агульнай сваёй сытуацыі вельмі нагадуе першую частку роману „Сокі цаліны“. І тут дэспотычна бацькавая воля калечыць жыцьцё маладой вясковай дзяўчыны, прымушаючы яе кінуць любага сэрцу бедняка і выйсьці замуж за нялюбага кулацкага сынка. Але і ў п‘есе Гартнага, як і ў яго романе,

гэтая сямейная драма пераходзіць у драму соцыяльную. І тут ускрываюцца соцыяльныя спружыны барацьбы двох пластоў насельніцтва перадрэволюцыйнай вёскі—кулацтва і бядняцтва. Нарэшце, дзьве астатнія п'есы—„На стыку" і „Дзьве сілы"—узяты з сучаснага жыцьця; яны рысуюць барацьбу старога і новага ў шэрагах местачковай і заводзкай інтэлігенцыі.

Мы можам цяпер зрабіць некаторыя абагульняючыя вывады адносна творчасьці Цішкі Гартнага.

Псэўдонім добра характарызуе і асноўную асаблівасьць творчасьці пісьменьніка.

Цэнтральным стрыжнем гэтай творчасьці зьяўляецца абрысоўка актыўнага ўзьдзеяньня працоўнага чалавека на вакольную рачаіснасьць. Такое ўзьдзеяньне можа раскрывацца ў форме працы і ў форме барацьбы за соцыяльную перабудову грамадзтва. Адгэтуль органічна вынікаюць у творчасьці Цішкі Гартнага дзьве асноўныя тэмы яго творчасьці: праца і рэволюцыя.

Працу пісьменьнік малюе ў featureнастайных аспэктах, і гэта featureнастайнасьць адпавядае розным ступеням уласнага працоўнага дасьведчаньня пісьменьніка. Хлопчык-падпасак у маленстве, гарбар у юнацтве, рабочы на рубяжы юнацтва і сьпелага ўзросту, адказны партыйны і савецкі працаўнік у апошнія гады,—вось тыя асноўныя завіткі, з якіх складаецца, як мы бачылі вышэй, сьпіральны стрыжань біографіі Гартнага. Усе гэтыя завіткі адбіліся і на творчасьці песьняра.

У маленстве і раньнім юнацтве пісьменьнік па ўмовах свайго пачатковага выхаваньня і пачатковай профэсіі падпаска быў зьвязаны з вясковым бытам і сялянскай клясай. На матчыным улоньні вясковай прыроды выпукляліся першыя парасткі яго мастацкага пачуцьця. Таленавіты хлопчык-пастушок ня раз у сваім маленстве адчуваў поэзію вясковай раніцы, калі на далёкім небасхіле гаснуць апошнія начныя зоркі і на зьмену ім пераможна запальваюцца ружовыя сонечныя праменьні,—яны нібы вітаюць перамогу сьвятла над цемрай, радуюцца прыходу новага дня. У такія моманты пастухоўская жалейка маленькага хлопчыка ня раз, відаць, абуджала прасторы соннага Капыля. У такія моманты, можа ня раз, у чулую душу бу-

дучага поэты западалі зерняты хараства і эстэтычнага пачуцьця. Ї гэтыя зерняты далі багатыя ўсходы ў творчасьці Гартнага. Пісьменьнік востра адчувае ўсе водцені розных процэсаў сялянскай працы. Ён, напрыклад, маляўніча рысуе нам, як пад „сярпом крывым“

Жыта хутка гнецца,
Сноп за снопам у радкі
Пакладам кладзецца.

(„*Песьня жняі*“)

З мілаваньнем спыняецца аўтар таксама і на малюнку касавіцы:

Ня спадлі 'шчэ раньнія росы,
Ї сонца ня стала сіяць,
Як гострыя ў поплаве косы
Вясёла і звычна зьвіняць.
Бліскаюць рэзва на сонцы,
Сьвішчуць, шумяць у траве...

(„*Касьба*“)

Яшчэ больш поэтычны малюнак касавіцы пісьменьнік дае ў сваім романе „Сокі цаліны“. Ён трапна ў мастацкіх зарысоўках перадае тут самы рытм сялянскай працы і яе напружанасьць, узвышаючыся да яскравай плястыкі вобразаў і адначасна глыбока прасякаючы ў поэзію вясковай працы. Вось невялічкі ўрывак з гэтага шырокага разгорнутага малюнка: „... Зьяднаючым гмахам, які выцінаў музыку кляпаньня, захапіліся касцы ў касьбе. Так плывуць рыбакі ка доўгім цяжкім чаўне, паднімаючы і апускаючы ў воду вёслы; так сякуцца ў атаках на вайне, размахваючы шаблямі, штыхамі. Касцы былі першым шэрагам салдат, што ідуць у наступ, стыкаюцца з ворагам і пачынаюць секчыся. Толькі мігалі доўгія дугі пад лёзамі блішчастых кос. Толькі сьвісталі сьмяртэльную песьню стромыя замахі, кладучы сьвежую траву ў роўныя пакосы“...

Так маляўніча апісаць процэсы вясковай працы мог толькі мастак, органічна зьліты з працоўным людам, прасякнуўшы ў розныя праявы яго быту: толькі на падставе такога прасякненьня магла зьявіцца тая сымфонія фарбаў і гукаў, якую даюць нам у Гартнага зарысоўкі жніва і касавіцы.

Але малюнкі сялянскай працы зьяўляюцца эпізодычнымі ў творчасьці Цішкі Гартнага. Больш характарны для яго ўгрунтаваныя на асабістай практыцы малюнкі працы дробнага рамесьніка. Пісьменьнік вядзе нас у брудную майстэрню гарбара, паказвае ўсю цяжкасьць бязрадага існаваньня ў ненормальных социяльных умовах. Мы бачым, як гэтыя ўмовы высмоктваюць усю жыцьцёвую сілу, пазбаўляюць радасьці ў жыцьці, засушваюць фарбы юнацтва. Мы чуем гэтыя стогны гарбара:

Цэлы дзень я за брудным сталом,
Цэлы дзень скуру цьвёрдую скроб,
Стаючы укапаным калом,
Я задушай атрутнаю соп...
Дзёгаць і лой мае рукі разьелі.
Шчокі ў гразі ды смуродзе счарнелі,
Ружа завяла,
Шчасьце прапала,
Скура забрала.

У гэтых стогнах адчуваецца асабіста перажытае: „Песьні гарбара“ падкупляюць нас, папершае, сваім рэалізмам. Яны даюць нам тыповыя малюнкі з жыцьця дробнага рамесьніка данай спэцыяльнасьці на Беларусі. Схоплены надворныя абставіны майстэрні:

Навакола чатыры сьцяны,
А на іх заплясьнеўшая столь...

Адначасна выяўлены і ўнутраныя перажываньні дробнага рамесьніка, паказаны яго сумотныя адчуваньні за бруднай працай,—адчуваньні нявольніка, прыкутага да свайго варштату, які, з прычыны ненормальных социяльных умоў, ня можа бачыць хараства жыцьця і хараства прыроды.

Постаць гарбара зьяўляецца цэнтральнай у „Песьнях працы“; у ёй адбіваецца ўласны працоўны быт песьняра, адлюстроўваецца пэўны этап яго жыцьця іназіраньняў. Вось чаму гэта постаць зьяўляецца асабліва яскравай і колёрытнай у шэрагу ўсіх іншых вобразаў, створаных Цішкам Гартным.

Больш схэматычнымі зьяўляюцца ў песьняра вобразы іншых прадстаўнікоў індывідуальнай рамесьніцкай працы. Не-

калькімі пабежнымі рысамі накідвае ён вобраз каваля, які жвава завіхаецца каля сваёй цяжкай працы: трэба грэць жалеза ў агні, молат важкі трымаць і адначасна „не забыцца, каб мех у свой час паддуваць“. У некалькіх строфах лірычнага вершу тут схоплены тыповыя адзнакі гэтай прымітыўнай саматужніцкай працы, якая ня ведае яшчэ дыфэрэнцыяцыі пасобных функцый і адбываецца ў жабрацкіх умовах. На момант спыняе сваю ўвагу поэта на постаці грабара, „які ўсё жыцьцё сваё, дзень у дзень, год у год, зямлю цяжкай лапатай капае, як крот“. Грабар ставіць перад сабой пытаньне, што ён мае за сваю цяжкую працу, што дала яму зямля, абмытая яго потам і сьлязьмі. І на гэта пытаньне даецца сумны адказ:

О, дала яна мне, ой, за працу дала:
З калючковых расьлін мне вяночак спляла,
З медзі звонкай, цяжкой даравала шнурок,
А дарогу жыцьця ухарошыла ў мрок,
Каб я йшоў, як сьляпы, каб бясконца я йшоў,
Землю вечна капаў і дабра не знайшоў.

Вобраз грабара зьмяняецца ў Цішкі Гартнага на вобраз ткачыхі, якая „за варштатам дні і ночы, ў духаце нязноснай... старэнна і ахвоча тчэ-ліцуе кросны“.

У распрацоўцы данай тэмы працы дыяпазон творчасьці Цішкі Гартнага з цягам часу ўсё больш і больш пашыраецца, адпаведна пашырэньню ўласнага кола яго жыцьцёвых назіраньняў і працоўнае практыкі. Калі ў ранейшых сваіх творах пясьняр пераважна абмалёўвае нам індывідуальную працу рамесьніцкага характару, то ў творах пазьнейшых ён усё больш і больш пераходзіць да абмалёўкі працы колектыўнай: у кола мастацкіх зарысовак пісьменьніка замест дробнай майстэрні ўжо ўваходзіць фабрыка і гута. Так, у романе „Сокі цаліны“ замест „сьмяртэльнага“ сьвісту касы, замест аднастайнага шорганьня гарбарскай сабачкі або ткацкага чаўнака чуецца ўжо магутны грукат фабрычных рычагоў, сьвіст фабрычных пасаў, бразгат сталі. Вось, напрыклад, як апісвае Гартны момант, калі на заводзе пачынаецца праца—„...Завод рушыў усё вакола зашыпела, закруцілася, заляскала, забранчала. Ня-

прыкметна рабочыя разышліся па мясцох і прыняліся, хто наразаць, хто тачыць, хто шліфаваць, хто стругаць, хто вастрыць на наждаку разцы ды зубілы. Зьнізу хлынула пара, перамешаная з дымам, смуродным ды ўдушлівым. Зазьвінелі ўдары малатоў па жалезе". Вось гэтыя ўдары малатоў, музыка фабрыкі, улада жалеза таксама знайшлі сабе тыповы і рэальны адбітак у творах Цішкі Гартнага.

Апошнім этапам у разьвіцьці данай тэмы працы зьяўляецца ў творчасьці нашага пісьменьніка абмалёўка ім напружанага творчага ўздыму ў галіне сучаснага савецкага будаўніцтва. Сам адказны партыйны і савецкі працаўнік, пісьменьнік здужаў і тут даць нам яскравыя, поўныя жыцьцёвай праўды, малюнкі, якія зьяўляюцца рэхам нашых бурлівых дзён. Цішка Гартны выяўляе асаблівую здольнасьць нават у нашай штодзеннасьці схапіць захованы рытм новага будаўнічага жыцьця. Ён маляўніча паказвае нам, як усюды—у саўгасе, райвыканкоме, сельсавеце, райміліцыі—ідзе сваё напружанае жыцьцё, цагліна за цаглінаю кладзецца ў падмурак новага соцыялістычнага грамадзтва. Уся сучаснасьць рысуецца поэтам, як панаваньне працы, як бязьмежнае будаўніцтва:

То ня вецер у пушчы гудзе,
То ня хвалі на моры бушуюць—
То грамады працоўных людзей
Сабе лепшую долю будуюць.
Ўкол руйнуюцца ўціску муры,
Ападаюць жалезныя краты;
Дні прыгонныя цяжкай пары
Адыходзяць у вечныя страты.
А сьлядамі Комуна ідзе,
Панаваньне навекі будуе...
І жыцьцё, нібы пушча, гудзе,
І жыцьцё, нібы мора, бушуе.

*(„Будаваньне").*

Такім чынам, праца выяўляецца песьняром у розных аспэктах: паказана вясковая праца, абмалявана праца рамесьніка, даны абразкі фабрычна-заводзкага жыцьця, адлюстраваны творчы ўздым сучаснасьці.

Але, зарысоўваючы featuresнастайныя малюнкі працы, пісьменьнік заўсёды дае ім пэўнае ідэёва-эмоцыянальнае асьвятленьне. Папершае, ён выяўляе розную значымасьць працы ў залежнасьці ад соцыяльных умоў. Ва ўмовах соцыяльнага прыгнечаньня праца—цяжкое ліха. Яна ахвяроўвае чалавека на жыцьцё нявольніка, прыкутага да свайго варштату і ў вусны якога поэта ўкладае гэтым вядомы глыбока сумны прыпеў:

Шоргай, сабачка, паволі,
Скуру паважна скрабі,
Нам не пазбыцца нядолі.
Што ты сабе ні рабі.

Наадварот, у нашых умовах соцыяльнага вызваленьня праца набывае сваё сапраўднае значэньне: яна—творчы акт, яна—крыніца радасьці і задавальненьня, і цяпер у поэты ўжо зьяўляецца і іншы зварот да працы; ён у радасным натхненьні зазначае:

Красуй, ядрань, ўбірайся, праца,
Ў адзеньні сьветлыя вянчаньня,
Ідзі к жыцьцю, ў яго палацы,
Сваё ўзмацоўваць панаваньне.

Так, праца ў жалобнай вопратцы нядолі і праца, апранутая „у аддзеньні сьветлыя вянчаньня“,—вось тыя соцыяльныя полюсы, якія выяўлены поэтам у разрэзе данай тэмы. Адначасна Гартны высьвятляе моральна-псыхолёгічнае і соцыяльна-псыхолёгічнае значэньне працы. Яна—этычная падстава існаваньня кожнага чалавека, зьвязанага з вытворчай клясай. Беспрацоўны гарбар, „гарбар на вандроўцы“, адчувае сябе лішнім у сьвеце, для яго жыцьцё трацiць свой сэнс, сваё конкрэтнае напаўненьне; небарака сумна разважае:

І ня тое, што работа
Голад прыпыняе,—
Ва мне родзіць ўсе клапоты,
Сумам абвявае.
Не, ня тое, хопіць з гэтым
Сіл ва мне зьмірыцца,
Мяне мучыць, што для сьвету
Нечым прыгадзіцца;
Што задарам прага гіне,
Як пясок ў балоце,

Дні і ночы няупынна
Аддаваць рабоце...
Няма працы... Цяжка гэта
Мне цяпер бяз меры,
Бо ў ёй лёс мой, мая мэта,
Ў ёй спадзеў і вера.

У гэтых сумных разважаньнях добра схоплена псыхолёгія працоўных мас, для якіх работа—галоўная моральная падстава жыцьця. Калі ў пляне індывідуальнага існаваньня праца дае жыцьцю пэўнае этычнае напаўненьне, дае яму сэнс і мэту, то ў пляне грамадзкім праца адыгрывае ролю зьвязваючага цэманту, які злучае паасобныя індывідуумы ў суцэльны колектыў, прасякнуты адзінствам настрою. Гэта солідарнасьць рабочых на грунце аднолькавага працоўнага быту асабліва трапна паказана пісьменьнікам у яго романе „Сокі цаліны". Тут малюецца, напрыклад, як герой роману Рыгор Нязвычны „падглядаў у хаосе зыкаў, у пары і дыме, у цяжкай духаце—сілу бунту, віраваньне магутных падзей. Разам з атручаным паветрам уліваласяя гэта сіла ў нутро рабочых, віравала, разьюшвала кроў, запальвала прагу, узьнімала пачуцьцё".

Так абмалёўка працы ў Цішкі Гартнага пераходзіць у абмалёўку рэволюцыйнага ўздыму. Рэволюцыя, яе паступовае нарастаньне, зьяўляецца другой стрыжнёвай тэмай пісьменьніка, якая шчыльна злучана з першай. Гэта другая тэма таксама знайшла ў яго рознастайнае выяўленьне.

Беларускі аўтар, папершае, у тыповых вобразах паказвае нам соцыяльныя ўмовы, якія дэтэрмінавалі рэволюцыйны рух; ім мастацка абмаляваны соцыяльныя супярэчнасьці вёскі і гораду мінулых часоў. Цішка Гартны ня ведае монолітнага сялянства; ён яскрава выяўляе распластаваньне вёскі на кулацтва і бядняцтва. Напрыклад, у романе „Сокі цаліны" фабульнай падставай зьяўляецца абрысоўка „бацькавай волі", сямейнага дэспотызму, які прымушае Зосю ахвяраваць імкненьнем свайго сэрца; але гэта сямейная драма, як заўвычай, у Цішкі Гартнага разгорнута на пэўным соцыяльным фоне, паказаны соцыяльныя спружыны барацьбы кулацтва і бядняцтва, якія абумовілі сямейнае няшчасьце Зосі, супроць яе жаданьня

багатымі бацькамі выданай замуж за кулацкага сына. Аналёгічная ідэёвая схэма барацьбы процілеглых элемэнтаў вёскі пакладзена ў аснову драмы „Хвалі жыцьця“ і „Соцыялістка“.

Вострым аналізам ускрывае Гартны таксама і соцыяльныя супярэчнасьці дарэволюцыйнага гораду, і тут на першы плян высоўваецца ім змаганьне працы і багацьця. Сакавітымі фарбамі рысуе пісьменьнік соцыяльную прорву, якая аддзяляла эксплёататараў ад прыгнечаных. Ён імкнецца зафіксаваць розныя соцыяльныя шрубы, з якіх складалася кола вялізнай машыны гораду. „Працоўная часьць гэтай машыны,—чытаем мы, напрыклад, у романе „Сокі цаліны“,—вярцелася ў віры творчасьці, у напружаным змаганьні за кавалак хлеба. А там, у цэнтры, у багатых кварталах, людзі яшчэ спачывалі пры адчыненых вокнах, у мяккіх пасьцелях, абароненыя другімі ад назойлівых клапот жыцьця. Іх ня будзілі гудкі ды сырэны, ня трывожылі вымаганьні быцьця. Ранак будзіў ваколіцы, пачынаючы з іх працоўны дзень. Горад, як і ўся дзяржава, як усё чалавецтва, дзяліўся па стане людзей на дзьве паловы, рэзкія, адмяжованыя адна ад другой. Між гэтымі паловамі ляжала глыбокая канава-разьдзел. Жыцьцё нясупынна паглыбляла яе, адначасова варушачы абодва станы“.

Абмалёўка соцыяльных супярэчнасьцяй вёскі і гораду зьяўляецца тым фонам, на якім разгортваюцца ў Цішкі Гартнага падзеі рэволюцыйнага руху. Гэтыя падзеі распадаюцца ў яго на некалькі момантаў: сялянскі аграрны рух, рабочы рух у горадзе, грамадзянская барацьба за Кастрычнік, умацаваньне заваёў Кастрычніка—вось тыя паасобныя стрыжнёвыя лініі, па якіх разьвіваецца ў Гартнага тэма рэволюцыйнага змаганьня.

Сялянскі аграрны рух і рабочы рух асабліва шырока паказаны ў романе „Сокі цаліны“. Цішка Гартны, абмалёўваючы жыцьцё мястэчка Сілцоў, выводзіць тут цэлую галярэю мясцовых рэволюцыянэраў, абрысоўвае іх дзейнасьць, якая выяўлялася ў пашырэньні проклямацый, у наладжваньні дэмонстрацый, барацьбе з паліцыяй і г. д. Другім топографічным цэнтрам таго-ж роману зьяўляецца горад Рыга, дзе на фоне агульнага гарадзкога жыцьця паказаны рабочы рух: сходкі, нала-

джаньне дэмонстрацый, агульныя забастоўкі—усё гэта намалявана ў тыповых вобразах, схоплены рытмы, якія прадвяшчалі вялікую лявіну Кастрычніка.

Непасрэднай барацьбе за Кастрычнік прысьвечаны лепшыя старонкі як лірычных, так і эпічных твораў Цішкі Гартнага. Папершае, ім выяўлена героіка рэволюцыі. Гэта героіка—вынік вялікага ўздыму працоўных мас, вялікай напружанасьці іх волі, якая загартавана ў муках жыцьця. У вершы „Работнічая і сялянская рэволюцыя“ трапна акрэсьлены даныя крыніцы героічнага патосу рэволюцыі:

Яна прышла к нам ад станкоў
З падземных шахтаў, зруднікоў;
Хто ў муках дні жыцьця правёў,
Той к нам яе з сабой прывёў.
Пад сьвіст гудкоў, пад вёрт калёс,
Пад голад, холад, недасон,
Адвагай гардай абнясён—
Ваяк чырвоных легіён
Ля бойкі слаўнае узрос.

Поэт захоплены соцыяльным катаклізмам; грымнуўшы наўкол вялікі гром рэволюцыі спараджае ў яго душы адказныя водгукі, і пясьняр у захапленьні кліча:

Гары-ж, агонь Кастрычніка, гары,
Свой промень зыркі раздувай,
Няхай ён зьзяе з краю ў край...
Хто сьпіць да гэтае пары,
УСТАВАЙ!

Пісьменьнік дае нам цэлы шэраг героічных малюнкаў рэволюцыі.

Калі змоўклі гарматы грамадзянскае вайны, калі шырока разгарнулася савецкае будаўніцтва, Цішка Гартны чула выяўляе гэты рытм новых дзён. Рэволюцыя абмалёўваецца ім ужо не ў сьвяточнай вопратцы, а ў штодзеннасьці напружанага змаганьня за соцыялістычны лад. Лейт-мотыў яго апошняга зборніка „Прысады“—гэта героіка працы над будаўніцтвам новага жыцьця.

Так, апошнім зборнікам як-бы замыкаецца кола творчасьці Цішкі Гартнага. Пясьняр пачаў з мінорных песень гарбара, які апяваў сваю гаротную долю працаўніка ў капіталістычных умовах, канчае ён бадзёрым акордам песень таксама ў гонар працы, але толькі працы ўжо ў новых умовах соцыялістычнага будаўніцтва. Ад песень гарбара да зборніка „Прысады“ пройдзены доўгі шлях, але гэты шлях прадстаўляе сабою разьвіцьцё адзінай творчай лініі, адзінай мэтаімкнёнасьці бяз жадных зыгзагаў і адхіленьняў. Уся творчасьць Цішкі Гартнага ад яе вытокаў да апошніх апавяданьняў, прайшла пад знакам грамадзкага волюнтарызму. Загартаванасьць волі, рэволюцыйная актыўнасьць прадстаўляюць сабою грунтоўны фактар, які ляжыць у аснове ўсёй мастацкай дзейнасьці пісьменьніка, арганізуе ўсе яе складаныя компонэнты, надае ёй монолітную суцэльнасьць і органічнасьць.

Мы бачылі, як гэтаму фактару падпарадкаваны ўвесь ідэёвы зьмест творчасьці Гартнага. Дзьве асноўныя тэмы яго — праца і барацьба—перакрыжоўваюцца ў адзіным вузьле актыўнага ўзьдзеяньня працоўнага чалавека на навакольны сьвет. Чалавек, як творца матэрыяльных каштоўнасьцяй у процэсе барацьбы; гэта дзьве постаці ўлюбёных пэрсонажных вобразаў Гартнага, але гэтыя дзьве постаці па сутнасьці становяць сабою раскрыцьцё адзінай соцыяльна-псыхолёгічнай катэгорыі рэволюцыйнага волюнтарызму.

У сваіх песьнях гарбар сьпявае:

Я рабочы, гарбар,
Рыцар працы цяжкой,
Я з жалезнай душой,
З сэрцам палкім, як жар...
Маю сілу і гарт, —
Імі грудзі гараць.

Ужо тут вызначаецца ў схэматычных рысах цэнтральны вобраз творчасьці Цішкі Гартнага. Гэта вобраз працоўнага чалавека „з жалезнай душой“, з напружанай сілай волі, з моцнай актыўнасьцю. У ранейшым пэрыодзе сваёй творчасьці Гартны рысуе нам пераважна вобраз чалавека, для якога ўвесь сэнс

жыцьця ў працы. Дэкарт, як вядома, высунуў формулу cogito, ergo sum (мысьлю, значыць—існую); у першапачатковых пэрсонажаў Цішкі Гартнага гэта формула набывае іншае напаўненьне; „працую, значыць—існую“—так формулюецца жыцьцёвая філёзофія гартнаўскага рамесьніка, які гаворыць аб сабе:

Я гарбар—працаўнік.
Я жыву—каб рабіць.

У далейшых пэрсонажаў гэта формула яшчэ больш пашыраецца і паглыбляецца: „змагаюся, значыць існую“—у такую формулу ўкладаецца жыцьцёвая мудрасьць тых шматлікіх рэволюцыянэраў, якія доўгай чарадою праходзяць перад намі ў новэлях і асабліва ў романе Гартнага. Аднаго з сваіх пэрсонажаў данай катэгорыі—Платона Гічку ў апавяданьні „Больш за ўсё“—пісьменьнік характарызуе ў такіх рысах: „Яму здавалася, што рэволюцыянэр не павінен мець жаднае спагады. Усё, што побач рэволюцыі, то бязумоўна ніжэй яе па значнасьці. Так Платон думаў праз доўгі час свайго сьвядомага жыцьця. Дзеля рэволюцыі ён ахвяраваў пачуцьцём каханьня, пакінуўшы без адказу просьбу каханай дзяўчыны не выжджаць на падпольную працу пры немцах. Дзеля ідэі рэволюцыі ён забываў бацькоў, як і што яны жывуць, як іх становішча пад палякамі“. Рыгор Нязвычны, Сёмка і іншыя вобразы рэволюцыянэраў у романе „Сокі цаліны“ належаць да тэй-жа катэгорыі людзей „з жалезнай душой“, гэта пераважна валявыя натуры, унутраное жыцьцё якіх найбольш поўна раскрываецца ў напружаным рэволюцыйным дзеяньні. Але пэрсонажы Цішкі Гартнага далёка не зьяўляюцца адцягненымі схэмамі аднэй душэўнай якасьці; яны—жывыя людзі, якія перажываюць сумненьні, цяжкія колізіі, сутычкі. Яны—людзі ня толькі „з жалезнай душой“, але і „з сэрцам палкім, як жар“. Адсюль вынікае ў Цішкі Гартнага абмалёўка цяжкіх унутраных колізій, праз вогнішча якіх праводзіць ён сваіх герояў; па сваіх вытоках гэта ў большасьці выпадкаў колізіі інстынктыўнага пачуцьця і абавязку.

Эмоцыянальна-валявыя перажываньні, такім чынам, прадстаўляюць сабою аснову пэрсонажных вобразаў пісьменьніка. Твор-

чай домінанце гэтых перажываньняў падпарадкаваны і іншыя компонэнты творчасьці Цішкі Гартнага.

Літаратурны портрэт будуецца ў яго звычайна на прыёме лейт-мотыву, які адпавядае агульнай волюнтарысцкай установцы творчасьці. Апісваючы надворны выгляд сваіх герояў, пісьменьнік надзяляе іх рухавасьцю, сілай, падкрэсьлівае ў іх выраз валявой мэтаімкнёнасьці, вытрыманасьці. Вось, напрыклад, як малюецца портрэт Лаўрэна Сявені ў апавяданьні „Таварыш“: „Сярэдняга росту, худашчавы з твару, брыты; рухавы, з пранізаватым узрокам, з яўным выразам рашучасьці“. У портрэце рэволюцыянэра Сёмкі вызначаецца яго самаўпэўненасьць, як вынік валявой вытрыманасьці: „высокі, стройны, з кудрастымі валасамі, сінявокі, белатвары, сьмяшлівы заўсёды, спакойны ў горы і шчасьці“...—вось быў Сёмка, гаворыць аўтар. У портрэце Рыгора Нязвычнага нават такая драбніца, як „узмахі рукі пружыністыя, кароткія“, трапна адпавядае агульнай загартаванасьці героя. Творчая домінанта пісьменьніка, яго эмоцыянальна-валявыя імкненьні, азначаюць сабою і літаратурны пэйзаж Цішкі Гартнага. Даны компонэнт не адыгрывае самастойнай ролі ў творчасьці пісьменьніка. Прырода малюецца ім, папершае, як фон працы; яна ўваходзіць як адзін з складовых элемэнтаў у абразкі касавіцы, жніва і інш. Падругое, прырода бярэцца як антытэза, якая процістаўляецца брыдкім умовам майстэрні. Гэткую антытэзу поэта расчыняе ў сваіх „Песьнях гарбара“:

Там, за вакном, ціха неба сінее,
Сонца там дзіўна і сьвеціць і грэе,
 Я-ж у сьпякоце,
 Ў гразі і у поце,—
 Я на рабоце...
Цягнуцца к лесу чароўныя далі;
Мураўкай, поплавам зямлю заслалі,
 Як дываном;
 Там ноччу і днём
 Вясельле кругом...
А я, адарваны ад гэтай красы,
Запёрты нядоляй ў чатыры сьцяны
 З сабачкай, з нажом
 І ноччу, і днём
 Стаю за сталом...

Нарэшце, прырода выступае ў Цішкі Гартнага як суб'ект барацьбы, як носьбітка проціlежных элемэнтаў. Поэта ня любіць рысаваць ідылічных малюнкаў прыроды, яму больш падабаюцца грозныя, магутныя зьявы яе. Адсюль нараджаюцца ў яго малюнкі навальніцы, завірухі, у якіх поэта бачыць сваяасаблівы бунт прыроды; ён, напрыклад, зазначае:

Люб мне ветру посьпеў люты—
Песьні вольнай вызваленьне,
Калі цішы мёртвай путы
Ўсё губляе з аблягчэньнем.

Ня любіць поэта мёртвай цішы ў прыродзе; таксама адпіхае яго ад сябе і „мёртвая ціша“ ў жыцьці людзей. Тымчасам гэта ціша атачала яго ў форме спрадвечнага быту дарэволюцыйнай Расіі. Цішка Гартны ня мог абмінуць гэтага быту, на свае мастацкія палотнішчы ён наносіць і шматлікія чыста жанравыя зарысоўкі, але даныя зарысоўкі таксама выяўляюць сваяасаблівую манеру аўтара. Толькі працоўны быт сялянства выклікае да сабе замілаваньне пісьменьніка, у гэтым быце ён выяўляе сваяадменнае хараство, глыбока захаваны эстэтызм працы. Другі об'ект жанравых зарысовак Гартнага—сямейны быт—выступае ў яго ў зусім іншым асьвятленьні, пераважна як адмоўная зьява. Пісьменьнік выкрывае брыдкія падставы сям'і местачковага мяшчанства і кулацтва; ён паказвае нам, што гэта сям'я грунтуецца на дэспотызьме, камэрцыйных разьліках, што яна калечыць жыцьцё чалавека. Зося, героіня роману „Сокі цаліны“, абмалёўваецца як няшчасная ахвяра такога спрадвечнага сямейнага быту. Жанравыя зарысоўкі пісьменьніка ў большасьці прасякнуты духам антымяшчанства. З вялікім засмучэньнем, амаль у сатырычных рысах, абмалёўвае, напрыклад, аўтар мяшчанскую багну местачковага жыцьця: „У Сілцох самыя маленькія здарэньні: як вясельле, радзіны, нават асьвячэньне хаты ці другія дробныя папойкі, былі нейкімі асобнымі навінамі, аб якіх стараліся праведаць усе мяшчане, і аб якіх гутаркі знаходзіліся на цэлыя тыдні. У такім ціхім стаячым жыцьці, якое панавала ў Сілцох, і ня дзіва, што кожная муха—заваруха: кожнаму надазаляе аднаковасьць да ача-

мернасьці, набівае адваротную аскому і нават стамляе душэўна“ (I, 1.09). Нават народныя звычаі, як уладзіны, вясельле, не выклікаюць асаблівага захапленьня з боку аўтара; малюнкі гэтых звычаяў пазбаўлены ў яго фэерычнай романтыкі, і тут на першы плян выступае суровая проза жыцьця. Быт абмалёўваецца Гартным у большасьці выпадкаў як мёртвая косная сіла, ён падаецца як антытэза рэволюцыйнай мэтаімкнёнасьці.

Такім чынам, літаратурны псэўдонім пісьменьніка добра вызначае ня толькі асноўны характар жыцьця аўтара, але і яго творчасьці, якая разьвівалася пераважна пад знакам рэволюцыйнай загартаванасьці; рэволюцыйны волюнтарызм зьяўляецца асноўнай асаблівасьцю псыхоідэолёгіі Гартнага ў яе клясавай аснове. Сапраўды, мудрасьць інтэлігенцыі супадае з мудрасьцю дэкартаўскай формулы: Cogito, ergo sum, мысьль, разважаньне, ад якога „бляднее румянец волі“, выяўляе сабою сутнасьць інтэлігенцкай псыхікі. Патос творчасьці такіх чыста інтэлігенцкіх пісьменьнікаў, як Анатоль Франс, Ромэн Ролян, гэта патос мысьлі, разважаньня. Філёзофія клясаў зыходзячых апускаецца звычайна да пустога гедонізму казытаньня нэрваў. Сэнс жыцьця яны бачаць толькі ў асалодах, асабліва ў каханьні. Духам гедонізму прасякнута, напрыклад, усё мастацтва, у тым ліку і літаратура сучаснай буржуазіі. Не дарэмна адзін з найноўшых буржуазных романаў азагалоўлены формулай: amo, ergo sum (кахаю, значыць існую). У гэтай формуле ўвесь сэнс мудрасьці клясаў зыходзячых. Мудрасьць клясаў узыходзячых, працоўных клясаў, гэта—мудрасьць валявога напружаньня,—мудрасьць працы і барацьбы, бо толькі ў гэтым заключаюцца шляхі самасьцьвярджэньня ўзыходзячай клясы.

Даную мудрасьць працоўных шырока і поўна адбіў у сваёй творчасьці Цішка Гартны. Для яго im Anfang war Tat, „у пачатку было дзеяньне“, а ня лёгос, мысьль. Дзеяньне зьяўляецца краякутным каменем усёй творчасьці Цішкі Гартнага, ад чаго і сама гэта творчасьць робіцца аднэй з цаглінак новай соцыяльнасьці, гэта творчасьць выконвае функцыі жыцьця, будаўніцтва, яна заражае нас настроямі барацьбы, загартоўвае нашу волю да канчатковай перамогі.

Проф. *М. Піотуховіч.*

# ПЕСЬНІ ПРАЦЫ Ў ПРЫГОНЕ

## ПЕСЬНІ ГАРБАРА

### I

Ах, як стрэлка марудна ідзе,
Бы знарок хоча час працягнуць!
Ї ня ведае болю грудзей,
Што дзяннога канца яны ждуць.

Нібы нехта трымае яе:
А ні ўперад, ні ўзад не сьпяшыць!
А так хочацца-хочацца мне
Ўжо работу сваю супыніць!

Цэлы дзень я за брудным сталом,
Цэлы дзень скуру цьвёрдую скроб,
Стаючы укапаным калом,
Я задушай атрутнаю соп.

Не глядзеў і ня бачыў нічуць,
Што там ёсьць на дварэ, за вакном:
Ці там ветры халодныя дзьмуць,
Ці зямля апавіта цяплом.

Навакола чатыры сьцяны,
А на іх заплясьнелая столь,
У сабе захавалі яны
Маю крыўду, жаданьне і боль.

Вось і вечар... цяпер я на міг—
На адзін—сабе волю найду,
Кіну-рыну усё і усіх
Ды у поле я к лесу пайду.

Там сродзь галу зялёных лугоў
Я адкрыю збалелую грудзь,
І мне з пахам прынадным кятоў
Ветры цёплыя ўцехай падзьмуць.
Яны прагную душу маю
Ўпояць воляй шырокіх палёў,
Упрыгожаць пакутную ўсю
Цеплатою пахучай сваёй.
А як сілы—жывіцелькі той
Набяруся даволі ў палёх,
Мне лягчэй стане ў працы цяжкой
У майстэрні, ў сьцянах чатырох.

Вількамір, 1912

## II

Сагнуўшыся, я ля варстата стаю—
Скуру весь дзень без спачынку я гну,
Я скуру ўсё гну,
Нядолю кляну—
песьню пяю.
Дзёгаць і лой мае рукі разьелі,
Шчокі ў гразі ды смуродзе шчарнелі,
Ружа завяла,
Шчасьце прапала,—
Скура забрала...
Там, за вакном, ціха неба сінее,
Сонца там дзіўна і сьвеціць і грэе,
Я-ж у сьпякоце,
Ў гразі і ў поце,—
Я на рабоце...
Цягнуцца к лесу чароўныя далі;
Мураўкай, поплавам землю заслалі
Як дыванам;
Там ноччу і днём
Вясельле кругом...
А я адарваны ад гэтай красы,
Запёрты нядоляй ў чатыры сьцяны
З сабачкай, з нажом
І ноччу, і днём
Стаю за сталом...

Вількамір, 1912

III

Гэй, не тамецеся, рукі,
Ногі, пакіньце дрыжаць!
Многа ‘шчэ ўперадзе мукі,
Прыдзецца многа прыняць...
Гніся-ж ты, выцяжка, гніся,
Сілы, брат, болей давай!
Стой ля стала, ня хініся,
Часу ня траць, не цярай.
    Шоргай, сабачка, паволі,
    Скуру паважна скрабі,
    Нам не пазбыцца нядолі,
    Што ты сабе ні рабі.
Гэй, не глядзі на нічога,
Вока нічым не блазнуй!
Тут твая сходзіць дарога,
Стой-жа, браток, і працуй...
Дня хоць ня бачыш і ночы,
Плечы хай корчыць, шчыміць,
Пот залівае хай вочы,
Трэба рабіць і рабіць.
    Шоргай, сабачка, паволі,
    Скуру паважна скрабі,
    Нам не пазбыцца нядолі,
    Што ты сабе ні рабі.
Трэба рабіць, калі трэба
Кожын дзень голад стаміць

Чорным кавалачкам хлеба,
Трэба рабіць, кабы жыць...
Дотуль рабіць, покуль сілы
Ўжо не пакінуць трымаць,
Кроў не застыгне у жылах,
Сэрца ня кіне ўдараць.
Шоргай, сабачка, паволі,
Скуру паважна скрабі,
Нам не пазбыцца нядолі,
Што ты сабе ні рабі.

Вількамір, 1912

## IV

Я рабочы, гарбар,
Рыцар працы цяжкой,
Я з жалезнай душой,
З сэрцам палкім, як жар.

У вачох іскры маіх,
А жалеза ў руках,
Скура гнецца ад іх
Ў адзін міг, ў адзін мах.

Ці задушша ці чад—
Усё на сэрцы маім,
Але ўстрашыці на'т
Не здалее нічым.

Кроўю цёплай сваей
Абліваю тавар,
А сьлязою з вачэй,
Што сплывае праз твар,

Харашу я яго,
Дзеля густу людзям...
Не, жыцьця я свайго
Для другіх не аддам.

Я здружыўся з трудом,
Я ў ём рос, я ў ём крэп;
Люблю мець за сталом
Запрацованы хлеб.

Не хачу, ня прывык
Склаўшы рукі хадзіць:
Я гарбар—працаўнік,
Я жыву—каб рабіць.

Маю сілу і гарт—
Імі грудзі гарадь...
Ды што ў гэтым я варт,
Што магу працаваць,
Не гатовае браць?

Вількамір, 1912

## V

Не здавайся, гарбар,
Ты за працай сваей,
І на шчасьця прыход
Не заплюшчвай вачэй!
　　Песьню вольную пей
　　У дыму, ў духаце,
　　І надзея твая
　　Няхай кветкай цьвіце.
Бо дзе сіла жыве,
Дзе работа кіпіць,
Там насеньня зярнё
Лепшай долі ляжыць.
　　І ты мукай сваёй
　　Глебу ладзіш яму
　　І сам сееш яго
　　Ў заарану зямлю...
Не здавайся, гарбар,
Ты за працай сваей:
Глебу пільна гатуй
І ў ёй шчасьце, брат, сей!

Вількамір, 1912

VI

Я гарбар малады,
Я вясёлы ўсягды,—
Як працую—пяю,
Цэлы дзень за сталом
Я з сабачкай, з нажом
Няутомна стаю.
І вясёл, і рачыст,
Я пад грук і пад сьвіст
Цяжкі труд прадаю.
Вось ў дыму, у брыдзе
Ля братоў, ля людзей
Шчасьце й долю кую.
Хоць ад працы мае
Часам мне не стае
На'д яды даставаць,—
Не гарую патом
Я задужа аб том,
Як іду працаваць.
І працую ад сіл,
Бо труд вельмі мне міл,—
А за працай пяю.
Я гэрбар малады,
Я вясёлы ўсягды,
Бо я шчасьце кую.

Вількамір, 1912

## ГАРБАР НА ВАНДРОЎЦЫ

*Прысьвячаецца Цімоху Гамзе*

Дожджык пакрапляе,
Дзень стаіць халодны,
Шпаламі шагае
Ў пуць гарбар галодны.

Ногі чуць клыпаюць
І грабуць нясьмела;
Вочы пазіраюць
Сумна, асавела.

Апусьцілісь рукі
Ад цяжкой утомы...
Дзе-ж сканчаньне мукі
Яго—невядома.

Сэрца болем рэжа,
Сэрца болем плача...
Ў зношанай адзежы
Холадна, бядача!

Косьці боль ламоча,
Цяжар дацінае...
Гарбар есьці хоча,
Хоча—ды ня мае;

Ўчора йшчэ з астаткам
Грошы ён растаўся:
Ў месцы на дзесятку
Ён падмацаваўся.

І пашоў на вочы
Холадам, сьлютою,
Каб дайсьці да ночы
Ў месца дзе другое;
Каб хаця дзе мала
Працы расстарацца:
Сэрцу-б лягчэй стала,
Якісьці бадзяцца.
Але што-ж, ня чуюць
Людзі і ня бачуць,
Як браты гаруюць
І ў нядолі плачуць.
А на крык: „работы!“
— „Ў нас няма! “гукаюць,
І ўнутру з ахвотай
Далей адсылаюць,
Ня спытаўшы брата,
Ці ён есьці хоча,
Ці ён знойдзе хату
Адпачыць уночы...
Вось ідзе памалу,
А куды—ня знае;
З шпалы ды на шпалу
Ціханька ступае.
Падбіў ногі моцна
І стаміўся дужа;
На людзей ён злосны,
Злосны і на сьцюжу.
З гораду у горад
Блукае, клыпае,
Гоніць яго холад,
Голад падганяе.
А ўсьлед з імі гора,
Гора сьледам ходзіць
І ўсяму гавора
Гарбару пражкодзіць,

Каб ён не дабіўся
Сабе лепшай долі,
Шчасьця не дажыўся
Навекі ніколі.
А за што? Хто знае,
Чым ён вінаваты?
Доля, бач, такая—
Ёю ён прадаты...

. . . . . . . . . . . .

Дожджык пакрапляе,
Па гразі хлюпоча,
Гарбара пужае,
З гарбара рагоча.
А у тахт начыне
З дажджом песьню грае,—
Сэрца ад ёй стыне,
Кроўю ацякае.
Поўны весь клапотаў,
Йдзе гарбар, сьпяшыцца...
Дзе-ж то на работу
Ён прыстаканіцца?..

Магілеў н/Д, 1912

## ПЕСЬНЯ ГРАБАРА

Я ўсё жыцьцё свае, дзень-у-дзень, год-у-год,
Землю цяжкай лапатай капаю, як крот;
Век пад сонцам й дажджом гну пакутную сьпіну,
Раскідаючы глыбамі торпу і гліну,
Ліпкі глей, бы смалу, ды рассыпчаты жвір;
Я праводжу канавы удоўжкі і ўшыр,
Нібы стужкамі землю абвязваю ўкруг.
Я дарогу гранічу, гранічу і луг,
І спускаю з балотаў я лішнюю воду,
Ды рэжу раўкі для платоў агароду.

Так ўсё жыцьцё свае варушуся ў зямлі,
Хоць пад сонцам жыву, а калі-ні-калі
Толькі бачу я вокам адкрытым яго.
Хоць ня зьмерыць наўкола прастору ўсяго
Неаглядных палёў, неаглядных лугоў,—
А кармлюся красою я іх дзеля сноў,
І у мёртвым сваім, незварушаным сну
Бачу шчасьця свайго ў надыходзе вясну.

Я ўсё жыцьцё свае, дзень-у-дзень, год-у-год,
Землю цяжкай лапатай капаю, як крот,
І так многа, я многа яе накапаў!
Направодзіў шырокіх і доўгіх канаў,
І прарэзаў я цэлыя мілі равоў:
Шмат, ой шмат я са сьвету балотаў так зьвёў,

І багата вады праз равы прапусьціў,
А ў ваду тую шмат я крыві свае ўліў,
Ды з гарачым сваім яе потам зьмяшаў,
Пад вадою-ж на дне свае гора хаваў.

Я ўсё жыцьце свае, дзень-у-дзень, год-у-год,
Землю цяжкай лапатай капаю, як крот.
Натачыўшы абклад я лапаты свае,
Вечна долі шчасьлівай шукаю сабе.
У халоднай нячулай зямлі
Можа хто захаваў яе, матку, калі
І дагэтуль яна бяз руханьня ляжыць,
А зямля ня пускае яе к людзям жыць.
Вось яе тут шукаю цяпер,
І як толькі знайду, пракапаю ёй дзьвер,
Нарасхлест перад ёю, слугой адчыню,
Хай нясе яна сьвету ўсю радасьць сваю.

Я ўсё жыцьце свае, дзень-у-дзень, год-у-год,
Землю цяжкай лапатай капаю, як крот,
І як многа ужо я яе накапаў!
Што-ж за працу сваю я ў адплату дастаў?
Што за плён мне зямля, за труды прынясла,
За той пот і за кроў, што сабе узяла,
За бурлівую рэчку гарачых тых сьлёз,
Што ўсё жыцьце мае паабмыў імі лёс?..
О, дала яна мне, ой за працу дала;
З калючковых расьлін мне вяночак спляла,
З медзі звонкай, цяжкой даравала шнурок,
А дарогу жыцьця ухарошыла ў мрок,
Каб я шоў, як сьляпы, каб бясконца я йшоў,
Землю вечна капаў і дабра не знайшоў.

Магілеў н/Д. 1911

## КАВАЛЬ

Многа працы ў мяне—
Хоць ўсю пору працуй!
Грэй жалеза ў агне,
Вымай з горыну й куй.
Молат важкі трымай
Над кавадлам якраз,
Зьнізу ўверх паднімай,
Зьверху ўніз, раз-у-раз.
Адвярніся насьпех,
Як сумееш урваць—
Не забыцца, каб мех
У свой час паддуваць.
Адно іскры ў бакі
І да верху лятуць,
Як паважна з рукі
Малаты важка б'юць.
Раз—другі, і сашнік
Можа ў поле ўжо браць
Гарацешны мужык,
Сваю ніву гараць.
Трэба шворан у воз—
Я згатую як сьлед;
Абіць буксу калёс—
Я й да гэтага мэт.
Рукі знаюць настрой,
Молат ўслушны ка мне
На ўсё жыцьце цяжкой
Працы хопіць ў мяне.

Магілеў н/Д, 1911

## ПЕСЬНЯ ЖНЯІ

Пад сярпом маім крывым
Жыта хутка гнецца,
Сноп за снопам у радкі
Покладам кладзецца.

Не баюся сьпёкі я
Сонца агнявога
І ня чую, што баляць
Рукі, крыж і ногі.

Пот ліецца ручайком,
Смага забірае;
Я-ж вясёлая ўсё жну,
Жну ды падпяваю.

Час пасьпешна так ляціць—
Скора вечар будзе,
І я нівачку сваю
Так дажну, як людзі,

Ды пасьпею мо' яшчэ
У снапы зьвязаці.
Ох, люблю-люблю сваё—
Сваё жыта жаці.

Як сажну яго я ўсё
І зьвязём дахаты,
Будзем хлеба на год мець,
Будзем мы багаты.

А салодак свой хлябок
	(Каб-жа быў ён вечан!),
Хоць і чорны, і крупны
	І няўмела сьпечан.

Эх, хутчэй-хутчэй рука
	Ты з сярпом махайся!
Будзь ты, жыта, ядраным
	І ўмалотным ўдайся...

Пад сярпом маім крывым
	Хутка жыта гнецца,
Сноп за снопам у радок
	Покладам кладзецца...

Вількамір, 1912

## КАЛЫСНАЯ ПЕСЬНЯ

Сьпі, дзіцятка, люлі, люлі,
Сьпі, сынок, адпачывай.
Усе дзеткі ўжо паснулі,
Ты таксама засынай.

Сьпі яшчэ пакуль маленькі,
Покуль сталым станеш быць.
Сьпі, сынок мой дарагенькі,
Ўсё жывое ужо сьпіць.

Будзь нядбалы, ты-ж ня знаеш
Ані гора, ні бяды,
Покуль бацьку сабе маеш
Ды сам бацька малады.

Ля цябе ён загаруе
На адзежу і на хлеб,
І на сталага ўзгадуе,
Каб дарослым пусьціць ў сьвет.

Сьпі, галубе, ціха ў хаце,
Моцы, сілы набірай,
Цябе цешаць бацька й маці—
Іх уцесе патурай;

Бо як вырасьцеш, дзяцінка,
Не пасьпіш цішком тады,
Ня сустрэнеш і хвілінкі
Ты свабоднай ад нуды.

Гора сілаю загоніць
Ў цёмны горад, на завод,
Дзе машына енчыць, стогнець,
Нутр разьядае смурод.

Там ад раніцы да ночы
Ў цяжкай працы прастаіш...
Ну-ж, заплюшч, галубе, вочы
Ды засьні... Чаму ня сьпіш?

Там цябе прывяжа сіла
Да машынаў, да сталоў,
Дзе ты будзеш да магілы
Стаяць зьвязаным, бяз слоў.

Замест песьні над калыскай
Тваеі маткі дарагой—
Гуд машыны, рамнёў піскі,
Будуць вісець над табой.

Промень сонца цёплым летам
Да цябе не даляціць;
Ты разлучышся са сьветам,
Як ў вастрозе будзеш жыць.

Будзе дарма сэрца рвацца
На прыроду паглядзець,
Сіл і сьвежасьці набрацца,
Супачынку хвілю мець.

Ды ня выстачыць патоля
Адарвацца ад машын,
І ня ўбачыш мо' ніколі
Сонца й лесу, мілы сын.

Сьпі-ж, малы, спакойна ў хаце,
Моц і сілу сабірай—
Покуль цешаць бацька й маці,
Іх суцесе патурай.

Пецярбург, 1914

## ПАЗЫЎ

У майстэрні гразь, смурод,
Духата і грукі;
Залівае вочы пот,
Млеюць з болю рукі.

Маркатлівы сьветазмрок
Ў сэрцы жальбу родзіць,
Рвешся думкамі ў далёк—
К шыры ды свабодзе.

Скрозь зацьмянае вакно
Ўзрок тайком лунае,
Дзе навокала, відно,
Поплаў разьлягае,

І ядвабны небасхіл
Ападае к гаю,
Між якога сьветны пыл
Хвалі калыхае;

Нібы золатам ліе
З высі промень сонца...
Прага ў грудзях устае
Мучыць, тне бясконца.

Адарваўся-б хоць на міг
І панёсься-б, здэцца,
Да прастораў палявых,
Дзе жыцьцё ліецца;

Разгарнуў-бы там хоць раз
Як мага пастацу
Й на кароткі які час
Занядбаў-бы працу.

Але штосьці мне з кутку
Потайкам гавора:
„Цябе, браце, к верстаку
Прыкавала гора.

„І ад малых, брат, дзянькоў
Аж да труннай дошкі
Трэба часу каб ня зьвёў
Марна ты ні трошкі“...

У майстэрні гразь, смурод,
Няма й кропкі сонца;
А я мушу год-у-год
Ў ёй карпець бясконца.

Вількамір, 1912

## НА ЗБАНОК І ЙДЗІ...

На збанок і да крыніцы
Зачарпнуць схадзі вадзіцы,
Што плюхоча—серабрыцца,
  І напіся ты яе,—

Хай ў прыпарную сьпякоту,
За руплівую работай,
Поўнай ўтомы, поўнай поту,
  Яна сілы паддае,

Падліе бадзёрай сілы
Ўсяму целу, з цела-ж—жылам,
Да работы сьпешнай, пілай
  Дасьць ахвоту, дасьць пазыў.

Хай заходзяць прутка рукі,
Паліюцца песьняў гукі
І ня будзе ў працы мукі
  На прасторы сьвежых ніў.

Праца будзе паспарацца,
Сэрца-ж радасьцю гайдацца,
  Глядзючы на буйны плён.

На-ж збанок і да крыніцы,
Зачарпнуць схадзі вадзіцы,
Што крышталем серабрыцца,
  І змый ўтому, і змый сон.

Капыль, 12/XI 1912

## Я НЯ МАЮ СРЭБРА...

Я ня маю срэбра, я ня маю злота,
Я ня маю пекных каменных палацаў,
За то маю сілу, каб рабіць работу,
За то маю хэньць я да ўсялякай працы.

Лом вазьму у рукі, ці вазьму лапату—
Б'ю, шчамлю, капаю землю і карэньні
Ї бяру за гэта я сабе ў адплату
Толькі на пражытак, хоць раблю старэнна.

Але мой заробак лепш мне за палацы
Ї пякней за срэбра блішчаць каплі поту,
Бо ён мне даецца за цяжар у працы,
Бо той пот купае творчую работу.

Пецярбург, 1914

# КАСЬБА

Ня спадлі 'шчэ раньнія росы
Ї сонца ня стала сіяць,
Як гострыя ў поплаве косы
Вясёла і зычна зьвіняць.

Бліскаюць рэзва на сонцы,
Сьвішчуць, шумяць у траве.
Думкі жывым валаконцам
Уюцца ў касцоў ў галаве.

Росная гнецца травіца
Роўна, пракос у пракос.
Радасьць у сэрцы іскрыцца,
Труд нам адплату прынёс.

Гэй, разыдзецеся рукі,
Косы так востра бяруць,
Цела ня ведае мукі,
Ногі спачынку ня ждуць!

Сонца яскрава зіяе,
Ветрык нячутна шуміць;
Роўна трава правядае,
Весела сена сушыць!

Песьнямі спорыць работу,—
Бабы і хлопцы пяюць.
Поўны працоўнай ахвоты
Сэрцы іх радасна б'юць.

Зыкі сталёвыя клёпу
Песьняй срабрыстай зьвіняць.
Ссохшае сена у копы
Бабы сьпяшаюць складаць.

Тут-жа растуць ў вачавідкі
Тоўстыя копы у рад.
Многа выказвае пryткі
Посьпех рухавых дзяўчат!

Праменем смуглыя твары
Ў працы жывой аддаюць.
Многа гадзіны прыпару
Сіл у людзей адбяруць!

Толькі ня дарма ўсе сілы
Людзі сьцяраюць свае,
Праца ўвесь сьвет ускарміла,
Праца нам шчасьце дае.

Працаю сілы прыроды
К людзям у слугі ідуць,
З ёю-ж у сьвеце народы
Лепшае долі прыждуць.

Вількамір, 1912

## ТКАЧЫХА

За варстатам дні і ночы,
У духаце нязноснай,
Я старэнна і ахвоча
Тку—ліцую кросны.

Скрып чалядаў песьню грае,
Рыпаюць вітушкі,
Чаўнакі два з краю к краю
Лётаюць, як птушкі.

Рукі вёрткія мігаюць
Ў нясупынным маху...
Дні гадзінамі мінаюць
Без сьлядоў, бяз знаку...

Прыдзе настрай і даволі...
Што-ж бы разрабіцца:
Локцяў з пару, або болей
Саскладаць па нітцы.

Эх, каб, здэцца, дзень той цёгся
Хоць як два, ці далей,
Чалавеку-б удалося
Мець запасу маласьць.

А то дрэнчыш бясьсьціханьня,
Градам пот ліецца,
А ад працы, ад стараньня
Й чуць не астаецца.

Што парадзіць? Трэ' гадзіцца,
Пакуль прыдзе зьмена.
Дык шчыльней-жа нітка к нітцы
Цісьніся старэнна.

Не стамляйцеся ў натузе
На падножках ногі,
Супярэч атрутнай тузе
Сэрца з перамогай,

А вось болей напну жылы,
Дык крыху падспору...
Гэй, гартуйся ў працы сіла—
Вочы зорце ўгору!

Капыль, 1912

## БЕЗ РАБОТЫ

Няма працы—й сэрцу млосна—
Не знайсьці спакою...
Я так шчыра, я так моцна
Зжыўся змалку з ёю.

Дзень прыходзіць і пытаньні
Пруцца, лезуць ў душу:
Што да вечара ад раньня
Я рабіці мушу?

Рэзвым бегам кроў ня льецца,
Рукі зьвісьлі кнізу;
Сэрца верою ня б'ецца,
З думак—адны рызы.

Беглым ўзрокам хвіляй гляне
Водгуку надзея—
І у момант-жа растане—
Толькі зьяў павее...

Ходзіш—блудзіш і, здаецца,
Дарма траціш сілу—
Цяжкім болем сэрца рвецца,
Людзі, сьвет нямілы...

І ня тое, што работа
Голад прыпыняе,
Ва мне родзіць ўсе клапоты
Сумам абвявае.

Не, ня тое. Хопіць з гэтым
Сіл ва мне зьмірыцца,
Мяне мучыць, што для сьвету
Нечым прыгадзіцца;

Што задарам прага гіне,
Як пясок ў балоце,
Дні і ночы няупынна
Аддаваць рабоце...

Няма працы... цяжка гэта
Мне цярпець бяз меры,
Бо ў ёй лёс мой, мая мэта —
У ёй спадзеў і вера.

Пецярбург, 1913

# СЯВЕЦ

Ўставай, сявец! бяры сяўню,
Аўса, вады давай у волю
Свайму ты вернаму каню
І ўжо рыхтуйся ехаць ў поле.
Прышла вясна, і там цябе
Чакае вызьвеўшая ніва;
Яна гатовая к сяўбе
Й сяўца чакае ўжо рупліва.
За зіму ўспрэўшая зямля
Табе аддасьць за працу многа!
Ўставай, сявец! Няхай сяўня
Ня будзе пуста і убога.
Рукой зярнят бяры паўней
Ды кідай мерна жменя ў жменю;
Са збожжам ў сэрцы думкі сей
Надзеі, волі, адраджэньня.
Ўставай, сявец! І тое знай,
Што думак глеба не абмане,
А дасьць багаты ураджай
За пот праліты, за стараньне.
Ўставай, сявец! Ідзі, litary
Зьдзярнелай нівы твае гоні;
Прышоў твой час—ужо пара
Пачаць сяўбу яшчэ сягоньня!

Капыль, 1909

## НОВАЯ ХАТКА

Будуйце, майстрове, будуйце хутчэй,
Вы гэтую новую хатку,
Цярпліва кладзеце фундамант мацней.
Хоць цяжка бывае спачатку,

Аднак ня сумуйце і ўсе грамадой
Пры песьні зычлівай, вясёлай,
Майструйце паважна сьцяну за сьцяной,
Ўзьнімайце іх вышай, ўсё вышай ад долу.

Сукі, крывізну абсякайце нашчэнт,
Хай шчыльна майструецца кладка,
І моцнаю будзе, як моцны цамэнт,
Нам гэтая новая хатка.

А ў хатцы у новай так люба пажыць
У вокны яе паглядзецца!
Сьвятло, што ад сонца ў яе забяжыць,
Утомленым сэрцам пап'ецца.

І соладам хмельным пяройдзе нутром
Ажыўшая мара-загадка.
Будуйце, майстрове, сьцяну за сьцяной—
Будуйце вы новую хатку.

Фундаманту ў меру прарыты равы,
На камені ляжа падруба.
Глядзеце на вытвар, што строіце вы,
Дзівуйцеся толькі, як люба!

За дзень, за другі і чатыры вакны
Бадай ужо будуць гатовы,
І толькі рабеце, каб шырай яны
Раздаты былі пры аснове.

Каб новая хатка вясельшай была,
Каб променю буйныя шматы
Жывільнага сонца, сьвятога цяпла,
Ліліся жаролами ў хату.

Ды кроквы, майстрове, ўздымайце вышэй,
Дугою, загнутаю строма,
Каб кроплі сьцякалі навальных дажджэй,
У страсе не псавалі-б саломы.

Гэй, праўда, майстрове, павінны вы знаць
Будову ў канец ад пачатку.
Ня раз ужо вам давялося стаўляць
Хлявы і гуменцы ды хаткі.

Будуйце-ж па знаньню, будуйце, майстры.
Паважна стварайце, старэнна,
Ўстаючы к рабоце ад раньняй пары
І працу канчаючы к цемні.

Вытворчай рабоце так многа падзяк,
Павагі так многа для працы!
Ня кідайце-ж пэнту вытворчага так —
Энэргіі вашай ня траціце.

Хто ў хатку ўбярэцца і будзе ў ёй жыць,
Гадкі каратаць папарадку,
Ня будзе магчы той, майстры, вас забыць
І шчырае дзякуй вам скажа за хатку.

Капыль, 1913

## ЗА ВАКНОМ

Вокны ўсе нарасхлест!
Хай расходзіцца чад,
Духата і смурод.
За вакном
Столькі сонца й кятоў!
Гнецца к сьценцы агрэст,
Вішань беленькіх рад
Падае цераз плот
Гальляйком
Сьвежы пах ад цьвяткоў.
І гудуць, і пяюць
Птушкі, пчолкі у тон;
Шалясьціць вецярок
Па лісткох
Руцяністых дзярэў.
Грудзі смаглыя ждуць
Піць паветра з вакон;
Вочы—кідаць узрок
Па лугох,
Слухаць птушыны сьпеў.
Нарасхлест вокны ўсе!
Няхай водыр палёў,
Няхай сонца прамень,
Пекнату
Неабмерных нябёс
Повей ветру нясе

Да сьмярдзючых сталоў,
У затухлую цень,
　　Ў духату,
Ў сьвіст шнуроў, ў гуд калёс-
Вольны гал вольных мест
Родзіць волю, уздым
Разьдзьмухае той жар,
　　Што спусьціў
Жыцьцятворачы дух.
Вокны ўсе нарасхлест!
Хай расходзіцца дым,
Хай спадае цяжар,
　　Што спавіў
Разьвярнуўшыся рух.

Капыль. 15/VI 1913

## ХАЦЕНЬНЕ

Каб я птушкаю быў,
Каб умеў я лятаць —
Я-б у лесе ня жыў,
Не лятаў-бы між ніў,
Й не хацеў-бы зьвіваць
На дзярэўцах ў гаю
Гняздо-хатку сваю.

Я-б прывольле палёў,
Зеляністасьць лясоў,
Лёгкасьць цёплых вятроў,
І празрыстасьць вады—
Занядбаў-бы тады.

Я-б заўсёды лятаў
Між высокіх дамоў,
Дзе чуцён гучны роў
Ад машын ды гудкоў;
Дзе ў халодных сьцянах
На здраньцьвелых нагах
Соткі тысяч людзей
Сваю працу вядуць.
Каб я птушкаю быў,
Я-б ў заводах тых жыў
Й дзень ад дня упадрад
На вакнах паміж крат
Свае-б песьні пяяў,—

Каб адтуль, каго лёс
Запіхнуў туды быць,
Свае думкі ён зьнёс
На прыродны прастор,
Між палёў пагуляць,
Паразьвіцца між ніў...
Каб я птушкаю быў,
Каб умеў я лятаць!

Пецярбург, 1914

# ПЕСЬНІ ВОЛЬНАЙ ПРАЦЫ

## ПАНСТВА ПРАЦЫ

Прайшоў віхор вялікай сілы—
Узьняў сабою ён навалу
І скрэп старога — скрозь падгнілы—
Жыцьцё вакол закалыхала.
    Раздаўся гром і бляск маланкі,
    Прарэзаў ў небе гушчу цемні
    Й яскравым праменем заранка
    Сагнала сьлед пуглівых ценяў.
Вястун-трубач падаў пазовы
З муроў-заводаў, з курнай хаты,
І сьвет другі, шчасьлівы, новы
Сышоў на землю, воляй ўбраты.
    Красуй, ядрань, ўбірайся праца
    Ў адзеньні сьветлыя вянчаньня,
    І йдзі к жыцьцю, ў яго палацы,
    Сваё ўзмацоўваць панаваньне!
Дзе землю пляміў пот крывавы,
Дзе ў гону чыннасьць панавала,
Там воля моцныя падставы
Табе навекі збудавала.

Менск, 30/VI 1921

## ДА ПРАЦЫ

Была пара — пара няволі—
Няхай-жа згіне яе сьлед!
Няхай ніхто ад нас ніколі
Ня дасьць ні капелькі патолі
Вярнуць да ёй свабодны сьвет!
        Прышла пара, калі народу
        Праз сілу крэпкую яго
        Патрэбна віць вянок свабоды,
        Кавацъ дабро, братэрства, згоду
        Ля сьвету белага ўсяго.
Вось той ад нас, хто ясна чуе,
Што ён ня раб, а вольны сын
Усіх народаў і краін—
Няхай гародзе моцны тын,
Фундамант волі хай муруе!..

Ленінград, 1918

## ПРАЦА

Зірні,
Як вакол
Процьма кол
Нясупынна,
Стройна, чынна
Ўюць кругі
Чарадою.
Шасьцярні
Мітусяцца,
Імчацца
Стралою
Пасы.
Галасы
Рабочых
Пры рабоце
Ў траскатні,
Ў браскатні
Ня чутны—
Мруць яны
Ў калыханьні,
Ў клапоце.
Лезе ў вочы
Пыл, смурод.
Учарод,
Як зьвясьці
На пагляд,—

Упярод
Ї назад,
Упадрад
Шэсьць радоў
Панахіленых сьпін.
Як адзін,
Колькі сот
Чалавек
За парухам
Машын
З заміраньнем
Дыханьня
Сачаць...
Малаты—
Тук-грук,
Тра-а-ты—
Грукацяць.
Сюд-тут—
З кута ў кут
Прабяжыць,
Паглядзіць
Майстар—цэх;
Яго бег
У адно
Валакно
Ніжа, ўе
Нясустрыманы рух.
Ззы-ы-ух!
Гры-ы-ры!
Шасьцярні,
Мянтухі...
Навакол
Процьма кол
Ўюць кругі.
Їх бягі
Сачаць сотні вачэй;

Сотні-ж рук
Ладзяць стук
У гармонь...
І гартуе агонь
Грозных домнаў пячэй
Працы пільнай вытвор
Яе гмах, яе спор!..

Капыль, 15/VI 1923

## ПЕРАПЛЁТ

Промень барэльефы камiноў
На зялёны поплаў зьвёў...
Выхiлястаю дарогай
Дыму скруткi плывуць логам...
Гонiць iскры на расу...
Ćтук, у заводзе—мо' касу
Б'е рабочая рука?..
Нiва пераплёты збажыны
Да фабрычнае сьцяны
Падцягнула з-пад гаёў...
Песьня б'ецца батрака
Ў цьвёрдасьць чорных камiноў...
Зовы перапевы падалi,
Гукам к нiвам паплылi,
Аддалiся за грудком,
Абляцелi хмызьняком,
Замiраючы ўдалi.
З хат, з ваколiц кватэраў па бруку
Блутным радам ў роўны цуг
Сьлесароў жывы ланцуг
Зазьвiнеў ў адказ гудку...
Вось-вось чуе гукi ўжо пастух,
Бачыць, дым крыху атух—
Праца шолам завяла:
Будзе серп i будзе плуг.

Вецер ціха лісьцем шалясьціць—
Гай трапеча, гай ня сьпіць;
Птушак стройны перапеў
Да заводу паляцеў,
Ў вокны сьветлыя прынік...
Чуй-жа песьню, працаўнік.
Сплецен, зьвіты дзіўны пераплёт
Жыцьцятворачых прыгод;
Б'юць крыніцаю яны...
Дзе ні глянь—відны, відны
Нявычэрпныя скарбы
Завяданьня і сяўбы,
Няўміручае красы
З веку ў вечныя часы...

8/III 1925.

# РАСЬСЬВІТАНЬНЕ

## ЖАДАНЬНЕ

Хоць чароўна ты, неба, ўсягды,
Хоць ты пекна ў сваёй вышыне,—
К тваёй высі, туды
Ўсё-ж ня хочацца мне.

На зямлі, на халоднай, сырой,
Дзе ні зорак, ні сонца няма,
Дзе нядоля і цьма,
Я шчасьліўшы душой.

Бо ў красе тваёй, неба, ўсё сьпіць,
Мэрам спалена страшным агнём,—
На зямлі-ж б'е, кіпіць
Жыцьце бурным руччом.

Вількамір, 1911

## Я ЛЮБЛЮ...

Я люблю, калі небны абшар,
Неспадзѐвана ўсім, нечакана,
Убярэцца ў адзежыну хмар,
Буйным ветрам здалёку нагнаных;

Калі гром над зямлёй прагрыміць,
Аж навокал зямля скалыхнецца,
Ды маланка агнём пачне неба паліць,
Аж яно на кавалачкі рвецца;

Калі вецер свой ўзьвей завядзе,
Разбураючы ўсё прад сабою,
І вакол, як ні глянь, ўсё гудзе,
Ў нясустрыманым буйным развою...

Я люблю гэты час! Яго ўздым
Непакорнай свабоднай стыхіі!
Нешта блізкае бачу я ў ім,
Што нутро маё радасьцю мые!

Капыль, 1912

## МАЯ СТЫХІЯ

Ў буры, ў навальніцы,
Ў громе, ў бліскавіцы,
У сіберным гуле
Ветранае сілы,
Ў хваляваньні мора,
Ў калыханьні бора—
Многае мне міла,
Многае мне блізка.

Ўсё вакол трасецца,
Ўсё кудысь нясецца,
Ломіць і зьнішчае
Вокала прашкоды.
І няма ні званьня
Сілам тым стрыманьня,
Як яны гуляюць,
Як яны бушуюць...

Хочацца пусьціцца
З імі мне й пазбыцца,
Што я чую, бачу,
Ведаю і знаю.
І ламаць паломам
З ветрам, з бурай, з громам
Ўсю бяду людзкую,
Што ў жыцьці пануе
З краю і да краю...

Вількамір, 1912

## МАЯ ХАТКА

Я збудую сабе хату
Пад нябеснаю шатою
На высокім стромым скату,
Над бурліваю ракою.
    Навакола па абшары
    Рунь багатая разьляжа;
    Ў буру неба ўбяруць хмары,
    Хмары чорныя, як сажа.
З неба будуць зычным гудам
Ка мне ў хату зьлятаць громы
І маланкі ад іх пудам
Спусьцяць мне свае паломы.
    Ў шыбы вокан вецер з даляў
    Сьвежай весткай пачастуе,
    Лёгкай, плаўкай сваей хваляй
    Маю хату пацалуе.
Ў гэнай хаце я ня мушу
Думкам нудным скутак даці,
Ў ёй я буду сваю душу
К волі вольнай прычашчаці.
    Ў гэтай хаце сроць прыроды,
    Ў дзікім гуле навальніцы,
    Я—пакорны раб свабоды—
    З ёй магчыму навек зьліцца.

Капыль, 1912

# ТАВАРЫШУ

Ці ты бачыў, як па моры
Пойдуць хвалі чарадою?
Як ў разгойданым напоры
Б'юць у бераг ў час прыбою?
    Мора пеніцца і зьліцца,
    Нясупынна коціць валы,
    З дзікай злосьцю прагне біцца
    Сілай ўздыбленаю ў скалы.
Каб зьвярнуць усе цьвярдыні,
Зруйнаваць усе прашкоды
Ды, разьліўшысь па раўніне,
Задаволіцца свабодай.
    Але моцна стаяць скалы,
    Адбіваюць ўсе напоры
    Буйных хваляў, дзікіх валаў,
    Што іграе імі мора...
Так і ты, таварыш мілы,
У жыцьці будзь нібы скалы
І адважна, поўны сілы,
Ваюй з бураю-навалай.
    Аб цьвярдыню гардай волі
    Разьбівай бяды напоры
    І ў барбе за шчасьце й долю
    Спыняй мора, зрывай горы.

Пецярбург, 1914

## НЯ ТРАЦЬ ЧАСУ НІ ХВІЛІНЫ...

Ня трацъ часу ні хвіліны,
Ня псуй часу ні мамэнту—
А працуй, як хопе пэнту
Для сябе і для краіны.

Жыцьцё бурнай рэчкай мкнецца,
Коціць хвалі вал за валам—
Хто бязьдзейны, хто нядбалы,
Той жыцьцём нашчэнт затрэцца.

Жыць і бачыць сэнс выразны,
Сваю мэту і жаданьне
Можна ў працы ды змаганьні
Нясупынных, бязвыказных.

Вількамір, 1912

# ЗВАНАР

Не прасьпі, званару! Толькі з неба гляне
Да зямлі маркотнай ясная зарніца,
Прагані хутчэй ты соннае драманьне
І усходзь пасьпешна ўгору, на званіцу;

Размахні рукою і званова сэрца
Скалыхні сярдзіта. Хай грымяць удары,
І хто сьпіць, хто дрэме—ўстане-скалыхнецца
І сьпяшыць на зовы. Не прасьпі, званару!

Ўсякі, хто пачуе, далей спаць ня будзе—
На твой бом прызыўны ня міне зьявіцца;
Толькі захавай ты у звановым гудзе
Моц сталёвай мовы, каб маглі разьбіцца

Аб яе да званьня рабскія устоі,
Каб ён гулкім бомам ўскалыхнуў абшары...
Няхай рынуць ў бойку цеснай грамадою
Тыя, над кім вісьлі цяжкай долі кары.
Не прасьпі, званару!

Вількамір, 1912

## БАЧЫЎ РАЗ Я, ЯК З-ПАД ХМАРЫ...

Бачыў раз я, як з-пад хмары
Заміргала ў небе зорка
І вакол па ўсім абшары
Асьвяціла дол і ўзгоркі.

Цені доўгія сьпяшылі
Па куточках расплывацца
І пры кожнай новай хвілі
Стала менш іх аставацца.

Промень сьветлага міргальня
Над зямлёю віўся шэрай
І ў душы радзіў жаданьні,
Ў сэрцы-ж сумным будзіў веру.

Не глядзелі ў неба вочы—
Іх цягнула к нізу, к долу
Посьле нуднай цяжкай ночы,
Сьветам зможанай наўкола.

Я дзівіўся з зоркі раньняй,
Час-ад-часу к ёй вяртаўся
І ці надаўга міргальня
Яе хопіць—ўсё пытаўся...

Але раптам скуль ўзяліся—
Ветры дзікія нагналі,—
Хмары ў небе расплыліся
Й зорку раньнюю схавалі.

Зноў па шэраму абшару
Патанула ўсё у змроку...
І за зоркай ў цемень хмараў
Я дарэмна кідаў ўзрокам.

Пецярбург, 1914

* * *

Ня хістайся, дуб зялёны,
Ад напору страшнай буры,
Ня хіні свае кароны
К зямлі нуднай, к зямлі хмурай.
Не глядзі пудлівым вокам
На уздымы дзікай сілы,—
А ваюй на кожным кроку
За жыцьцё ты да магілы.

Магілеў-Беларускі, 1910

# ОЗІРК

Акінеш вокам гал вакольны:
Палетак жытняй збажыны,
Зялёны пекны луг прывольны
Нязьмернай воку шырыны;

Аглянеш бор стары, драмучы,
І той разрыхлены курган,
Які пяском вакол сыпучым
Нібы-та рызаю вабран;

Супыніш ўзрок на тракце гразкім,
Што ўецца стужкаю кудысь;
На небе сінім ў зорных зразках,
Якія ўсеялі ўсю высь,—

І сэрца разам затрапеча,
Падыме, ўсхвале пачуцьцё:
Нячутнай роднай, здэцца, рэччу
Наўкруг гавора мне жыцьцё.

Ўстае ў прыгожым дзіўным зданьні
Нязьмернай пекнасьці абраз,
Які стварыла будаваньне
Бягучых дзён—бягучы час.

І лічыш ты гадзінаў зьнізкі,
І ў даль пускаеш свой пагляд...
І, здэцца, час абноўны блізка—
А час стары ідзе назад...

Вількамір, 1913

## ВЕЦЕР, ПАДУЙ!

Ой, падуй ты, вецер,
Шумна ды сіберна,
Падымі ты хвалі
На рацэ бязьмерна!
Няхай гоняць човен
Мой пуцінай вернай!
Я грабці ня кіну,
Я дзяржуся прудка;
Паглядзі, як вёслы
Закідаю хутка!
Што вярсту уперад
За адну мінутку!
Ой, падуй ты, вецер,
Сілай разганіся!
Паглядзі, як рукі
Швыдка разышліся!
Вось к грудзям да сэрца
Толькі прылажыся,
Ды паслухай пільна,
Як яно там б'ецца,
Што мацней за гул твой,
Стук яго нясецца,
То жаданьнем прагным
Плыць яно пражэцца,
У той край шчасьлівы,
Дзе зара сьмяецца!

Вількамір, 1913

* * *

Не хачу забыцьця я ў цудоўных чарах,
Каб ня мецъ ніякіх думак ды клапотаў,
А сядзець бязмоўна у салодкіх марах,
Апоены макам ціхае дрымоты.

Не прашу забыцьця на зямлі панурай,
Не прашу нямога, дзіўнага спакою,—
А прашу я моцна і прашу я буры
Цёмнае, сіберпай, страшнае ды злое.

Каб ад ветраў шумных ўкол зямля траслася,
Каб танула неба ў завірушных гулах,
Ад якіх маланка з громамі-б лілася
Да зямлі дрымотнай, да зямлі нячулай.

Не прашу спакою, не прашу забыцьця,—
Бо жыцьцё заўсёды ў цішы заміраe,—
А прашу я буры, бо ад буры жыцьце
З сілаю магутнай біцца пачынае.

Вількамір, 1911

## ДА НАДЗЕІ

Не пакінь ты, надзея, мяне,
На адну не пакінь ты хвіліну,
Дай глыбокаю вераю мне
У ўваскросшую верыць краіну.

Напаі маю душу вінам
Нястрыманай яскравай свабоды
І кажы мне галосна аб тым,
Што зазьяе яна й для народу,

Які сілай панурлівых днёў
З няпрыветнаю доляй зьвянчаны...
Пой-жа песьні, надзея, мне, пой,
Аб ўваскросшай краіне каханай!

Капыль, 1912

## БАЧЫЎ Я...

Я бачыў, як хмары на небе зьбіраліся,
Як з кожнай часінай яны пагушчаліся,
Цямлівасьцю сажы хутчэй фарбаваліся,
Й шпарка кудысьці плылі,
Сеючы цем па зямлі.

Бліскучае сонца пад імі закрылася,
Заслонаю, здэцца, вакол зачынілася
Усё, што хоць каліва сьветлым зарылася,
Стухла і зьнікла нашчэнт!
Жудасным быў той мамэнт!

Прагучае сэрца ў грудзёх патрывожаных
Як-бы скамянеўшы, або перамсжана
Замерлым маўчала, жудою абложана;
Думкі снавалі весь час—
Бачучы страшны абраз.

Усё, што ад сонца па шчэлях хавалася,
Уцехаю бурнай сьвятошняй вабралася
І раптам у купу адну пазьляталася
Сьвята сваё сьвяткаваць—
Зручны мамэнт карыстаць.

І толькі ўзьнялася гульня іх разьвівая,
Як раптам сапнула вятрыска бурлівае
Ї з неба пагнала ўсьцяж хмары цямлівыя
Дзесьці далёка, за бор—
Сонцу даючы прастор.

Ї сьледам за цем'ю хутчэй паказалася
Праменьне, што ў небе за хмарай хавалася,
Ї мігам з зямлёю халоднай зьвянчалася,—
Ў песьнях і неба, і дол
Рэзвым жыцьцём забурліла вакол.

А сэрца, спаткаўшыся з хуткаю зьменаю
Зьмярцьвеласьць сагнала пакутную, пленную,
Забілася радасьцю соладка-пеннаю,
Чуючы голасны воклічны: „Устань!
Ўсё, што жыве, аддаць сонцу вітань!"

Капыль, 1910

# НАПЯРЭДАДНІ

Стуліўся змрок ў глухіх куткох,
Зьнікае ночка-чараўніца;
Ў нябесных цёмных дыванох
Міргае зыркая Дзяньніца.

Замоўкла ўсё. Травы і дрэў
Ня хіліць к долу ўзьвеў вятрыска.
Чуцён вясёлых птушак сьпеў,
Чуцён іх воркат прагны, піскі.

Апойны пах плыве з далі
Лугоў адзетых руньню пышнай,
І дух свабоднае зямлі
Надзею ясную калыша.

Таемны гай гудзе, шуміць,
У неба сіняе глядзіцца,
І, здэцца, хоча гаманіць
З вясёлай рэзваю Дзяньніцай.

А з неба ўніз яе прамень
У зелень рутную спадае
І кажа ціханька: „Мне дзень
На зьмену сонца пасылае!“

Пецярбург, 1916

## КЛЯНІНКА

Бачыў я, як вецер ў полі павяваў,
Бачыў, як клянінку бедную хістаў:
З болю яе ралкі тонкія гулі
І хінулісь нізка да сырой зямлі.

А сіберны вецер з сілай набягаў,
Пекныя лісточкі з ралак атрахаў.
І, здавалась, раптам ён мацней шугне
Й бы нажом ля корня бедную сатне.

Ўміг, ў адну хвіліну ў маладым жыцьці
Перастане дрэўца рэзвае расьці...
Але моцы ветру стала не хапаць—
Ён ня мог клянінкі ўзьвеем даканаць.

Закіпеўшы помстай ветру насустрэч,
Лісьцем прашапцела сьмела яму рэч:
„Захацеў, сіберны, ты мяне скасіць—
Захацеў разрэзаць майго жыцьця ніць...

Не, ня дамся, вораг, сіле я тваёй—
Выйду з усёй моцай стрэціцца з табой—
І хоць тваіх зьвеяў мо' й не адапру—
Толькі і пакорнай сьмерцю не памру".

Пецярбург, 1914

## КАЛЫСНАЯ ПЕСЬНЯ

Сьпі, сыночак, ў калыбелі
Ў чыстай, мякенькай пасьцелі.
Я калыску пагайдаю,
Песьню-казку прасьпяваю,
Аб тваёй, сыночак, долі,
Калі выйдзеш ты у поле
Жыцьця труднага, цяжкога—
Калі станеш ты на ногі...
Сьпі спакойліва, сынок,
Прагуляўшы ўвесь дзянёк,
Бо падросшы—не пасьпіш...
Стане думка прад табою
Сетку віць з ліхіх клапотаў
І абмые твар твой потам...
Сьпі, сыночак, ў калыбелі,
Хай зьбірае сілу цела,
Хай душа гартуе волю
Йсьці настрэчу лепшай долі.
Ты дзіця краіны беднай,
Акаванай ў пояс медны
Гора, злыбеды, нядолі,
Мукаў сэрца—цела болі;
Ты дзіця яе народу,
Век цярпячага нягоду
Ў прыгнячэньні, пад'ярэмна,
Непавінна, задарэмна.

Ты радзіўся пад натугам
Сілы змучанай—за плугам,
За сярпом ды за касою.
Ты радзіўся пад пятою
Прыгнятаўшае нядолі—
Пад кустом, ці ў чыстым полі.
Будзь на варце, будзь гатовы
Скінуць гора тагоковы,
І шырокаю дарогай
Выйсьці людзям на падмогу
У барацьбе за шчасьце й славу
Ім належныя па праву.
У новым вашым пакаленьні
Прыдзе краю вызваленьне
Ды багацьце і Свабода
Для працоўнага народу.
Сьпі-ж, сыночак, з думкай гэтай,
Марай шчаснай разадзеты,
З верай яснай дачакацца
Пайсьці ў бойку і змагацца
За працоўных, іх краіну,
За іх шчасную судзьбіну.
Цябе будзе шанаваці,
Пакуль сталым станеш—маці;
Пашануе ды падбае,
Пакуль сілы на то мае,
Пакуль хопе ў яе могі
Ўстанавіць цябе на ногі.
Ўстанавіўшы-ж будзе ждаці
Бачыць ў збройнай слаўнай раці,
У гушчы ўстаўшага народу
Пры змаганьні за Свабоду.

Пецярбург, 1913

## ЗМАГАЙСЯ!

Мой браце, змагайся
З нядоляй, з бядою!
Ні крыўдзе ня дайся,
Ні суму ў настроі!
    Пакоры, цярпеньню
    Упарта спрачайся,
    Да волі імкненьнем
    Гары—разгарайся.
Адважна заўсюды
Наперад дарогай
Праз ямы, праз груды,
Вядзі з перамогай.
    Адкрытыя ўзрокі—
    У сьветлыя далі!
    Хай бляск іх далёка
    Разгойдае хвалі
Ваяцкай адвагі,
Сталёвага гарту!
Балючыя скаргі
Раздуй у пажар ты.
    Цярпеньня людзкога
    Ўскалышаш падпоры.
    Жыцьцё там—дзе змога.
    Дзе сьмерць—там пакора.

Пецярбург, 1913

## ПРОСЬБА

Не пакінь мяне, надзея,
Ў чорную часіну,
Што я ўгледзець 'шчэ сумею
Вольную краіну;
    Што ў народзе хопіць сілы,
    Хопіць цьвёрдай мочы,
    Пераджыць цішу магілы
    І цем дзікай ночы.
Згартаваны цяжкай доляй,
Мук ліхіх ды жалю,
Не загубіць вольнай волі
Ён тваіх скрыжаляў.

* * *

    Не растанься з душой, вера,
    Ў час, калі трывога
    Зьявішч чорных прэ няўмеру
    З краю дарагога.
Пад цалунам цяжкіх хмараў,
Зьвісшых над зямлёю,
Дай мне бачыць муляў чары
Сонца прад зарою.
    У прыгоне, у нязгодзе,
    Ў іх балючай ране,
    Малюй думкі аб свабодзе,
    Аб яе спатканьні.

* * *

Сьветласьць веры, руж надзеі,
Дзей жывых кароны—
З вамі шчыльна я злыганы
Ўчора і сягоньня!
    Разабеце-ж цем тумана
    І хай сонца зіхацее
    Па-над вамі нясьціханна
    Сьветласьцю чырвонай.

Пецярбург, 1915

## ДРУЖНА З АХВОТАЙ...

Дружна з ахвотай,
Гэй, за работу,
Брацьця, скарэй!

З песьняю зычнай
Ў працы прывычнай
Будзе спарней.

Гора з нядоляй
Ня знойдуць патолі
Болей сродзь нас;

Весела й хутка,
Мінута ў мінутку
Сойдзе нам час.

Ў стуку і груку
Забудзем мы муку
Працы сваёй.

Шчыра і сьмела
Гайда да дзела
Цеснай сям'ёй.

Там, дзе цярпеньне
Родзіць імкненьне—
Стане расьці

Семя жывое
Шчасьця людзкога
Ў нашым жыцьці.

Дружна з ахвотай
Гэй, да работы,
Брацьця, скарэй!

Праца рупная
Хай прывітае
Нас ўсіх хутчэй...

Вількамір, 1912

# ПЕСЬНІ ЗМАГАНЬНЯ

## СВАБОДА

Я убачыў яе аддалёк,
Сярод ночы цямлівай, глухой,
Што ўбірала яе ў цёмны змрок
І пяяла літаньні над ёй.

Я убачыў яе і ўзгарэў, як агонь,
Як усходняга сонца лучы,
Ды хутчэй паляцеў наўздагон,
Наўздагон да яе, крычучы:

„Не ўцякай-жа, багіня красы,
Зыркі водбліск празрыстага дню,
Дай напіцца твае мне расы,
Дай часьціну твайго мне агню.

Я сасмагшую душу расой
Волядаўчаю ўсю акраплю,
А агонь гэты дзіўны я твой
Ў сэрцы юным сваім запалю,

І, як волю адчуўшы той зьвер,
Ў бойку з крыўдай людзкой палячу,
Хоць, да праўды шукаючы дзьвер,
Я за гэта жыцьцём заплачу".

І наўкола ад крыку майго
Раздавалася рэха, як гром;
Я-ж да месца ў далёку таго,
Дзе стаяла яна, бег бягом;

Але ночы хаўтурная цьма
Шчыльна-шчыльна павісла над ёй,
Так што ў змроку пасмугла яна
Перад смагай гарачай маёй.

І, як быццам, далася на крок
Далей-далей, назад ад мяне,
Ды ізноў заблішчэла здалёк,
Разгарэўшыся ў зыркім агне.

Я-ж ня стаў, не стаміўся патом,
Маладую ўсю сілу сабраў
І з гарачым душэўным агнём
Да яе набліжацца пачаў.

І ў нутру маім вырас намер
Усё жыцьцё ад яе не адстаць,
І стаў вокліч ка мне далятаць,
Які зваў і казаў: „Толькі вер,

Не глядзі, што наўкола цябе
Непрабачная ночка стаіць;
Біся з цемрай, і ў той барацьбе
Ты патрапіш мяне улавіць“.

Што далей—мой увераней крок,
Што далей—яна бліжай ка мне,
І мой цьвёрды ваяцкі зарок
Хутка-хутка яе нажане.

Пецярбург, 1914

## ЙДЗІ ДАРОГАЮ ЗАРОСШАЙ...

Йдзі дарогаю заросшай
Дзікім чэмерам-травой.
Йдзі няўтомна ды нязможна
З непаніклай галавой.
Няхай груды ды завівы
Не палохаюць цябе;
Хай ружовыя пазывы
Не тануць ў цяжкой журбе.
Над табою зданьне сьмерці—
Дух згубіцельны пяе—
Кожнай хвіляй мерыць ўперці
Ў змрок нябытнасьці свае.
Хай да сэрца йдуць сумленьні,
Сполах крадзецца к табе,
Загартуй сваё цярпеньне
І будзь цьвёрдым ў барацьбе.
Тады цьвёрдасьцю адзеты
Гарда сьцяг свой данясеш
К таму месцу, да той мэты
Да каторай ты ідзеш.

Пецярбург, 1914

## НЯ СУМІ, БРАТ!

Ня нудзі, брат, суніміся,
Пад нядоляй ня хіліся,
Ня спускай к зямлі вачэй,
Думак рэзвых не даві;

Што як будзе—ня пытайся,
Ўздумных страхаў не лякайся
І падмогі не заві—
Не глядзі на змрок начэй.

Цьвёрды крокам—ўперад мкніся,
Палкай верай маладзіся,
Ўзрок угору падні́мі,
Дыхай поўнымі грудзьмі.

Тады ўбачыш прад сабою,
Як жыцьцё кіпіць ракою,
Б'юцца хвалі ў берагі.

Як аджыўшае ўмірае—
Сіле новай шлях ўступае
І заве у сьвет другі

Тых, хто прагаю багаты,
Хто няволі разьбіў краты
І змрок ночы разагнаў.
Хто заўчасьне, ў пору ўстаў...

Стань-жа ў рад, нага з нагою,
І няхілкаю ступою
  Рухай сьмела ўдаль,

Даўшы вокал кліч магутны,
Ясназоркі і ўсячутны,
  Згартаваны ў сталь...

Петраград, 1/VIII 1914

## ЗВОН

З гары высокае званіцы
Званы прызыўна загулі;
І гуд грамовы іх імчыцца
Абшарам соннае зямлі.
Дрыжыць вакол ціша глухая,
Трасе паветра медны гуд
І ўсё, што сьпіць, ён паднімае
Вакол сябе, і там, і тут.
„Ўставай, хто сьпіць!“ у звоне чутна
Размова гучных вагкіх слоў...
„Скідай свой сон, ліхі, атрутны,
Цягучы сон даўгіх вякоў!“
І ўдыр за ўдырам шле званіца,
Спушчае ўніз з сваіх прытул
Шарэнгам роўным, стройнай зьвіцай,
Ўсё болей гучны звонны гул.
І рэжа ён пласты паветра,
Качае хвалямі бары,
З зямлі нясецца ўзьвеем ветру
Да стромы цёмнае гары.
Яшчэ мамэнт і гудам звону,
Здаецца, неба страсяне
Ды зоў разгорне свой чырвоны
Па ўсёй зямлі і ў вышыне.

Вількамір, 1913

## БУНТ

Люб мне ветра гул шалёны,
Калі хіліцца дадолу
Пад ім дубава карона,
І дрыжыць зямля вакола;
    Раскалыханаю мкнецца
    Слупам пыльным завіруха
    І ўсё нішчыцца ды б'ецца,
    Стогне, вые ў дзікім руху.
Ні пранікоды, ні прыпоны
Не пад сілу з ёй змагацца,
Спыніць ветру перагоны
Руйнаваньню не паддацца.
    Люб мне ветру посьпеў люты—
    Яго песьня вызваленьня,
    Калі цішы мёртвай путы
    Усё губляе з аблягчэньнем;
Ў дзікіх тонах яго зовы,
Сіла вечна маладая.
Рэчам мяртвым—рух жыцьцёвы
Ветраў повей надарае.

Магілеў н/Д. 1910

## Я ХАЦЕЎ-БЫ...

Я хацеў-бы, здэцца,
Ў нясьціханай спрэчцы
Неразрыўна зьліцца
З тымі, хто век біцца
Маюць за свабоду
Беднага народу,
За зямлю, за волю,
За шчасную долю...

Я-б хацеў бяз змогі
Йсьці да перамогі
У вагні паўстаньня
Проціў панаваньня
На зямлі закону
Гвалтаў ды прыгону
Над працоўным людам
Вокала і ўсюды.

Я хацеў-бы гартам
Ў байцы тэй упартай
Ў камень змацавацца,
Каб не зруйнавацца,
Ў змозе нясьціханай
З варожным мне станам,
Што ў ахове ўласьці
Свае, ён ня здасца
Доўгімі часамі...

Й будзе адбівацца
Куляй ды зубамі
Да астатняй хвілі,
Да апошніх сілаў.

Я хацёў-бы бачыць,
Як агонь адзначыць
Промінам чырвоным
Час вялікі скону
Гвалтаў і прыгону
У жыцьці чалавечым...

Я-б хацеў дажыці,
Каб гардліва выйсьці
Волі насустрэчу
Перад яе ўходам,
Жыць вавек з народам
У сьвяжыстай руні
Вечнае Комуні!..

Менск, 1920

* * *

Над шумным палацам, над курнаю хатай,
Над вуліцай цеснай, над полем прасторным
Вяшчун праляцеў,—агнязыркі, крылаты,
Здарэньняў вялікіх нязьменны дазорны.

Бурлівага лёту сьляды незьмярымы,
Бязмоцным жыцьцё супыніць завіруху!
Палае агнямі абшар прад вачыма,
Калоцяцца палі ад бурнага руху.

Угору высока, да фарбаў блакіту
Нямоўчнага рэха шыбаюць прыбоі,
Адвечная мука няволі—разьбіта,
Паломаны веры заўзентай устоі.

Ракетаю зыркай бліснулі імкненьні,
З сярпом скрыжаваўся гартованы молат,
Вялікасьць сусьвету ў косьмічным спляценьні
Спусьціў да зямлі разьняволены волат.

Мільён у адным і адзін у мільёне
Закрэплены гартам завабнае мэты.
З грашыма багач, валадар у кароне,—
Ўрачыстыя песьні для вас перапеты!

Глыбока зіяе бяздоньне правалу,
Апушчаны нізка пад сонцам завесы,
Дымучай слатою вам выглядзяць галы,
Над днямі былога лёс хмары павесіў.

У вулках мястовых, над вёскай прасторнай
Лунае нязьменна ў мірганьні бліскучым
Вяшчун агнязыркі—свабоды дазорны,—
Працоўных людзей да Комуны завучы.

Менск 7/IX 1924

## СЬЦЕШСЯ!

Ня журбуйся, эх, матуля,
Праз дзянькі і ночкі,
Што загінулі ад куляў
Тры твае сыночкі.

Праўда, знана, што ня ў меру,
Томіць цябе змора,
Але, родная, паверуй
Ї пазбудзься гора.

Загубілі тваю тройцу
Ў дні ліхой нязгоды,
Ў сьмяротнай цяжкай бойцы
За дабро й свабоду.

Як нацягваў вецер хмары
На прамень бліскучы—
У нутры іх буйным жарам
Ўзьняўся пэнт магучы.

Ї адвагай маладою
Абуялі сэрцы—
Пайсьці з ворагам да бою
Ї ў тым бою ўмерці.

Сьцешся, родная, згадзіся,
Пад цяжкім усьціскам
Й над магілкай іх схініся,
Быццам над калыскай.

Няхай будзе ў час нязгоды
Табе ўцехай тое,
Што памёрлі за свабоду
Твае сынкі трое.

І што доўга будуць людзі
Помніць твае дзеці,
А іх імя вечна будзе
Зьяць у дзіўным сьвеце!

Менск, 1920

## МАЁЙ ПЕСЬНІ ДАЛІ ТОНЫ...

Маёй песьні далі тоны
    Мукаў стоны,
Што заўсёды пры рабоце
У смуродзе дзы ў духоце
Вылівала маё сэрца.

Маёй веры дало сілы,
    Што давіла
Маю душу бясьсьціханьня—
Бесканечнае змаганьне
Барацьба за шчасьце й долю.

Далі гарт маёй надзеі
    Злыя дзеі,
Што гадамі прада мною
Бесканечнай чарадою
Разьбіваліся у шчэпы
Аб спрачаньня майго скрэпы.

    Мая песьня, мая вера
І мая надзея,—
З вамі йду я поўным ходам
Ў тыя дзьверы,
Дзе ліхтарня міргацее
    Прад свабодай.

Харкаў, 1919

## Я ХАЦЕЎ-БЫ ПЯЯЦЬ...

Я хацеў-бы пяяць,
Як пяе
Цёмны бор непагодаю,
Каб вакол абуджаць
Зыкам песьні свае,
Хто ня кінуў 'шчэ спаць
Пад нядоляй-нягодаю.
Я хацеў-бы палаць,
Як палае
Бліскав'ца між хмарамі,
Каб агні запаляць,
Дзе 'шчэ цемра вітае
Над зямлёй, над абшарамі.
Я хацеў-бы гусьці,
Як гудзе
Вецер буры-навалы узьнятае.
Каб нашчэнт разьнясьці
Па лясох, па вадзе
Панства долі-нядолі заклятае.
Я хацеў-бы ўладаць
Хоць-бы мігам адным
Непакорнай, магутнаю сілаю,
Каб змагчы, зруйнаваць
Ўсё ліхое вакол
І ўжыць шчасьце над гэтай магілаю.

Харкаў, 1919

## БУДЗЬ ПЯРЭДНІМ

Непадатны,
Поўны гарту
Ў жыцьці з роду,
За свабоду
Ў бой упарты,
Ў бой астатні,
Незьвярэдна
Йдзі пярэднім.

Днёў шчасьлівых—
Выгляд з далі,
Ў палахлівых
Запускае
Сум нявер'я
Й вотруч жалю...

Шырэй дзьверы
Адчыні ім!
Хай міргае
Сьветлам дзіўным
Ўзрок свабоды
Прад вачыма
Змардаваных
Завірухай,
Слабых духам,
Цяжкіх рухам...

Покуль жданай
Долі шчаснай,
Зорка ясна
Ўкол зазьяе...
Неўгамонны,
Непакорны
Ў жыцьці з роду,
Перад сконам
Ночы цёмнай
Непагоднай—
Цьвёрда, ўпарта
Стань пярэднім
І ўлій гарту,
Дай надзею
Тым, хто стомлен
Ды хварэе
Ад зьнямогі
Сродзь дарогі...

Менск, 2/XII 1920

## НА ВАРЦЕ

Грамадай дзікаю, зьвярмі,
Крывёй працоўнікаў апіты,
Стаялі ў зброі пад дзьвярмі
Тры годы белыя бандыты.

Чырвоны сьцяг дражніў іх зірк,
Краіна-ж воляю адзета,
Цуралась болей бачыць іх,
Прагучы вольным стацца сьветам.

І сталь блішчастая штыхоў
Ў руках мазолістых натужна
Адвагай храбрай ваякоў
Зламала шайкі катаў дружна.

На збройным полі сьціхла сеч,
Замоўклі грукаты гарматаў,
І ў ножнах жджэ наточны меч
На край нападаў новых катаў.

Падымуць мо' разьбіты стан,
Мо' склічуць новыя грамады—
Няхай-жа ведае тыран—
Ня быць яму і дальш пашчады.

Ў сэрцох працоўных не патух
Агонь кіпучага паўстаньня;

Ў рабочых гушчах пыша дух
Ўсягды магутнага змаганьня.

І толькі пойдзе новы зоў,
Трывогу ўчуе Рэволюц'я—
Як соткі тысяч ваякоў
Ад працы к зброі сабяруцца,

Менск, 6/І 1921

## АД САХІ, АД СТАНКОЎ

Ад сахі, ад станкоў,
Ад вытворчае працы ў заводзе
  І ў полі
Адарвала нас доля
І ваякамі ў зводзе
Чырвоных палкоў
Абаронай свабоды зьяднала.
  І рука
  Бедака,
Што вякі на паноў працавала,
Дакранулася сьмела ствалоў
Смерць нясучых гармат і мячоў.
У грудзях заігралі
Адвагі іскрыстай праменьні,
Бадзёрасьць, натхненьне
Радзілі змаганьне
За волю, за долю,
За іх панаваньне.
Крывавае збройнае поле
Зьмяніла сабою
Ўсе нашы клапоты й раздумы.
  Бяз суму
  Да бою
Пашлі мы упартай ступою
  Свабоду людзкую
Ад кроўных яе варагоў
  Бараніць...

Ад сахі, ад станкоў,
Дзе удар малатоў
Загібаў непакорную сталь
Дзеля крат й ланцугоў—
Мы пашлі ваяваць,
Каб сваёй барацьбой
Ланцугі раскаваць;
Каб нядолю і жаль
Зруйнаваць,
І за гэтым,—
Каб з аружжам ў руках
Ўстанавіць вольны сьцяг
Па-над ўсім аслабоненым сьветам.

Харкаў, 1919

## ЗАМАЦУЙМА!

*На трэцюю гадавіну Акцябрскай рэволюцыі*

Тры гады мы ліхіх варагоў
На крывавых франтох адбівалі;
Тры гады мы трымалі ахоў
Тых краёў, якім волю дасталі.
  Ў нашых грудзях паўстаньня агонь
  Ня стухаў ў гэты час й на хвіліну:
  Зваў пабарнага сьцягу чырвонь
  Класьці жыцьце за волі айчыну.
І цаною вялікіх ахвяр
Варагоў мы змаглі, зваявалі,
Рэволюц'і Акцябарскай дар
Для працоўных людзей захавалі...
  Вось цяпер, калі вораг разьбіт —
  Не спачынку чакаць мы павінны:
  Кожны мусіцьме гартам быць зьліт
  Дзеля працы руплівай, няўпыннай.
Каб ў руках нашых молат і плуг
З тым-жа посьпехам ўсе закрапілі,
Што з мячом ваяўнічы наш дух
На крывавых франтох збаранілі!

Менск, 1920

## БУДАЎНІКІ

На зьмену зрадным баўтунам,
На зьмену царственным тыранам,
Будову жыцьця доля нам
Вялела ўзяць. І мы паўстаньнем,
    Уздымнай хваляю прайшлі,
    Нясучы сьвята аднаўленьне
    Па вызваляемай зямлі.
І там, дзе скрозь насіўся цень,
Дзе рабства вокал панавала,
Праменьнем сонца азіяла,
Пад гучны сьпеў Інтэрнацыянала,
Комуны сьветлай вечны дзень.

Менск, 1921

## ДАЛАКОПАМ РЭВОЛЮЦЫІ

Далакопы, не сьпяшайце,
Зрана ямы не капайце,
Рэволюц'і не хавайце,
Не надзейцеся пакуль,
Што падзе яна ў зьнямозе
На няпройдзенай дарозе
Пад дажджом варожых куль!
Пачакайце—не сьпяшэце,
Кірак востра не тачэце
З сэрцам радасным, што ў дзьвер
Падаў стук вяковы вораг,
Што ў паветры трутны порах
Запаліў драпежны зьвер.
Знайце тое, што свабоды
Ад працоўнага народу
Ня удасца адабраць!
Бо, здабыўшы барацьбою,
Не растанецца ён з ёю,
Зможа ў бойцы адстаяць...
Ах, ня можаце спыніцца,
Звыкл ўжо к зямлі хіліцца,
Штосьць бадзёрыць ў гэты час...
Ну, капайце-ж глыбей, шырай,—
Гэта будзе цёплы вырай,
Далакопы, ўжо для вас!

Пецярбург, 1918

## ПРАЦА

На стромы цьвёрдыя спадае
Цяжарны молатаў удыр
Ї вокал сьцішу разьбівае,
Трывогу сее ўдоўж і ўшыр.
Ад ўдыраў іскры чарадою
Дажджлівы кідаюць рассып,
Ї коўдрай вокал агнявою
Абшар разбуджаны абліт.
Кіпіць, бушуе і трапеча
Паўстаньня буйнага уздым,
Ў глыбокім моры чалавечым
Ён прагу палкую ўзбудзіў.
Ў трывозе гэтай нястрыманай,
Ў агні, у ўдырах малатоў,
К людзям прыходзіць панаваньне
Свабоды жданай ад вякоў.

Харкаў, 1919

## ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

### I

Чырвоны Сьцяг гарыць агнём,
Яго абвеяў дымам порах,
Яго мы ў землю там ваткнём,
Дзе быў твой стан, паганы вораг.
    Яго ваткнём пад гул гармат,
    Пад гукі песьні баявое,
    Дзе працу сваю ладзіў кат,
    Дзе землю мыў крывёй людзкою.
Чырвоны сьцяг ў агні, ў дыму
Нясе з сабой канец прыгону
І кару сьмерцяю таму,
Хто ўзьвёў яго на чын закону;
    На тых, што меч падняў на блік
    Свабоды яркай, сьветлай волі,
    Вядзе ён ў бой ваяцкі штык
    Ў руцэ спрацованай, ў мазолях.
Паборы знак—Чырвоны Сьцяг,
Ён рэе там, дзе дымны порах,
Яго трымацьмем мы ў руках,
Пакуль ня згіне скрозь наш вораг.

Менск, 1921

## II

Ў руках мазолістых сваіх
Трымай мацней Чырвоны Сьцяг!
Няхай ня томіць баявых
Ваяцкіх сэрцаў цёмны страх.
Пад шатай сьцяжных палацён
Няхай растуць рады палкоў
Ваяк, што йдуць на абарон
Краіны вольнай ад ўрагоў.
Няхай дае іх напіс кліч:
„Ўставай, хто ‘шчэ нядбайна сьпіць!
Адвечны вораг рабства біч
Ў руках прыгоньніцкіх дзяржыць.
За волю, землю, за спакой
Ў працоўнай вольнай старане—
У сьмертны бой, ў астатні бой,
Няхай адвага ўстаўшых пхне!“
Уперад, гэй! Упарцей шаг!
Пад гукі песьняў баявых!
Трымай мацней Чырвоны Сьцяг
Ў руках мазолістых сваіх!

Менск, 1921

## НАПЕРАД, ГЭЙ!

Перад намі гараць
Залатыя агні
Жыцьця вольнага й долі яскравай,
А за намі ляжаць
Перажытыя дні
Ліхалецьця прыгону й нядолі крывавай.
Гэй, сумленьне—ад нас адыдзі,
Прага волі—нас ўперад вядзі!
Мы паўсталі на бой
За жыцьцё, за правы,
Мы паўсталі да творчае працы;
І пашлі грамадой,
Як пярун грамавы,
Нішчыць троны цароў, іх палацы.
Разьвівайся наш сьцяг, чырваней,
І пуглівасьць сумненных расьсей!
Злосны вораг наўкруг
Стварыў гібель прашкод—
Захаваць стары сьвет хоча далей,
Але рабства ланцуг
Ня ўстрымае наш ход
Да свабоды—разгойданай хваляй.
Ў нашых сэрцах адвага гарыць—
І нікому яе не згасіць.
Наш канчаецца шлях
Там, дзе нішчыцца сьлед

Векавога прымусу й стагнаньня.
Мы чырвоны свой сьцяг
Распрастром на ўвесь сьвет
І Комуны ўвядзем панаваньне.
Мы ваякі за волю людзей.
Хто к волі мкнецца—хай з намі ідзе.

Менск, 1921

## ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ

Ціха рэе —
Палымнее
Сьцяг чырвоны.
Пад ім роем
Чынным строем
Рэюць тоны
Песьняў волі...
Роўным полем
Грамадою
Йдзе паходам
Звод за зводам
З прагай к бою
Полк чырвоных.
Шчэць стальная
Адбівае
У блісках цёмных
Промень сонца.
Жар бясконца!
Стома давіць!
Усё-ж ня ўбавіць
Моцнай прагі
І адвагі,
Што ў іх сэрцах.
Ступ за ступам
Ідуць купай
У бой да сьмерці

За свабоду
Ля народу
Легчы з славай.
Ці-ж утратна?
Дружна, здатна,
Вялічава,
Гук нясецца!
Прамя-ж льецца
Пазалотай
З небнай высі.
Й песень тоны,
Й сьцяг чырвоны
Ў ім зьліліся!

Харкаў, 1919

## ДАР

Ī ноч і дзень, і днём і ноччу
Сядзіць яна і пільна тчэ,
Хоць сон гняце яе ня ўмочу
Ī сьлепат рэе ля вачэй;

Хоць рэжа больлю вострай сьпіну
Ī тою больлю коле ў бок
Й ня раз губляецца дзяўчынін
Вяртлявы з цэўкаю чаўнок;

Яна астатнія патугі
Сілком зьбірае і з рукі
З навою гоніць круг за кругам,
Шпіляе шчыльныя радкі.

Мінае час і чырвань нітак
Выходзіць ў гладкім дывану...
Каму-ж старэнна на прыбытак
Дзяўчына тчэ, і што? Каму?

А тчэ яна ўжо тыдзень трэці
З чырвоні зрэбнае штандар,
Братом аддаць чырвонармейцам
За іх пабору слаўны дар;

Аддаць за тое, што з напасьці
Яны пазбавілі народ,
Што ў бойцы цяжкай—панскай ўласьці
Спынілі новы узварот,

І край свабодным захавалі
І людзям волю зьбераглі,
Хоць многіх мёртвымі схавалі
Ў глыбі халоднае зямлі...

Падзякі поўная, дзяўчына—
Сама ткачыха й стала ткаць
Штандар чырвоны ад краіны
Ваякам слаўным дараваць.

І трэці тыдзень зраньня к ночы
За пільнай працаю ідзе...
Хутчэй, сястрыца! Прагнуць вочы
Твой дар ваякам паглядзець!

Менск, 1920

## ПЕРШАЕ МАЯ

Першае Мая—то дзень вызваленьня!
Слаўны ваяка прад бойкай гарачай
Сілам падцятым, ждучы аднауленьня,
Цяжкім змаганьнем яго абазначыў.

У цемні няволі, у муках балючых
Сьветлаю плямаю ён выдаваўся,
Прагнучым волі, да волі ідучым
Воклічам гулкім здалёк адгукаўся.

Бойка ішла, адмяраліся ўступы
Маем чырвоным ад году да году;
Гушчы працоўных, ваяцкія купы
Мералі крокі да сьветлай свабоды.

Бліжэй ды бліжэй—здалёк маякамі
Звалі пярэднія задніх на сьвята,
Сьцягам чырвоным, як птушка крыламі
Май трапятаўся над беднаю хатай.

Выдмы глубокія вечных устояў
Вокал глядзелі нязрушнасьцю чыннай
Ў хвілі, калі расьцілалі сувоі
Рдзістых палоцен ваякаў дружыны.

Буйнаю рагаю, порсткім струменем
Выліўся імпат натхненны ў паўстаньне;

Май урачыстым пранёсься праменьнем—
Шлях да Комуны з-пад цьмы растуманіў.

Гордымі крокамі, вернай ступою,
Летась, сягоньня і ў часах прыдучых
Першае Мая—працоўных сабою
Будзе бадзёрыць, ўсё ўперад вядучы.

Менск, 1923

## ПЕСЬНЯРУ

Пясьняр-званар, чаму заціх
Тvае душы салодкі сьпеў?
Дзе кліч ты свой завучы дзеў
Ў вялікі час, ў адказны міг?
    Цябе спужаў грымотны стук—
    Крываві вобліск барацьбы,
    Якую ўстаўшыя рабы
    Ўзялі ў абоймы сваіх рук?
І бурным віхрам пранясьлі
Над трупмі катаў крывапіўц,
Адкрыўшы помсты дно крыніц
Супроць прыгону на зямлі?
    Ці бурны, швыдкі, як віхор,
    І моцны, зычны, нібы гром,
    Жыцьця старога скрутны злом
    Ідзе табе наперакор?
Ад ўздрыгу, пэўна, думак зьніз,
Душы абуранай настрой,
Дасталі цяжкі перабой,
Які балючым ўціскам зьвіс.
    Ці ты зусім не падглядзеў
    Красы у тым, што гэты час
    Вялікіх дзей, адказных дзён
    Жыцьцё кіпучае нясе?
    Ці нет натхненьня ў тэй красе,
    Што родзіць працы стан, закон?

Ці творчай чыннасьці праддзень
У тваю істоту не ўраніў
Зьдзяйсьненьня мар, зьдзяйсьненьня дзіў
Натхняўшых многа пакалень?
  Пясьняр-званар, здымі з сябе
  Часовай мяртвасьці натхлань
  І песьняй радаснай літань
  Пашлі працоўных барацьбе.
Сустрэнь ты гімнам бляск зары
У змаганьні ўстаўшых новых днёў,
Прыход Комуне спрарачы...
Або ў бяспогадзі памры,
Няймючы песьням новых слоў...
Ну, толькі далей не маўчы.

Менск, 29/I 1921

## ІДУЦЬ ГАДЫ

*К 50-годзьдзю Парыскае Комуны*

Ідуць гады, мінае час,
Жыцьця былога рвуцца струны,—
Усё дальш і дальш стаіць ад нас
Здарэнь Парыскае Комуны.

Мінае час—аднак завет
Яе вялікіх дасягненьняў
Прынесіць нам з далёку лет
Імпэт ваяцкага натхненьня.

Вялікі ўздым—пазыў ваяк,
Змаганьне слаўных комунараў,
К свабодзе вечнай даюць знак,
Што нам гарыць з-за цемні хмараў.

У цяжкой вайне за сьветлы час,
За волю, ў сьвеце панаваньне,
Справодзіць нас, скрапляе нас
Успамін вялікага паўстаньня.

Сям'я адважных ваякоў,
Герояў ўвенчанай свабоды,
Сягнуўшых ўзяць ад палачоў
Іх уласьць, каб даць яе народу.

І сем дзесяткаў бурных дзён
Упартай, пільнай іх будовы
Пад націск варажных колён
На горад, ўстаўшы к долі новай;

І дальш іх сьмерць ў абойме мук,
Адвагай дзіўнаю ўвабрана,
Крывёй іх змыты вуліц брук
І зьдзек над мёртвымі цяламі,—
То ўсё страніцы змогі той,
Якую мы вядзем няўпынна
Пры днёх Парыскіх успаміне
За панства волі над зямлёй...
Ідуць гады, мінае час,
Жыцьця старога рвуцца струны,—
Няхай для бітваў крэпіць нас
Ўспамін Парыскае Комуны.

Менск, 11/III 1921

## СЬЦЯНА ФЭДЭРАЛІСТЫХ *)

Крывавы чэрвень памятнага году
Хаваў пакутную свабоду
Рукамі Т'ера, дзікага тырана,
Крывёй заліўшага паўстаньне.
Апіўшысь ўцехай перамогі
Над храбрых жменяй комунараў,
Сюды вялі парыскія дарогі
Ваяк захопленых на кары.
Дзесяткі, соткі зможаных на полі
Бойкі доўгае і ўпартае за волю
Варужжам гналіся к сьцяне
Знайсьці спачынак ў вечным сьне.
дні, і ночы доўга не змаўкалі
Крывавых катаў стрэлы над сьцяною—
Сыноў Комуны грамадою
Няўсьціхна кулі там нізалі.
Лілася кроў. Адвагай цьвёрдай згартаваны
Адважна лёс страчалі вэтэраны
Няўсьпеўшай расьцьвісьці Вялікае Комуны,
Раджонай ў буры, ў бліскаўках ў пяруну...
Прайшлі гады, і кроў пралітая ваяк

---

*) Сьцяна фэдэралістых—гэта мур на могілках Пэр-Ляшэз на ўскраіне Парыжу, дзе расстрэльвалі французскія белагвардзейцы парыскіх комунараў. Комунары зваліся яшчэ фэдэралістымі—ад слова „фэдэрацыя“ (акруга). Ад гэтага і сьцяну празвалі „Сьцяной фэдэралістых“.

Вяком пакінула на памкі знак
Ў крыві запёклай на жалезе
Й каменях цьвёрдых Пэр-Ляшэза.
Вось кожны год у сьвята Гадавін
К сьцяне той йдуць рабочыя Парыжу
Аддаць Комуне свой ўспамін,
Пабыць ўспамінамі з ёй бліжай,
Пры ўзгорках ўзрошчаных магілаў
Ваяк ў іх сьпячых—комунараў,
Набрацца к бойкам дальшым сілаў,
Падаць адвазе слабых жару.

Менск, 13/III 1921

# НАСТРОЇ

## ПАЗЫЎ

Я хацеў-бы непакорным
Ветрам вольным ў полі стаці,
Каб па галы па пpасторным
Бязупынна дзьмуць-лятаці.
З верху к долу, з краю к краю
Мерыць шыры хуткім лётам;
Ня спыняцца перад плотам,
Не зварочваць перад гаем.
Ад зямлі да сіней высі
З гудам зычным паднімацца—
Дзе прашкоды асталіся—
Ўшчэнт ламаць і далей мчацца.
Я хацеў-бы ветрам быці,
Каб з няволяю расстацца,
Каб ў свабодным шчасным жыцьці
Незалежнасьцю ўпівацца.

Вількамір, 1913

## МОЙ ВЕРШ

Мой верш—мая душа
І думка шчырая мая!
У кожным слове маё я.
Мой верш—мая душа.
Яго пяю ўсягды,
Бы толькі з жальбай расстаюсь,
Ці зноў калі да ёй вярнусь
Свой верш пяю тады.
Крышталь сьлязы у ём—
Гармонны рытм красы,
Спакою мне дае часы
Адблеск красы у ём.
У верш ўкладаю я
Істоты палкае быцьцё,
Душы хваленьне, ўсё жыцьцё
У верш ўкладаю я.
Таемны выгляд слоў
Хавае шмат падчас
Цярпеньняў цяжкіх бяз прыкрас,
Ў якіх і боль, і кроў.
А ўсё-ж патрэбен ён,
Адбітак бурнае душы,
Што пэнт даволі узрушыў
А ўсё-ж патрэбен ён!

Вількамір, 1913

## У ДАРОЗЕ

Ў небе зоры міргаюць, гараць
Ды зіяе яскравага месяца круг,
Дзе-ні-дзе кучкі хмарак вісяць
То сабраўшыся ў колка, то зьвіўшысь ў ланцуг.

Паміж лесу расьцёгся туман,
Нібы спушчаны з неба дыван.

Між шырокіх зялёных палёў
Ў'еццa вёрткая вузкая сьцежачка-пуць,
Праз лясы каля гор ды равоў
Коні зважна па ёй дробнай рысьсю бягуць.

І ў спакойным прасторы кругом
Чуцен водгалас рэзьвенькіх бом.

У баку дзесь траскоча дзяргач,
Ды цвыркунчыка рэзкая рэч трапаціць...
„Но, малыя! старайцеся ўскач!“
Паганяючы коні, рамізьнік крычыць.

„Пасьпяшайце старэнна, гэй, гэй,
Каб да месца даехаць хутчэй!“

І ахвотныя коні сьпяшаць,
Чым хутчэй ды праворней ляцець ды ляцець...
І ўваччу маім нівы мігцяць,
Ды вятрыска супроцьны паціхеньку дзьмець!

„Гэй, запой што, фурман, для мяне,
Каб ды спаць не хацелася мне!“

Фурману я паціхай шапчу
І чакаю сьпяваньня на гэта ў адказ,
Прытаіўшыся чутка маўчу,
І вось чую, пяе: „Не апошні я раз
Цябе бачыў, радзімая, там!..“
Яму-ж рэха ўтуруе: га-ам!

І так лёгка на возе сядзець
Пад вясёлыя песьні рамізьніка й бом,
Ды удаль за дарожкай глядзець
Пад чароўным нябесным ў вагнёх дыванам,
Паглядаці, як коні бягуць
У сівую туманную пуць!..

Магілеў н/Д, 1910

## ХМУРЫНКА

Вецер хмурынку па небе жане
Ў ціхую даль ды гавора:
„Плавай, галубка, па моры—
Ў чыстай, свабоднай яго вышыне,
    Покуль пацiхай я пробую дзьмуць,
    Буры ня чуючы дзікай,—
    Будзь ты шчасьлівай вялікай,
    Рэзвай, вясёлай і вольнаю будзь.
Цешся хвілінаю стрэчнай аднэй,
Покуль яшчэ над зямлёю:
Скора спадзеш ты вадою,
І капля за капляй пап'ешся зямлёй".

Капыль, 1909

## ЗАГУДЗІ ТЫ, ВЕЦЕР

Загудзі ты, вецер,
Скалыхні вярбіну;
Засьпявай ты песьню,
Мілая дзяўчына!
        Засьпявай як птушка
        Летняю парою,
        Каб было мне шчасна
        Пасядзець з табою;
Каб сагнала песьня
Ўсю нуду ліхую
І ўвабрала душу
Ў вопратку другую:
        Радасьці, вясельля,
        Шчасьця і любові...
        Каб нуды сарвала
        Моцныя аковы...
Засьпявай, галубка,
Засьпявай, дзяўчына!
Скалыхні ты, вецер,
Скалыхні вярбіну.

Капыль, 1909

## ДЗЯЎЧЫНЕ

Міла ты мне, міла пекнатою дзіўнай,
Голасам пявучым ў песьні пераліўнай,
Міла ты мне міла.

Блізка ты мне, блізка шчыраю душою,
Прагнымі хаценьмі, сілай маладою,
Блізка ты мне, блізка.

Родна ты мне сэрцам, да жыцьця завучым,
Смагай ласкі ўбраным, горда, сьмела б'ючым,
Родна ты мне, родна.

Шчыры ты таварыш і па горкай долі,
Ў барацьбе вялікай за жыцьцё і волю,
Шчыры ты таварыш.

Дык ня дай мне ў болі па табе таміцца,
Не даводзь да жалю, каб сьлязой абліцца
Па табе, галубка.

А прыходзь на зоў мой, на душэўна-гучны,
І куды захочаш—пойдзем неразлучна
Гордаю ступою.

Нам дваім усюды, нам дваім з табою
Будзе лягчэй біцца з доляю ліхою,
З цяжкаю пакорай.

Дык уймі ты слову-крыку ўсей істоты,
Выкажы чуцьцё ты, выкажы ахвоту
Стаць навекі другам!

Пецярбург, 4/X 1914

## НЕ СЬПЯВАЙ

Не сьпявай у садзе, салавей залётны,
Ня трывож ты песьняй ціхага спачынку,
Ўчора ты і сёньня—роўна бесклапотны,
А ва мне ўскрашаеш нудныя ўспамінкі.
Твае песьні ў душу рвуцца няупынна
І катуюць сэрца мукамі бяз меры:
Я перажываю сёньня гадавіну—
Ўтратак беззваротны той глыбокай веры,
Якой жыў ўсім целам, якой жыў душою,
Ў якой дні міналі, быццам тыя хвілі,
І жаданьні зьзялі яснаю зарою
На маім пасмуглым, хмурным небасхіле...
Ты пяяў на ралах шатнае бярозы
Той заклятай ноччу першаю гадзінай,
Калі абмачылі мае вусны сьлёзы
Ад мяне забранай роднае дзяўчыны.
— „Буду я другога“—мне яна сказала,
І з вачэй дзяўчыны сьлёзы паліліся...
Ўзрокам разьвітальным вочы заміргалі
І навек мы з ёю, мілай, рассталіся.
Я паслаў пракляцьце ворагу ліхому
І сьлязою горкай ў адзін міг абліўся...
Ты-ж, нямы, бяссэрдны к майму гору злому
Песьняю зычлівай, як цяпер, заліўся.

Смаленск, 1912.

## ХОЧАЦЦА МНЕ...

Хочацца мне кветкі сьвежае, пахучай;
Хочацца мне ласкі цёплае, кіпучай;
Хочацца шырокай незьмяранай волі,
І шчасьлівай, рэзвай маладзенькай долі.
Хочацца прастору неаглядных даляў,
Краскамі убраных, няпрытомных жаляў
Ад любашчы шчырай, цёплай і салодкай.
Хочацца ўсяго так, хоць на час кароткі,
Каб я мог зьявіці запытаньне тое:
Для чаго я ўкінут ў мора жыцьцявое?..

Вількамір, 1912

## ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ

Хоць нядоля мяне
Пагарджае, гняце
І бязжаласна кпіць—
Патом хочацца мне
Весяліцца і жыць!
Кожны дзень за сабой
Смутну вестку нясе,
І бяды неспакой
Ў жыцьцявым калясе,
Як-бы пена шуміць!
Патом хочацца жыць!..
Голас некі заве
На прыроду, на гладзь,
Спакусае мяне
Сонца й сьвет любаваць,
Пах і зелень любіць!
І так хочацца жыць!
Маладыя гады
Поўны сілы тае,
Што ня дбае бяды,
І пражэ заўсягды
Ўсё вакола любіць...
Мне так хочацца жыць!
На лугох у траве
Краскі зорацць, цьвітуць,
А ў лясной зеляне

Птушкі граюць-пяюць,
Неба ўгору маніць...
І мне хочацца жыць!
Так нянадаўга ён,
Жыцьцявы гэты срок,
Як квадранец, як сон,
І праходны, як крок!
Што нам сьмерць падарыць?
О, як хочацца жыць!
Жыць у ветры начным,
З лёгкай хмаркаю там,
У прасторы глухім,
Мкнуцца ў даль, к ваблакам,
Зоры й месяц лавіць!
Мне так хочацца жыць!
Весяліцца і жыць!

Пецярбург, 1914

## ЗАБУШУЙ ТЫ, РАКА!

Забушуй ты, магутна рака,
І аб бераг забіся сярдзіта!
Па кудравых кустох лазьняка,
Па лісточках блішчастых ракіты—
Свае пырскі расплюхай, рака!
Буйны вецер, мацней загудзі,
Па абшары вакол разьнясіся,
Каб ад гулу, куды ні глядзі,
Слупы пылу ўгару падняліся!
Буйны вецер, мацней загудзі!
А ты, неба, як можаш, хутчэй
Разжані з сябе хмару цямную,
І над ўстаўшай квітучай зямлёй
Расьсьцялі яснату залатую.
Разгані, неба, хмары хутчэй!
Аслабеўшае сэрца маё,
Поўна сілы—бадзёра забіся;
Сьветлых мар, што табе не стае,
Душа, ў волю сабе набярыся.
Сэрца буйнае, ў грудзях забіся!

Вількамір, 1913

# З ЦЫКЛЮ „ГОРАД“

## I

### АДВЯЧОРКАМ

Люблю сачыць, як дзень пагодлівы канае
І шэрасьць лёгкая над горадам шумлівым
Памерна ў вуліцы глыбокія спадае,
А над мурамі вісьне дымам сівым.

Паветра ціхае паволі рэдне, стыне,
Выразьней рэха гулкае ўтуруе;
Гудок фабрычны сьвіст зацяжны строма кіне,
Й працоўных натаўп рэзва, шумна зашнуруе.

Драты, што сеткамі крыжуюць вулкі, пляцы,
Губляюць ніткі доўгія ў прысьценных ценях,
І пэнт нядаўны пільнай творчай дзеннай працы
Прымоўкне, стуліцца ў каменных цесных сьценах.

Настрэчу-ж месяцу блядому й зорак кучы
Агні электрыкі вакол з вакон, з ліхтарань
Паднімуць ўверх прамень сярэбраны, бліскучы,
І зыкі выцісьне дзяўчына на гітары...

Крыху пазьней—і скрозь жыцьцё, як дым, зьнікае,
Адно з куткоў пачуеш парак шэпт шчасьлівы...
Люблю сачыць, як дзень над горадам канае,
Лятучы ціха к небу дымам лёгкім, сівым!

1/I 1924

## II

### НОЧЧУ

І тут, і там, здалёк і зблізку,
Як ў цёмным полі—воўка вочы,
Ў раскідзе доўгай гнутай нізкі
Агні па гораду бліскочуць.

Трапеча лёгкае праменьне
І змрок гусьціць ўвысі ды ўнізе—
На зірк ваччу кладзе адценьне
І зьяў жыцьця да здані блізіць.

Хто іх разьліў, з якой патрэбы—
Пытаеш—мрыюць над дамамі,
Як сьвечкі тыя над трунамі
Ў цалуне чорным, зьвісшым з неба?

І, здэцца, сумам мусіла-б павейваць
І ўзрокі цьмяніцца ў прышчурра,
А то-та-ж будзяць ясную надзейнасьць
І позыў—бегчы к ім настрэчу—бурацьц.

Менск, 12/III 1924

# БЭРЛІН

## I

### ЗНАДВОРКУ

Ня зьмераць вокам шырыні,
Даўжку—узрокам не акінуць!
Куды ні глянь—узрокі гінуць
Ў яго цяжкой велічыні.
    На мерку зроўненых муроў
    Ўстаюць крутыя рэбры дахаў,
    Іх вежы, лёгкія, як птахі,
    Ўздымаюць лес сваіх галоў.
Ля стыкаў вуліц, ля пляцоў
Сягаюць к небу кірхаў шпіцы,
Ў прастор паветра, ў бляск зарніцы
Нясуць шум грэшных гарадоў.
    Уверх, уверх! Бо душны дол
    Ў разрэзах цесных, вузкіх вуліц
    Жыцьцё разьюшанае туліць
    Каменнай цяжкасьцю вакол.
Як бурны вір ў глыбі зямлі,
Яно гудзе, ўсягды ў бясьсільлі
Разьбіць каменьні, што здавілі
Яго і выйсьце заляглі.
    Гудзе й шуміць! і каб прарваць
    Утомны скрэп, яно віруе,
    Нібы кудысь ўцячы мяркуе—
    Прасторам, воляй падыхаць...

Туды ўцячы, дзе 'шчэ ня лёг
Напласт каменьняў і цамэнту
І дзе-б яго разгону-пэнту
Ніхто стрымоўваці ня мог.
І, здэцца, вось агромны рух
Між шэрых сьцен дамоў-грамадаў
Шугне паводкай, вадаспадам
І змые загарадзь наўкруг.
І з дыму чаднага, з цяжкой
Затулы вуліц, камяніцаў,
Раздольным гмахам паімчыцца
Ў зялёны луг, на рунь палёў.

Бэрлін, 1920

## II

## УНУТРЫ

Ідзеш ты ім, глядзіш наўкруг—
Сьляпіць багацьце твае вочы.
У час спачынку, ў час рабочы—
Людзей гультайных гулкі рух.
Ядвабы, золата і пух,
Мяхі, манаклі, дыямэнты...
Пакроі вопратак к мамэнту,
Кафэ, салонныя акцэнты—
Давольства збытачнага дух...
І помеж тут, з дню-ў-дзень, аднак,
Ў благой паношанай адзежы
Пакорна моляць даць на ежу,
Хоць колькі-небудзь, хоць мядзяк.
Ня так даўно былі яны,
Як мае быць, пры цяжкай працы,
Пасьля за панскае багацьце
Сабралі ўсіх іх для вайны,
Дзе пяць гадоў другім ў карысьць
Братоў зарубежных зьнішчалі
І самі дзе папакідалі
Здароўе й сілу, каб рабіць,
Каб працай ўласнаю ізноў
З сям'ёю ўпрогаладзь карміцца...
І мусяць вось цяпер ў сталіцы
Прасіць падмогі ў багачоў.

А там, ў бакох, па вулках ўсьцяж,
На трохкалёсных лісапэдах
Ад ранку возяць без абеду
Хлапцы чужы тавар-багаж.
Між вокан крам, дзе роскаш скрозь
Завабай вас абманнай дарыць,
Ідзе—глядзіць рабочы, художвары;
Ён ў злосьці ўвесь, як ліст, дрыжыць,—
Бо ўсё жыцьцё—за цяжкай працай,
А сам з сям'ёй —ў парваным плацьці
Каб ў новым мог багач хадзіць.
Ды што каму бяда другіх,
Багатым—бедных недастача?
Хай сам працоўнік шлях адзнача
З уціскаў выбрацца тугіх.
Багатых сьвята—поўны рай;
Іх час цяпер пакуль ўрачысты...
І горад, волат буяністы,
Чакае-жджэ, што скажа край...
Што скажа рух тае душы,
Якую ў змучанай Германьні
Уздым наябрскага паўстаньня
Яшчэ належна ня рушыў.

Бэрлін, 1922

III

## SIGESALLEE—АЛЕЯ ПЕРАМОГІ

Шырокай стужкаю яна
Кладзе разгон праз Сад Зьвяроў—
Ад сьценаў вулічных муроў
Да Königsplatz'у палатна.
Пад шатай ветлівых дзярэў—
Дубоў вяковых, ясеняў і ліп,
Што побач робяць да ёй лёгкі згіб,—
Стаяць рады мармуравых цароў.
І з іх вачэй, з маркотных твараў іх
Глядзяць здарэньні тыя, што былі
У жыцьці-быцьці нямецкае зямлі
У часы мінуўшчыны, з вякоў былых.
І ў кожнай складцы царавых маршчын,
У замерлых бліках хворых іх вачоў
Глядзіць намер крывавы палачоў:
Знайсьці канцы няведаных прычын,
Якія рэзкім махам сьцялі ход
Жыцьця ў няволі, ў горы і бядзе,
Наўпроць якому новае вядзе
Паўстаўшы, ўзьюшаны вакол народ.
Але што дзень, то болей вісьне смуць
На твары грозныя цароў-ўладык,
І вочаў іх захмураны азірк
Бязмоцны ў сэнс сучаснасьці зірнуць.

Бэрлін, 1922.

## IV

### IM GRÜNEWALD—У ЗЯЛЁНЫМ ЛЕСЕ

Я стаю, заварожаны шумам лясным,
І гайдаюся ў рыхт па кірунку дзяроў,
Што схіляюцца нізка пад ветраны ўздым
Да абголеных 'шчэ нізкарослых кустоў.

Праз кароны з калюк сее сонца прамень,
Як праз рэшата сыплецца ўніз на мяне,
Быццам ў душу стараецца глянуць мне дзень,
Поўны дыху жыцьця, які́х шмат на вясьне.

Піскам рэзвым з вяршын стройных, гладкіх сасён
То адтуль, то адсюль пташкі сьпеў падаюць
І ў музычнасьць ад шуму жывую гармонь
Мэлёдыйнай струёю між дрэўцаў ліюць.

Дзесь здалёк—чуць даходзіць ка мне ў шуме хвой—
Горад-волат ў каменным закуцьці гняцьця,
Ня спыняе ўздымаць рух агромністы свой,
Рух людзкога, як мора, жыцьця.

Рэзкім сьвістам гудок ад заводаў наўзрэз
Цераз дахі дамоў, праз узьюшаны пыл
Мчыцца роўна і проста кірункам на лес,
Колькі мае для лёту з прыроды ён сіл.

Ў гэтым гудзе яго адчуваецца штось,
Чаго шолам лясны ня зглушае сабой.
І што ў душу маю прабіваецца скрозь
Ды ўздымае у ёй гардзялівы настрой,

Веру ў палкую творчасьць працоўных людзей,
Для якіх покуль сонца і лес—чадны дым
У заводах, але каму хутка ўжо йдзе
Час другі, час інакшы зусім—

Такі час, калі лес будзе песьні гусьці,
А праменьні вясновага сонца зіяць,
Каб заўсёдную весну ў ягоным жыцьці,
Неабмежнай свабодай ўбіраць...

Я стаю заварожан шумлівасьцю дрэў,
Пазіраю уверх, дзе плывуць аблака,
А тут душу гартуе галосны напеў,
Што шле чадны завод праз гудзеньне гудка!

Бэрлін, 14/IV 1922
Grünewald.

# ВАКОЛА І УДАЛЬ

# ВОСЕНЬНЮ

Пажоўклі рутныя лісты
І толькі ветрыкам павее,
Як дождж іх жоўты і густы
Траву і сьцежачкі засее.

Ідзеш па іх—шамцяць яны
Ды мягкай коўдраю пад ногі
Лажацца, быццам дываны,
Сабой ўбіраючы дарогі.

Здаецца, жаль па іх ісьці—
Спагадай ціхай сэрца б'еццa—
А мо' 'шчэ будуць зноў русьці
Ад іх галеючыя дрэўцы?

Мо' толькі маласьцю яны
Пацешаць землю, каб нанова
Разбэрхаць гэты дываны
І ўбраць згалелую дуброву?

Гуляе ветрык, мчыцца скуль
І шумам голасна гавора:
„Пакінь надзеі! ў фарбах муль
То восень ціха йдзе з-за мора".

Пецярбург, 1914

## РУЧАЁК

Там, за вёскай, ляжыць
Нівак вузкіх радок,
Між іх хутка бяжыць
З выш гары ручаёк.

На ваду з берагоў
Кусты лозак глядзяць,
Ў апранасе з лістоў
Ліпы-сёстры стаяць.

Па каменьнях вада
Рэзва плешча й бурліць,
Та сюда, та туда
Рвецца бег закруціць.

На паверсе яе
Цені лісьцяў ляжаць,
Вецер ў руслу снуе,
Бы што хоча сказаць.

Ня сьціхаюць над ім
Пташкі рэзвыя пець...
Ручаёк-жа сваім
Шляхам вечным цячэць.

Бесканечны чарод
Прамінае ўкол зьяў,
Ён-жа воду ўпярод
Гоніць пудка, як гнаў.

І пяройдзе яшчэ
Многа-многа пары,
Пакуль ён весь сьцячэ
З вышы стромай гары.

Пецярбург, 18/II 1914

# МЕЖКІ

Вузкія—як ніткі, зялёныя—як руць,
К лесу дзесь далёка, бы каму ў дагон,
Межачкі лахматыя, рэжучы загон,
Між ральлі пажоўклае весела бягуць.

Там пры касагоры, адзе белы плот,
Здэцца, ўпапярэчку, на касьлівы крыж,
Як за іх ты бегам воддаль паглядзіш,
Зьбегліся сям'ёю на руплівы сход.

Сам пабег-бы, здэцца, з межкамі туды—
Каб быў добра пэўны, што пры лесе том
Не спаткнуўся раптам з новым варагом,
Мала спадзяванай новае бяды...

Пецярбург, 1914

## ТРЭБА ЖЫЦЬ

Ў хаце сьцюжы панаваньне—
Нечым запаліць,
Дроў ад лета ані званьня—
Патом трэба жыць...

З страхі зьехала салома,—
Вецер паразьнёс,
За платамі бураломам
Гольля зьбіў з бяроз;

Вокны выбіты да шыбы,—
Нечым залажыць,
Ў хаце хлеба ані скібы,—
Патом трэба жыць.

На насеньне ні збажынкі—
Пуста у хляве,
Бурай ходзяць успамінкі
Ў нуднай галаве.

Шчасьце віхрам праляцела,
Нельга тугі скрыць...
З болю сэрца скамянела,
Патом трэба жыць...

Скора прыдуць за падаткі—
Хату растрасуць;
Бяда ўлезе на папрадкі,
Злыдні кут займуць;

Заліюцца сьлязьмі вочы,
Сэрца забаліць;
А тут хочаш, ці ня хочаш,—
Трэба-ж неяк жыць...

Капыль, 1909

## ПАЖАРЫСКА

Вось і пажарыска: агнёвыя сьцежкі
Як гладкае поле ляжаць.
Усюды дымяцца яшчэ галавешкі
І печы, як страхі, стаяць.
Бяз толку валяюцца хатнія рэчы:
Паломаны столік, тапчан,
Саганчык з капустаю вынуты з печы,
Старэнькі, падраны лахман.
Дзе яблынь шкілеты, дзе ліпы, рабіны
Нахмурана, ціха тырчаць;
Як рукі старэчыя, зьвісьлі галіны,
На попел, на сажу глядзяць.
А вот і хлявок, дзе кароўка рыкала;
Звуглёная шула дыміць,
А вунь, дзе нядаўна гуменца стаяла,
У кучы салома курыць.
Трасуцца і плачуць галодныя дзеці,
А бацька?—вачам хоць ня вер,
Бяз долі у горы век зжыў ён на сьвеце,
Што-ж будзе з няшчасным цяпер?
Глядзіць ён у жалі на голу зямельку,
Дзе хатка старая была,
Што грэла яго даражэньку сямейку
І маткаю роднай была...
І як-жа цяпер з гэтым месцам расстацца,—
Так цяжка яго пакідаць,—

Дзе раптам прапала старанная праца,
Чаго ўжо ня скора дастаць?
Куды ім цяпер адзінокім папхнуцца?
Дзе помачы вышукаць, дзе?
Ці будзе каму на іх плач адгукнуцца,
Руку падаць у бядзе?

Капыль, 1909

## НОЧЧУ

Шумны вецер з асакою
Вядзе гоман над ракою
Аб свабодзе, аб прасторы...
К рэчцы ўкрадкаю ступае,—
Чуй, дзяўчына маладая,
І сама з сабой гавора.
Бы ільністыя палосы,
Зьвісьлі нізка яе косы—
Няпрычэсана вісяць;
А заплаканыя вочы
Зорацъ пільна ў цемру ночы—
Сочаць сьцежку не сьцярацъ...
Падышла к вадзе дзяўчына,
Вокам зьмерыла глыбіну—
Страшна ў ёй, аднача.
Ды пазадзе боль ад страты
Сьцеражэ яе упарта—
І дзяўчына плача.
Над вадою стромкай, пеннай
Ня пускае жыцьцё з плену,
Да сябе вяртае.
Песьні, хлопцы ды вясельле,
Жарты, шэпты ў любным хмелю
Ў думках паднімае.
Як завідна!.. Але толькі
Хто залечыць яе болькі,
Верне ёй надзею?

І ці з сонцам ясным зраньня
Забуяюць зноў жаданьні
Й сум ліхі разьвеюць?
Вецер вые ў цемні ночы—
Глухне ў ім і плач дзявочы,
Глухне думак гоман.
Рэчка холадна сьмяецца
Чым дзяўчына плача, б'ецца
Ў непагодны цёмень?
Знаць няма нічой спагады!
Нікнуць спугныя пагляды
Да вады халоднай.
На што ў сьвет ужо радзіцца,
Каб дачасна загубіцца
Ад нядолі зводнай.
Але й жыць нялёгка ў горы,
Калі сэрца тнуць укоры,
І прыгонныя аборы
Ня пускаюць к шчасьцю.
Не, як зьмерла ўжо надзея—
Жыцьцё сэнсу больш ня мее—
Бяры, рэчка, Насьцю!..
Плюх у рэчцы—рэчка грае,
Вецер песьню зацінае,
Сьвішча, вые і шуміць.
А ліхая цем вакола
Расьсьцілае шат над долам,
Каб таемнасьць ночы скрыць.

Магілеў, 1910

## РАЗЬВІТАНЬНЕ

Сьвішча вецер, завывае
Нудна, невясёла,
Ралкі дрэўцаў пахіляе
Нізенька да долу.
У хацінцы чуцён гоман,
Чутны прычытаньні:
Выпраўляюць дзесь Сымона
Бацькі ў вандраваньне.
Маці, бацька, сёстры, брацьця
Цеснай чарадою
Ужо доўга ў змроклай хаце
Гутарацьць сям'ёю.
Вось да сына падыходзе
Маці й прычытае.
„Будзе плакаць, маці, годзе“,—
Сын яе сьцяшае.
„Я ня буду на чужыне
Доўга прападаці.
Ды хоць буду, ўсё-ж ня згіну
Між людзей я, маці.
Буду слаць вам часта весьці—
Абнадзейваць душу:
Дзе жыву я, ў якім месьці
Далей жыць я мушу.
А як ўдасца, павязе мне—
Грошы буду слаці.

Не гаруй, ня плач дарэмна,
Дарагая маці".
А за маткай бацька радам
К сыну голаў клоне.
„Дай зірнуць адным паглядам
На цябе, Сымоне.
Дай у твар твой наглядзецца
Ўдосталь мне, бо можа
Бачыць ўжо не давядзецца
Больш цябе, нябожа.
Я стары, слабеюць сілы
З дня на дзень прыкметна.
Будзь здароў-жа, сын мой мілы,
Голуб мой прыветны".
І вянком сухія рукі
Абгарнулі шыю.
Ў грудзях раптам ўсталі мукі
Цяжкія, ліхія.
Шкода-шкода сем'яніна,
Ох, ты, лёс закляты!
Гоніш дзесьці на чужыну
З роднай яго хаты.
Не паслаў яму ты долі,
Каб шчасьлівым быці;
Як былінку ў чыстым полі
Парашыў ссушыці.
— Ну-ж, сяструхны, а ну-ж, брацьця,
Йдзеце па парадку.
Разьвітаюся ўжо ў хаце,
Потым выйду з хаткі.
Абгляджу гарод ды ніву,
Шат зялёных кленаў;
Хай яны пашлюць вятлівы
Пахацей уклонам.
Хай пахіне збожжа колас,
А кляніна ралы.

Верабейка пашле голас
Гучны ды нядбалы.
Хутка-ж, Сьцёпка, гэй, Марыля,
Бліжэй падыходзьце.
Будзе ўжо, пагаласілі,
Часу больш ня зводзьце.
Ўжо даволі змылі сэрцы
Вы свае сьлязамі.
Ня судзеце-ж і ня верце,
Што ня ўбачусь з вамі.
Калі будзе на чужыне
Моркатна і цяжка—
Усё там кіну, ўсё там рыну
Ды прымчуся пташкай.
Свая хата, кут свой родны
У сэрцы родзяць цуды.
Ці-ж я сын яго нягодны,
Што вазьму й забуду?
Цёнгля будзе аб ім думка
Шчасьцем сэрца поўніць
Вашых вобразаў—малюнкаў
Мілых мне, чароўных...
Хвіля сьцішы невясёлай—
Дзьверы расчыніліcь.
Сымон нізка схінуў голаў,
Усе яму схіліліcь.
Заігралі ў вочах сьлёзы
Чысьценькім крышталам...
Прабег вецер па бярозах,
Страсянуўшы ралы.

Вількамір, 1913

## БРАТЫ-ДУБКІ

Я знаю у полі двух родных братоў—
Зялёных, кудравых і сьвежых дубкоў.
Растуць яны тама абняўшыся ўдвух
На вузкай мяжы, дзе канчаецца луг,
І цягнуцца к лесу палоскі шнуркоў
Убогай зямелькі братоў-мужыкоў.
Халоднай зімою пад сьнегам адны
Снуюць і гадаюць завідныя сны,
Абняўшыся шчыра і шчыльна ўдваіх.
А вецер халодны бушуе ўкол іх
Ды плача мяцеліца ў віхры ліхом,
Зьмятаючы гурбы ад сьнегу кругом...
І ціха, так ціха на мілі ўвакруг,
Як быццам жыцьцё ўсё скавана ў ланцуг,
Ні голасу песьні нідзе ня чуваць...
Так цяжка дубочкам зіму зімаваць.
За тое-ж як вецер павее вясны,
Дык радасьці буйнай нап'юцца яны,
І ў променю сонца гамоняць аб тым,
Што жыцьце ізноў усьміхнулася ім.
А ветрык іх трэпле галінкі цішком,
І шэпча-гамоніць дубочкам аб том,
Што ўжо праміnуліся чорныя дні,
Што сьветла і волі міргаюць агні...
Дубочкі-ж сьмяюцца умільна ў адказ.
І рады, так рады, што цёплы стаў час...
. . . . . . . . . . . . . . . . .

Бы гэты дубочкі, з табою мы, друг,
Халоднай зімою скаваны ў ланцуг,
Ў туманах абвіты наўкола густых,
І шчасьця ня бачым хвілінак сьвятых.
Ці зьявім калі маладыя мы сны,
Прыдучай да нас залатое вясны?
І ветрык ці скажа прынадным дзьмухом,
Што вольна і нам ўпіцца шчасным жыцьцём,
Ці вечна ў туманах блудзіць будзем мы
Нядолі і гора сібірнай зімы?

Капыль, 1912

## БЕЖАНЦЫ

Перайшоў-перабег над старонкай маёй
Нябывалы даўно, нячуваны віхор,
І заліў, як вадой, зямлю сьлёзкай з вачэй
І спугнуў-страсянуў больлю нутрыны гор.
Як дарожкі вядуць—быццам ралкі бяроз—
І сюды, і туды, удаўжкі, папярок—
Ад зямлі да нябёс—лёскат дробных калёс,
Цяжкі енк аддае ад зямлі да аблок...
Паглядзіш—доўгі цуг... густы сум давіць твар,
У сяродку, ў душы, нязвычайны спалох...
І людзей і жывёл, як на небе тых хмар,
Што пусьціў пагуляць, разгнявіўшыся бог.
На людзях адабіт дзікім выглядам страх
Крокам спугным іх лёс ў пуць няверны жане,
Кроў застыла з пяском на мазольных нагах,
Адраньцьвела істота ў пякельным агне...
Што прайшлося—ў мамэнт вышла з памкі зусім...
Ды нашто азірацць калюшковую пуць?
Хай зьядае агонь хаты цёплыя, ім
Трэ' забыць пра той час іх вярнуць...
Там ня хаты адны—там і гумны стаяць,
Паміж хатак садкі, за гуменцамі луг;
А 'шчэ далей, за луг—там дубровы наўкруг
Апінаюць наўкол, як вянком, сенажаць.
І раўчук ліпняку ды лазінкі над ім—
Палатно разаслана, бы стужкі, ляжыць;

З перапугу забыт—ды няведама кім,
Андарачак стары ля дзядулі ўзлажыць...
Ай, даволі казаць,—даражэй, бач, няма
Той краіны, дзе жыў, гадаваўся і рос.
Дзе іграла вясна, дзе трашчала зіма,
Дзе маленькім гуляў пад цянямі бяроз,—
А патом, што-ж зрабіць,—хто жывы—пакідай...
І пашлі: з мужыком побач конь, а кароўка—з дзяцьмі,
Без яды, без надзей ды ў няведаны край,
Ад краіны сваёй, Беларускай зямлі...
Рэжа душу так жаль... Хто-ж ня знае ўсяго?
Нават ў рыку кароў, ў рагатаньні канёў
Чутны водгук нямы, водгук страху таго,
Што навалай ліхой на краіну зышоў...
Паабапал дарог нівы ўбрана ляжаць,
Дзе пад жытам яны, а дзе жоўтая яр.
Ой, шчасьлівенькі той, хто іх будзе вжынаць,
Гэты працы свой плён—неацэнены дар...
Хто хацеў, хто чакаў, каму трэба было
Зварушыць, скалыхнуць хлебаробаў спакой?
Каб жыцьцё наўсягды ад яго адняло,
Чым дарожыць ў жыцьці ён, чым цешыцца той...
Ўсе пашлі ад гумён, ад палосак, плугоў
Па дарожках крывых, цераз рэчкі й лясы,
Пагублялі дзе хто, і сясьцёр, і братоў,
Як часамі снапы губяць так каласы;
Тут дзядуля, тут сын—пахавай і забудзь,
Бо ці пройдзеш калі ўжо сюдэма—наўрад...
— Но-о, Гнядая, сьпяшы, дзе канчаецца пуць?
— Саламея, маўчы, не глядзі ўжо назад“...

* * *

Цёмны Нёман, ад сьлёз не хвалюйся крапчэй;
Абмываеш крывёй берагі ты свае...
Там ля Коўны ў цябе Вільля ціха ўцячэ
І крыві, і сьлязін яшчэ больш уліе.

Промень страшны агню ад Прыпеці к Дзьвіне —
Стараны мае рэчкі адбіцьце ў вадзе,
Хай патомак загляне ды іх пракляне,
А аб шчасьці людзкім рэч сваю павядзе...
Нам судзіў цяжкі лёс жыць ў ліхія часы,
Працярпелі ўсяго, больш ня будзем цярпець!
Пачнем з верою жыць, што калісь будзем мець
Долю шчасную й жыцьце паўное красы...

Пецярбург, 1915

## ПОЭТА, МАЦІ І МУЗА

*Мукі творчасьці*

За сталом, над паперай нагнуўся
І сядзіць, поўны думак, поэта.
Небасхіл перад ім разьвярнуўся
Ва ўсёй пекнасьці цёплага лета.

Уваччу граюць мулямі зданьні,
А ў грудзёх кіпіць творчая сіла.
Сьветлазорная Муза Змаганьня
Яго думкі к сабе нахіліла.

Глядзючы на убогую вёску,
На яе захудалыя людзі,
Не адну праранію поэт сьлёзку,
Ён ня раз раніў чулыя грудзі.

Цярплючы векавую нядолю,
Спатыкаючы вечна нягоды,
Рвецца ён да супольнае волі,
Да супольнае рвецца свабоды.

Не пакоры душа вымагае,
Не спагады ад музы чакае,
А ў нутры яго прага хвалюе
Зьнішчыць долю заклятую, злую.

ПОЭТА

„Як арол, я з зямлі падымуся
І вачамі прасторы акіну,

А пад небам калі апынуся —
Сьветлай радасьцю вокала ліну.
Запануе тады над зямлею
Непадлеглае творчасьці сіла;
Яна ўздыме красу ды надзею
І жаданьні людзкія акрыліць.
Не пачуецца песьняў нядолі,
Не адзначыцца нізкай пакоры,
Брат на брата ня скажа ніколі
Лаянкі дзікай, завіснай укоры".

І ў руцэ карандаш
Правёў рыску наўсьцяж
Пад апошнім радком...
Поэт глянуў кругом
І яскравым агнём
Засьвяціў яго твар.
Перад ім сетка мар
Зьвіла пекную здань.
Бы шапнуў хтосьці: „Глянь
Сюды! З пекных зор
Дзіўны твор
Твой глядзіць".
Ён зірнуў і сказаў:

ПОЭТА

„Гэй, дажыць-бы, дажыць!
Я гатоў паслужыць
Усёй душою таму...
Прэч нядолю, журбу,
Прэч ліхое кругом!
Я радзіўся з вагнём
Непакорным барцом;
З болю мук ды бяды
Вышаў я малады,
Загартованы ў сталь.

Мне жыцьця больш ня жаль —
Для людзей, для братоў
Яго ў момант гатоў
Бескарысна аддаць".
Ў вачох зоркіх яго
Агонь зьзяе, гарыць.
Пачуцьця, бач, ўсяго
Мала ў творы ўлажыць!..
Вось ён рвецца з душой
Вайсьці ў твор шчыры свой,
Каб з радка у радок,
Бы жалезам ён пёк,
Каб таго, хто упаў
Пад паходняй цяжкой
Твор, бы звон, абуджаў,
І ваёўны настрой,
У нутро падліваў.

ПОЭТА

— „Адпачынак ня ў час,
Не упару;
Я захоплены працай
Кіпучай, натхненьнем!"
Ў гэты момант якраз
Падышла к песьняру
Ўся ў агні-абурэньні
Матка поэты.

МАЦІ

„Мой сынок дарагі,
Кінь ты гэту папер.
Няма часу цяпер
Склаўшы рукі сядзець
Й сумным узрокам глядзець
На халодны спакой.
Апанас, Апанас,
Што ты думаеш, сын?

Я сяджу—паглядзі—
Поўна цяжкай нудзьгі
І вачыма сачу
За табою ўвесь час.
Ты здавён сірата,
Мук бяз ліку пранёс...
Насьмяяўся з нас лёс,
Даў за плечы краста,
Ўзьдзеў вянок ад шупшын...
У мяне ты адзін,
Дарагое дзіця,
Даны ў радасьць жыцьця.
Як маленькім ты быў—
На руках маіх жыў
І ня ведаў, ня знаў,
Пакуль сталым ўжо стаў,
Колькі гора зьнясла
Я за тыя часы!..
Колькі сілы было,
Для цябе берагла.
Вось цяпер прышоў час —
Стаў ты сталым, падрос —
Я-ж старая зусім,
Чуць ліплю, чуць жыву...
Будзь-жа ты, Апанас,
Ўжо кармільцам маім.
Пашкадуй, ня губі!
Вось пайдзі зарабі
Хоць ашчэдны мядзяк,
Каб было абы як
Ў нашым бедным жыцьці
Дзень-другі правясьці.
А то хутка тры дні,
Як даелі мы хлеб,
А пры гэтым—зірні —
Колькі іншых патрэб!

Дровы скончаны ўсе;
Без апраткі сядзім;
Дах пагніў на страсе —
Няма выправіць чым...
Хоць цяжарны наш труд —
Дае чорны мазоль,
Але-ж беднасьці тут
Ці-ж ня горшая боль?
Без аховы — адны —
Мы гібеем ўдваіх.
Сьвятла, сонца жадны,
Сроць людзей, сроць чужых".

І сьляза ў расьніцах маткі заблішчэла;
Змучаная ціха ля сынка прысела.
Цёплаю любоўю сэрца трапятала —
Цяжкаю пакутай душу дратавала.
Ў незьясьнёнай меры сынавы паперы,
Збрыдлі, надаелі ёй да ачамеры,
Так што, каб прымела, колькі склёну стане,
Зьліць была гатова, каб склясьці да званьня
Тую надаедную чорную часіну,
Калі думка ўголаў заняпала сыну
За паперы сесьці й дзень і ноч пісаці —
Ў жыцьці ўсё-ж другое кінуць, занядбаці...
Нясупынным роем думкі захадзілі,
Небасхіл туманам матчын засьмуцілі.
Доўгі век цярпеўшы, няймючы спачынку,
Хоць-бы ёй пад старасьць на адну гадзінку
Не ўскладаць на сьпіну непасільнай ношы.
Ёй палац ня трэба, ёй ня трэба грошы...
Думкі томяць голаў, думкі цісnуць грудзі.

МАЦІ

„Што з тваіх, сыночак, тых папераў будзе?
Ўнік ты ў іх глыбока, ўнік ты ў іх бязьмеры—
Доля і жаданьні—ўсё тваё ў паперы.

Колькі я здароўя, колькі сіл губляю,
Як тваю пастацу ўзрокам акідаю!
Ня трываюць грудзі слоў да прычытаньня —
Прад табою зьліць іх хочацца да званьня.
Але ты ня чуеш, ты не патураеш —
Аб табе адданай мацеры ня дбаеш.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Мой сынок каханы, можа і грашу я
Калі на цябе так серджуся ды злую.
Таго быць ня можа, каб тваё ня чула
Сэрца маладое цяжкіх мук матулі:
То, бадай, жыцьцё так наша захацела,
Каб да самай дошкі мукі я цярпела,
Каб замест спакою на краі магілы,
З торбай за плячыма па дварох хадзіла...
Што-ж, пайці я мушу—сорам мне—нічога —
Просьціцца ад сьвету, просьціцца ад бога...
Толькі ўсё-ж, здаецца, хай-бы ты, каханы,
Даў мне перад сьмерцю хлеб запрацаваны,
Каб з тым хлебам верным мець спакой для сэрца,
Каб магла я лёгка ды спакойна ўмерці".

Твар матулі
Праясьніўся;
Пекнай муляй
Засьвяціўся
Думак новых
Рой разьвісты.
Зычнай мовай,
Галасістай,
Тнуў за душу
Маці шчырай.
І матуля
Прасіяла,
Свайму сыну
Цёплым словам
Праказала:

МАЦ

„Ну, та мо‘ паперы, мо‘ тваё пісаньне,
Як карысным людзям і патрэбным стане,
Можна будзе згодна прамяняць на грошы?
Здэцца пішаш складна ты і твой піс харошы.
Напішы у горад, папрабуй спытацца,
Можа хто захоча ўзяць пакарыстацца!“

І змаўчала маці—слоў няма для сказу,
Ўглядаецца ў сына, жджэ яго адказу.
Сын-жа кінуў думку шчырага тварэньня,
Адвярнуўся к матцы поглядам ўміленьня,
Ды праз вільгаць сьлёзаў, ды праз сьмех бадзёры,
Стаў казаць ёй ўголас з цёплаю пакорай:

ПОЭТА

„Той жыве, хто творыць
Сілай маладою,
Клопатам нябудным,
А сваёй душою,
Яе зовам цудным
Да жыцьця другога —
Лепшага, сьвятога.
І дае натхненьне
Вобраз той тварэньня
Маладому зову —
Прызыўнаму слову.
Ў кожным яго зыку
Сэнс ляжыць вялікі —
Пад якім ёсьць глеба
Толькі ў дзівах неба!
Ой, галубка-матка,
Дарма твая гадка
Ўкосна мне гавора —
Аб грашох за творы.
Ласьне вольна мушу

Прадаваць я душу?
Ці настрой зьмяню я
На срабрыну тую?
Не! Казаць ня трэба!
Не за творы хлеба
Мушу даставаці.
Ведай тое, маці!..
Хоць я абарваны,
Горам змардаваны,
Дзень у дзень спацеўшы,
Стомлены, няеўшы —
Ўсё то мне нічога!
Рвуся я да тога,
Што дабром завецца,
Што за яго б'ецца
Многа людзей, многа.
Кроў ваяк забітых,
У вянкох абвітых
З лаўру, імарцелю —
Лье бальзам па целі;
Духам жыватворным
Сэрца к сабе горне,
Цела асьвяжае.
Я агнём палаю
На ахвяру даць —
Страху не баяцца:
Толькі-б ведаць тое,
Што жыцьцё сваё я
У карысьць людзкую
Дарма ахвярую".

Пот цурком па твары перайшоў поэты,
Ўсё-ж ён не стаміўся, праказаўшы гэта.
Весь ахоплен пэнтам, пачуцьцём адзеты,
Ён гарэў хаценьнем больш апавядаці,
Каб сваёй размовай супакоіць маці.

Хвілю прапусьціўшы, ён зірнуў наўкола
Ды ізноў аддаўся гутарцы вясёлай,
Шчырай ды гарачай:

ПОЭТА

„Эх, мы, людзі, плачам,
Мукі баючыся!
Нудзім, злуючыся.
А дзе-ж тое сэрца,
Каб з адвагай ўмерці
Ўраз было гатова
За свабоду слова,
За парадак новы,
За сьвятло праявы
За пачатак справы
Буйнага змаганьня
Проці панаваньня
Ўціску і нядолі?—
Каб кастры, вастрогі,
Ды ў кайданах ногі
Не зьвялі з дарогі
Ў нястрыманым ходзе
На пуці к свабодзе?—
Ворагу ня даццa
Йсьці—не азірацца,
З верай лёгкакрылай,
З буйнаю надзеяй,
Поўны гарту й сілы,
У той край жаданы
Волі панаваньня
Для ўсяго народу?!.
Дзе-ж душа ёсьць тая,
Каб сваю выгоду,
Каб сваё цярпеньне
Аддала для краю,
Для яго ўзраджэньня?

Адкажы мне, маці,
Адкажы, прашу я...
Што маўчыш сярдзіта—
Мэрам ўся разьбіта
Сынавым пытаньнем?
Можа мая гадка
Кожным сваім словам
Тне цябе й катуе,
Бы вянком цярновым?
Мо мая размова
Ёсьць віны аснова
Дум тваіх балючых?
Мо' ў сваёй кручыне
Вінаваціш сына—
Свайго дарагога—
Што так плачаш многа?
Што сьлязою жалю
Шчокі абмываеш,
На мяне нялюбым
Вокам пазіраеш?"

І поэта назад азірнуўся:
Яму раптам чыйсь голас пачуўся.

МУЗА

„Пачакай, перастань, суніміся!
Ты наперад са мной згаварыся.
Я параджу табе, ўлажу ў мову
Для матулі твае супакойнае слова,
Ад якога цябе яна ўраз зразумее
І цалунны туман сваіх думак разьвее".

ПОЭТА

Хто гавора тут са мною?
Ах, я бачу, гэта ты,
Здань нябеснай пекнаты!
Сваёй ласкай маладою
Разганяеш маю тугу.

Я гатовы на паслугу
І зьнямоглую матулю
Палкай сынавай уцехай
Атулю я.

МУЗА

„Вось я тая,
Што зьлятаю
З небнай сіні,
З цёмнай далі.
І скрыжалі,
Блаславеньня
Для імкненьня
І для змогі
Я прыношу
Тым, хто годны.
Будзь свабодны,
Рвіся к зорам,
Мук, нядолі
Ня пужайся.
Ды пакоры
Не здавайся.
Ў міг сумненьня—
Нецярпеньня—
Йдзі наперад
Цьвёрдым крокам—
З ясным ўзрокам...
Я з табою
Днём і ноччу,
Ў час спакою,
Ў міг нямочы".

Поўны цёплай веры, радасьцю адзеты,
Голасам бадзёрым адказаў поэта:

ПОЭТА

„Ад калыскі я рос
Сярод мук ды нязгод,

Праліў многа я сьлёз!
За пражытых рад год,
Бы з нажом, бы з касой
Хтось стаяў нада мной,
І мой ўзрок, і мой твар
Абвіваў смуткам мар.
Ня туды—ў другі бок,
Накіроўваў мой крок
І шаптаў мне адно:
„Шчыры брат, верны друг!
Не давай ты патуг
Праяўляцца, снавадь
Вольным думкам сваім
І свайму пачуцьцю.
Прымірайся к жыцьцю,
Як што ёсьць, як відаць—
Так павінен трымаць.
Не гадай, не задач,
Не маркоць сваіх дум;
Разгані з сэрца сум,
Будзь бадзёр, будзь вясёл
Што дано—то бяры,
Май уступ, май пакор:
Мышы—цемень нары,
Арлу—вольны прастор“.

Так ўсягды,
Дні й гады
Ў цішыне
Нешта мне
Гаварыла.
Але ныла
Маё сэрца
Ў паняверцы.
Супыняўся
Я й пытаўся,
Поўны жалю:

Як быць далей?
Толькі чую
Адну й тую
Я прамову:
„Свайму слову
І хаценьню—
Ня дай змовы
Ды вяленьня“.

І ў клубок віліся думак пераплёты—
Ня было сканчэньня, ня было ім шчоту:
Бы вакол вісела нада мной аправа—
За якую глянуць ня меў сіл і права,
Бы захоплен быў я абцугамі туга—
І маўчаў бязмоцна мэрам раб пад пугай.
Што рабіць мне далей—сам сябе пытаўся,
І, тым часам, з месца далей не кранаўся.

Ў гэты час ты ка мне
Наяву, а ня ў сьне,
Ўся ў праменным агне
Прышла з зовам сваім,
Маладым, баявым;
Па істоце маёй
Прайшла сілай жывой,
Праказаўшы:
— „Ідзі!
Ў бойку ты і вядзі
За сабою другіх.
Няхай ў жылах тваіх
Кроў, як промень, гарыць;
Хай заве, хай маніць
Шчаснай долі промень!
Поўны прагных хацень,
Ты вядзі за сабой,
Хто ўжо крохкі душой,
Хто зварочвае ў бок

Няўвераны крок,
І пугліва назад
Адварочвае ўзрок.
Будзь ваяк, будзь прарок!
Асьвятляй—там, дзе змрок.
Дзе спакой—давай звон!
Дзе жыве хоць адзін
Долі горкае сын—
Праляці, прагудзі,
І ў збалелых грудзёх
Прагу к помсьце ўзбудзі,
Гукні зычна: „Ўжо час!
Я пасланы па вас
З тых краін, з тых канцоў,
Дзе няма, ня чуваць
Ліхіх мук, горкіх сьлёз.
Дзе пануе ўжо лёс
Сьветлай долі людзей...
Дзе бурліва гудзе
Працы творчай размах“.
Слухаў я і нямеў,—
А ў душы бурны гнеў
Бушаваў і кіпеў.
На цябе я ўзіраў,
Твайму сказу ўнімаў.
Ў адзін міг быў гатоў
На рашучы твой зоў.
Каго мог—таго вёў,
Сілы, гарту ўліваў
Ў душы слабыя, зваў
Йсьці ў паход, йсьці туды,
Дзе ўміралі браты
За дабро, за любоў
На прыгоннай зямлі;
Дзе няўпынна лілі
Яны сьвежую кроў...

Я быў твой і з табой
Сваім сэрцам й душой,
Ўсёй істотай сваёй.
Ва мне бляск твой ня тух,
Якім стынучы дух
Ацяпляла ты мне.
Служкай быў я табе,
Каб стаць служкай людзям.
За іх волю я нёс
У вагні пачуцьця
Сваю душу, жыцьцё!
Што мне ўласны быў лёс,
Што бяда мне была?
Я ішоў — ты вяла!..
Але стухлі агні.
І вялікія дні
Стухлі ў змроку глухім,
Ўсе забылі аб тым
Пра што марылі; спаў
І той, хто аддаў
У ахвяру жыцьцё
За свабоду другім.
Так і я задрамаў,
Так і я занямог
Зваяваным і... зьлёг
На пасьцелі цьвярдой
Сярод цемры густой
Дзікай ночы—й заснуў.
Сон мяне агарнуў
І балюча таміў.
Я драмаў, а ня жыў,
Змогшы сам ў барацьбе;
Ды ня бачыў цябе
І ня знаў, дзе ты ёсьць...
Але раптам зноў весьць
Падаслала ты мне,

Праказаўшы: „Мяне
Ты чакай — я прыду
І к табе прывяду
Твой аслаблены гарт.
І ты станеш зноў варт
Быць прарокам людзкім“.
Я быў рад, што мне жыць
Зноў надыйдзе чарга,
І цябе як мага,
З нецярпеньнем чакаў,
І гукаў, і пытаў...
І вось, зноў ты прышла
Ў прыназначаны час
Да мяне ў другі раз,
І з сабой прынясла
Ў дзіўным бляску сьвятла
Духу гарт — сэрцу пал,
Шмат адноўленых сіл;
І чароўным агнём
Правяла па маём
Целу стомленым ты...
І сродзь соннай цішы
Ты за струны душы
Зачапіла рукой —
Навяла іх на строй.
Вось якраз ў гэты міг
Зык пачуўся ад іх —
І то голас быў твой.
Буйнай хваляй ён плыў
Ў жылах з цёплай крывёй,
Маладой, агнявой.
Нібы пташка ён пеў,
Выліваючы гнеў;
Нёс прызывы, будзіў:
„Гэй, ўставай — час прабіў, —
Зноў з гарачай душой

Йсьці пасьпешна на бой —
У гэты раз з цемнатой
Неабуднага сна...
Глянь, твая старана
Стогне ў цяжкім жыцьці —
Няма сьцежак прайсьці
Ёй да яснай зары!
Будзь агнём і гары
У цемры змрочнай над ёй.
Няхай сілы твае
На ахвяру ідуць
Для прыгонных людзей...
Не давай ім заснуць
Ні на момант адзін.
Люду беднага — сын
І яго ты — дзіця.
Не шкадуй-жа жыцьця
Ты для шчасьця братоў!
Будзь заўсёды гатоў
Памагаць ім, служыць...
Старана хоча жыць
Жыцьцем буйным, жывым,
А ня спаць векавым
Заварожаным сном".
Вось, забыўшы бяду,
Я дарогай іду,
Што намеціла ты.
І з сабою нясу
Я жывую расу,
Што паіла ты ёй
Маё сэрца, мой дух...
Хай пануе наўкруг
Цемра ночы глухой,
І кажаны пяюць
Праз утомную смуць
Непрапаўшай бяды,

Я іду, малады,
Поўны гарту і сіл!..
Ва мне пыхае моц
Веры цьвёрдай, як сталь,
Што бурлівай ракой
Забуяе жыцьцё
Ў вольным краі маім
І ў буяньні сваім
Перашкоднае ўсё
Змые, зьнішчыць нашчэнт.
Веру я ў той мамэнт,
Веру моцна і жду —
Ды настрэч яму йду...
Ты два разы ка мне,
На яву, а ня ў сьне,
Прылятала з высі.
Прылятай-жа што раз
Ў прыназначаны час,
І з сабою нясі
Непатухшы агонь
Гарту й сіл ў барацьбе.
Я заўсёды жадзён
Яго чараў жывых...
Бо я кроўю ёсьць з тых,
Што завуцца „рабы“
І прагуць барацьбы
За здабытак сабе
Лепшай долі ў жыцьці...
Ня цурайся мяне,
Муза сіл баявых“...

Праказаў і заціх...
Ў гэты міг зданьня блік
Распылеў і прапаў.
Поэт ўстаў, паглядзеў,
Запытаў:

ПОЭТА

„Дзе я ёсьць, дзе я быў?“

Маці, пахінуўшы голаў, паглядала:
Сынавай гамонкі ўсё канца чакала.
І ёй страшна стала: як-то сын бясьнутна
Сам з сабою мовіць гэтак важна, рупна.

МАЦІ

„Божа мой ласкавы! Каб хаця нямала,
З ім чаго ліхога ад пісьма ня стала“...

І з паніклым ўзрокам, з пабляднелым тварам,
Ў любасьці гарачай, годнай для ахвяры
Стала радзіць сыну:
„Родная дзяціна,
Годзе ўжо пісаці —
Над паперай вяці —
Апанасе, сынку!
Гэтым й на хвілінку
Не забудзеш гора...
Есьці не дастанеш
Шчыраю спагадай.
На цябе, дзе станеш —
Варажным пaглядам
Кожны хмура гляне,
Кожны засьмяецца.
І тваё жаданьне
Ў трэскі разаб‘ецца.
Я-ж пайду па сьвеце
З торбаю цягацца,
А з цябе, сынок мой,
Будуць ўсе сьмяяцца...
Мовіць не захочуць,
Стануць пагарджаці.
Ці-ж ды хопіць мочы
Выцярпець для маці?

Кінь пяро ты гэта, годзе клапаціцца,
З ім нам лепшай долі, сынку, не дабіцца.
Ты адзін ваяка на шырокім полі —
Ці-ж ты пераможаш гора ды нядолю?
Ці-ж адзін ты ў сіле з імі ваяваці?"

ПОЭТА

„Годзе, мая маці...
Ша, я дагадаўся:
Я пайду на працу —
Вось ужо сабраўся...
І ў пакуце, ў муках
Падыму я рукі,
Ды з зямлі сырое
Вырыю я тое
Семя лепшай долі...
Для цябе я болей,
Ніж жыцьцё патрачу —
Й нават не заплачу.
Ўсё зраблю, дастану,
І цябе, кахану,
Пракармлю, адзену.
Але йсьці на здраду
З музаю — ніколі
Я ня дам патолі.
Аджану сумненьне
Ў бойцы беспагаднай.
Покуль сілы маю
Спробую ня даццa;
За сваю ідэю
Буду я змагацца".

МАЦІ

„Эх, сынок мой, будзе.
Йдзі хоць паабедай!
Бач, як ссохлі грудзі
Хворыя да званьня.

Весь змарнеў. Ад раньня
Над паперай б'ешся...
Вось, 'шчэ засталася
Ад учора страва.
Хоць паеш крыхутку,
Ды спачынь мінутку".

Адышоўшы, маці ў плач загаласіла.
Жальба ў яе грудзях рэчкай забурліла.
Чаму-ж бог бяссэрдны ды не зьлітаваўся —
Сын яе каханы ў бацьку ня ўдаўся.
Ён замест пакоры й ціхага маўчаньня —
Весь гарыць адвагай к помсьце ды к змаганьню,
А замест клапотаў аб сваёй прыгодзе —
Дбае ўсё аб людзях ды аб іх свабодзе.
Не глядзіць ні званьня, як сям'і жывецца —
Ўсёлюдзкой любоўю сэрца яго б'ецца".

Поэта ня слухаў:
Тварыць ён канчаў.
Красой весялухі
Твар гарды зіяў.
Ўздымалася ўгору
Заўпаласьць грудзёў...
Далёка ўсё гора
Пражытых дзянькоў.
Ён ў сьвеце ня гэтым,—
Істотай жыве.
Змаганьнік-поэта
Твор людзям дае:

ПОЭТА

„Свой астатні акорд я дапеў.
Ў ім прызыў ды разгойданы гнеў,
Ў ім сыгнал да зьнішчэньня прыгону
І аснова закону
Імкненьняў да волі.

Хай ён будзіць у людзей
Роі сьветлых надзей.
А табе, мая маці, скажу,
Што за ласку тваю адслужу.
Хоць я твой і нядбалы сынок,
А любові к табе ўсё-ж папоўню аброк.
Бо ты ў сьвеце, матуля, адна,
Што павагі глыбокай ды шчырай гадна“.

І поэта хутчэй
Да матулі падбег:
На губах яго сьмех
Блуднай ценьню мігнуў,
Цьмянасьць ўзроку вачэй
Пала мацеры ў твар...
Пацалунак—быў дар
Ды падзяка старой...

---

Сьледам—ўрочаны час!—
Ляжаў мёртвы яе
Апанас.

Вількамір-Пецярбург. 1912—15

# БЕЛАРУСЬ—БССР

## К ЗОРАМ!

Працоўнік ўстаў і вызваленыя рукі
Да працы творчай прылажыў,
Вакол кіпіць яна пад радасныя гукі
Прызыўнай песьняй вольных ніў.
Адходзяць ўдаль часы прыгону,
Згасае мёртвасьці нямы пакор,
І шырай—шырай прагныя разгоны
Лятуць, лунаюць к сьветлу зор.
З заслоны цёмнай хмары-ахвіранкі,
Прамень хаваўшую вякі,
Прастораў вольных, ўсьвечаных заранкай,
Мігаюць ярка далякі.
Адкрыты шлях, праложаны струною,
К жыцьцю развойнаму вядзе.
Народ працоўны паўстаў і з боем
К яму йдзе ў дружнай грамадзе.

Менск, 24|VII—1921

## ДА НЁМНА

Эх, ты, Нёман-рака!
Ці ты думаў ці сьніў,
Як сьлязу бедака
У свае воды лавіў;
Як стаяў над табой
Сын нядолі худы
І над цёмнай вадой
Сьпяваў песьні нуды,—
Што надыдзе пара—
Зьнемажэньне міне,
Вызваленьня пара
Над народам блісьне?
Што з балючых грудзей
Беларусі дзяцей
Над табой загудзе
Песьня вольных людзей?

Капыль, 1909

## КРАСУЙ, ЗБОЖЖА!

Красуй, збожжа майго краю,
Каласісь багата!
Жджэ за працу ураджаю
Ад цябе араты.
Хлебароб, аддаўшы сілы
Свайму полю-ніве,
Усьміхнецца табе міла,
Што ты урадліва.

* * *

Красуй, збожжа майго краю,
Каб зярно зьлілося
У адплату аратаю
Ў ядрыя калосьсі!
Сонца, з неба шлі праменьні,
Залаці чароўна!
Ў зямлю кінута насеньне
Ўродзіць колас поўны.

* * *

Красуй, збожжа майго краю,
Убірай палеткі!
Хай з табою аратая
Весяляцца дзеткі.
Плён за працу верне ніва—
Ўцешыць думкі, вока,
Як паўныя вазы жніва
Пагрымяць да току.

Вількамір, 1910

# НА ЗЬЕЗД

*Дэпутатам Другога Беларускага*
*Зьезду Саветаў—13-XII—20*

Ад вольных вёсак, з дальных мест,
Дзе векі сумна ўсё маўчала,
Іх прага к творчасьці сабрала
У дзяржаўны Менск на радны зьезд.
　　Разьбіўшы мукі чорных дзён,
　　Ярмо разбурыўшы прыгону,
　　Прышлі яны на вокліч звонны
　　Тварыць краіне свой закон.
Вякі нявольнікі паноў
У глыбі душы сачылі мэту—
Сказаць галосна ўсяму сьвету,
Што край рабочых, мужыкоў
　　Прыжджэ пары, пары тае,
　　Калі надыдзе вызваленьне.
　　Цяпер вось гэтае здарэньне,
　　Цяпер той момант настае.
Хоць ран усіх ня ссохла кроў,
Хоць гной у рэзах ўсё-ж сачыцца,
У муры свабоднае сталіцы
Сышлося соткі пасланцоў.
　　На сойм працоўных, на парад
　　Прышлі яны з рашучым словам—
　　Паставіць вечную аснову
　　Пад родны свой Савецкі лад.

Зьняпаўшы край, край мук, ахвяр
Жыцьцём свабодным мусіць біцца
І ў творчым чыньні мусіць зьліцца
Ў адзін нярэзаны абшар.

Ад вольных вёсак, з дальніх мест,
Страны Савецкай дэпутаты,
Заданьняў колькі непачатых
Рашыць павінен гэты зьезд!

Менск, 12/XII 1920

## ПА ДАРОЗЕ ДА БУДУЧЫНІ

Мы вышлі з гразкае, смуроднае лагчыны,
Дзе нас жыцьцё мінулае трымала,
Ї з ног сваіх страсьлі яго мы парушыну,
Якой яно нам вочы засыпала.

Вякі мінулыя няпраўды і прыгону,
Вякі заможных, князяў і ўладараў
Аддадзены нашаму рашучаму праклёну,
Зьнябыцьцю вечнаму зданы ў ахвяру.

Мы пішам злучнай, зьлітнай братняй грамадою
Людзкой гісторыі вечныя страніцы;
Ї вехі нашы—уперадзе. Гараць яны гвяздою—
Бліскучай, зыркаю, праводнаю зарніцай.

Па мёртвых целах, згубленых на збройным полі,
Ваяк-змаганьнікаў ў часы паўстаньняў,
Наш шлях вядзе да ясных мэтаў сьветлай волі,
Да творчай працы й братняга зьяднаньня.

„Ўставай, хто сьпіць!“ „На бой крывавы!“—гэта
нашы зовы—
Грымучыя, завучыя нязьменна
Уперад, к сонцу, мур жыцьця узводзіць новы,
На землю зьняць з высотаў дзень праменны.

Няма ў разгоне нам прыпынку—й быць ня можа,
Назад глядзець мы больш ня хочам.

Ніхто й нішто к таму ўжо нас не заварожа—
Трухло мінулага ня звабіць вочы.

Дарэмны ўсе стараньні ўпартыя й патугі
Зблудзіць наш рух жывы на бляск абманны.
Ўвясьці у песьні нашы стручаную тугу,
Ўхаваць ў душы к аджыўшаму пашану.

У гімнах нашых пыша радасьць вызваленьня,
Аб вольнай працы ў іх бурляць напевы
Нявольнікаў, парваўшых путы, ў іх натхненьне
І буйны водгук ўспененага гневу.

Чырвоны сьцяг наш шлях паборы усьцілае
Туды, дзе ў гучным грукаце пярунаў,
На зьмен пакоры й дзікіх гвалтаў, заступае
Ўладар жыцьця—Ўсясьветная Комуна.

На бляск яе, на зоў, ад сну нас паўзьнімаўшы,
Мы йдом няўпыннымі, як хвалі мора,
У ёй аднэй мы бачым будучыню нашу,
Аб ёй аднэй няўмоўчна мы гаворым.

Менск, 1922

## НЯ СКРЫЦЬ СУЗОР'ЯЎ ЦЕМНІ НОЧЫ...

Ня скрыць сузор'яў цемні ночы,
Сьлязам вачэй не асьляпіць,
Як ветру часу ня спыніць,
Як дзей наступных не спрарочыць...
І кроў пралітая рабочых,
І кроў пралітая, сялян
Падніме помсты акіян
І змые ўшчэнт варожы стан,
Што к волі пыніць роўны пуць,
Якім працоўныя ідуць.

* * *

Ня скрыць сузор'яў цемні ночы,
Вясны марозу ня спыніць...
Ня доўга будзе лёс бядочы
Жыцьцё краіны крывяніць...
І хоць балюча цяты раны,
Хоць сочыць з іх струменем кроў,—
На жах драпежных варагоў,
Ці позна будзе то, ці рана—
Зрасьцецца край чацьвертаваны
У магутны, згартаваны
Свабоды вечнае захоў.

Смаленск, 22/X 1920

## ПРАЦОЎНІК

Ён жыў прыціснутым к зямлі
І слухаў моўчкі сьвіст савіны,
А думкі чорныя цяклі
Па ўлоньні сьпячае краіны.

Па галах шэрых вузкіх ніў
Саха праводзіла разоры,
І ў іх ён сьлёзы ціха ліў,
І ў іх захоўваў сваё гора.

Зьмяняўся год, ішлі ў чаргу
Зіма, вясна, за летам—восень,
А песьні цяжкую нудзьгу
Лілі, як дождж, з іголак сосен.

Віселі коўдры чорных хмар,
І неба сінь ў сабе хавалі—
Праклёнам нейкім, трутай чар
Імпэт, пазывы дратавалі.

Як вокам мерыў, як пагляд
Празрысты вокал мог лажыцца,—
Візеў на крыжы ён расьпят
І з сэрца сточваў сукравіцу.

Ў павеях ветру, у віхрох
Сягалі стогны і пакута
Па ўсіх закінутых кутках,
Па кнеях сьціснутых і скутых.

Але між гэтым пот і кроў,
Ї стогн, і енк, і мукі жалю
Даўгіх гадоў, цяжкіх вякоў
З сябе адмшчэньне выплаўлялі.

З сакрытых стул, з нябачных шчэл,
Што дзень мінаў—яно ўставала,
Ї сотні душ і сотні цел
Жалезнай сілай гартавала.

Ад шэрай стоптанай зямлі,
Ад потам вылітага долу
Пачаў сягаць да вышыні
Парыў разбуджаны, вясёлы.

Ї з-пад навісшага цямна
Ўсачыў працоўнік бляск далечы
Ды гук падаў: „Вось там яна,
Краіна вольнасьці адвечнай!"

Падаў і рушыў ў грамадзе,
Бы хвалі морам ў подых буры...
Ї грымнуў гром яго падзей
Ды зьняў з жыцьця выраз пануры.

Яно ўсьміхнулася, як дзень
На ўзьмежжы цёмнай доўгай ночы,
Ї краю шлюбны перасьцень
Ї валь адзела падвяночны.

Гартуй-жа сілы, ўстаўшы Сфінкс!
Хай попел вецер вольны сее...
Няволі доўгай рабскі чынш
Зьнялі ўжо рукі Промэтэя.

Ї паліць жар яго агню,
Што з мук гвалтоўных выбіў крэмень
Чырвоны золак таму дню,
Які зганяе ўзьвечны цемень...

Менск, 3-II 1923

## Б. С. С. Р.

*Беларуская Соцыялістычная Савецкая Рэспубліка*

Вякі таілі ЯЕ імя ад народу,
З ЯЕ змывалі назвы спраўднай сьлед
І, душачы яе працоўнікаў свабоду,
Манюю чорнаю заплямвалі прыкмет —
Адбітак ўроджаны працоўнага асвоя,
Што вольнага жыцьця выказываў закон;
І, ў гразь мяшаючы ўсё людзкае сьвятое,
Другім яе здавалі у прыгон.
Магнат крывавы, цёгшы кроў з працоўных масаў,
Душу губіў сібернасьцю прынук,
Драпежнай прагнасьцю няміласна аснашчваў
Сваю ахвяру—як муху ў повуцях павук.
Рабочы, селянін—прыблудаю са сьвету
Нібы знарок прысудны меўся толькі жыць,
Каб працай цяжкаю магнатаву плянэту,
Крывёй каб чорнаю й потам чорным багаціць.
Імя ЯГО і імя той ЗЯМЛІ — РАДЗІМЫ,
Дзе кожны крок абмацвала рука,
Захоўваліся шчыльна радамі усіма
З вачу праглівага—з узроку бедака.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Жыцьцё-ж ішло, цякло няўтрымнаю ракою,
Зьбівала палі тоўстыя, няслося і гуло,
І сілай творчаю, магутнаю сваёю
Ў душы замучанай распальвала сьвятло.

Ў гушчэчы цёмнай схованыя мрэлі знакі
І з кожным днём выяўней цешылі узрок
Таго, хто быў сабе няведаны, ніякі,
Хто лямку цяжкую бяз'іменца валок...
Крануў прымус, збудованы прыгоннаю рукою,
З закутых вуст пачуўся зык, загнаны тлець,
Й агнём пранёсься ён над моўчнай грамадою,
Узьняўшы вочы смутныя сьмялей глядзець.
„Ці-ж можа жыць скітальнік бяспрытульны, бязымённы,
Ці-ж ён аброчаны ў няведаньні канаць?"
Кідала зоў жыцьцё вакол паміж мільёнаў,
Пачаўшы сілы сьпячыя зласьліва абураць.
„Ён ёсьць ўладар зямлі свае, свае радзімы,
Гвалтоўнай сілаю прымушанай губіць
Імя рабочага народу й сваё імя
Й няведнай доўгімі вякамі жыць...
І дзень за днём мацней, бурлівей і магутней
У окліч стройны ўсеахопны выліваўся зоў,
Што з поступам жыцьця зышоў тайком нячутна,
Каб зьліцца потым ў громны огук галасоў;
І раб разгойдаўся вагромністаю гушчай,
Ў бакі хільнуў—і крэпкі ён парваў ланцуг,
І нібы вецер бурны векавою пушчай
Ім стаў абурваць вызвалены дух.
З канца ў канец пранёсься обуд зычным гудам,
З канца ў канец маланка ў сьветлу пранясла
Крыластае: „Цярпець мы больш ня будам
Пагарды цяжкай панска-царскага ярма".
Й агнём апалены, крывавай ўвіты стужкай,
Ўвянчаўшы крыж ад серпу з молатам ўгарэ
Над шляхам ўзьнёс сваім працоўнік беларускі,
Айчыне вольнай назву-імя БЭ, СЭ, СЭ, РЭ.

Менск, 1921

## РАДЗІМА ПРАЦОЎНЫХ

Калісь буржуі і паны
Гразілі нам ў руках з дубінай
Стаяць за цэласьць стараны,
Ахоўваць „мілую“ айчыну.
Айчына-ж то—быў іх спакой,
Было іх шчасьце і багацьце
Й за іх на сьмерць і ў згібны бой
Павінны мы былі зьбірацца,
Бяз хлеба кінуўшы сваіх
Ў хацінцы беднай і убогай
На помач марную „сьвятых“,
На ласку некую ад „бога“.
І дзікай сілай гналі нас
Супроць такіх, як мы, працоўных,
Якіх цкавалі ў гэты час
На нас, бы ворагаў іх кроўных.
І йшлі мы ў бойку, часта йшлі,
Жыцьцё нясучы на ахвяру
Працоўных роднае зямлі,
Але заціснутай, бязтварай;
І гіблі соткі тысяч нас,
Чужых айчыне, яе мэтам—
Каб долі чорнае абраз
Вісеў нярушна па-над сьветам...
Мінуў той час, калі прыгон
Давіў нас сілаю драпежнай,

Судзіў нам лёс, пісаў закон,
Пакорай ціснуў неабмежнай.
Мы бойкай ўпартаю, паўстаньнем,
Пранёсшы мукі ды нязгоды,
Зьвялі на землю панаваньне
Працоўным сьветлую свабоду.
Айчына наша—старана—
Комуны блізкае крыніца,
Гартуе творчы дух яна,
Надзеі ўспальвае зарніцай.
Ці-ж можам мы цяпер ня дбаць
Яе ахову ад нападаў,
Сьцяной жалезнаю ня стаць
Супроць замахаў чорнай здрады?
Чые нутро ня ўчуе зоў—
Прызыўны окліч палкім ўзьлётам
Шчацінай востраю штыхоў
Абняць грамадзкія клапоты?
Ой, не, ня ступіцца ўжо меч,
Ня схіліць нашых роўных плеч
Цяжкая скрутная гадзіна
Барбы за вольную краіну.

Менск, 25/V 1921

## МАЛАДАЯ БЕЛАРУСЬ

Яна ідзе
Магутным цьвёрдым крокам,
Няспыннай сілаю разгону—
Закону
Вечнага развою падухільна.
Ня зьмерыць ходу яе вокам,
Ня згледзець ўзмахаў многамільных!
Яна ідзе,
Варужная кіпучай працай,
Натхненьнем ўзбураная палкім,
Цьвітучая душою і пастацай
Маладымі,
Агнявымі.
Глядзяць яе, як зоры, вочы
Ў прагалак высьветленай ночы,
Ў далечы раньняга сьвітаньня.
Нясьціханна
Калыша вір уздымных рухаў
Завірухай
Гнілы устой упартай цішы...
Яна ідзе,
Агнём пякучым знакі піша
На кожным кроку, што праміне.
І сіла ўжо ніч'я ня спыне
Да векаў скону
Яе рашучага разгону...

Яна ідзе
Ў зялёнай пышнай руні,
Ў развойным шумным веснаходзе,—
Настрэчу царственнай Свабодзе,
У обдым сьветлае Комуны.

Менск, 1923

# ЧЫРВОНАЯ РАДЗІМА

## I

### СЛУЧЧЫНА

Распасьцерлася раўнінаю,
Стройнаю распластталася...
Беларускаю Ўкраінаю
Не здарма ўсё-ж назвалася.

Лугам-поплавам мурожнымі
Полем-нівамі ўроднымі,
Як ядвабам разложаным,
Пазіраеш ты, родная.

Паглядзець скрозь — неасяжная,
Вісьне неба паземамі,
Шмат палеткі твае ўражая
Абсякала рука крэменем.

Йшлі грамадамі нязьлічнымі
Белапанскія коньнікі,
Руйнавалі нашчэнт, нішчылі
Хаты, поле і хвойнікі.

Дымам-полымем курылася
Праца цяжкая, чорная!
За свабоду шчыра білася
Вёска скрозь — непакорная.

І крывавую мяжынаю,
І крывавую істужкаю,
Пан граніцу ды раўнінаю
Пралажыў наўсьцяж Слуцкаю.

„Не загоіцца, не, шарая,
Беларусь бальшавіцкая;
Пакараў яе бог карамі
За бунтоўнасьць мужыцкую".

Гэтак думалі, так радзілі,
Але думка — дарэмная!
Зноў адыме, што пакрадзена,
Наша Случчына зрэбная.

Працай цяжкаю сялянскаю,
Працай ўпартаю — рабочаю,
Яна гоіць зьдзекі панскія,
Выжывае аброчанасьць.

Ўся садамі поўна, бэрамі,
Поўна жытам, пшаніцаю,
У наступнае йдзе з вераю,
Б'е адвага крыніцаю.
Не загіне, ды ня вечнае —
Што ўрэзана адлучана.
Будуць, будуць яшчэ зьлечаны
Беларусь і ты, Случчына.

Слуцак, 18/II 1925

## II

### СЛУЦАК

Прытуліўся, прылёг пад садамі,
Новых дзён—ды вякамі ждучы.
А цяпер вось старымі дамамі
Мову іншую кажа Случы.
Ад князёў, ад паноў, ад няволі
Успаміны—гіньце ў пустэчы!
Не, ня будзе, ня будзе ўжо болей
Аб пары тэй ягонае рэчы.
Над будынкамі шэрымі сьцягі
Сьвету новаму значаць—цуды;
Разьлятаюцца пекныя сагі,
Звоніць гімн працоўнаму люду.
Ядранее, як лес, жыта ціха,
Нахіліла калосьсе удала...
Старадаўняя можа ткачыха
Вызваленьне працоўным прыткала?
Хай гудзяць 'шчэ званы на званіцах
І спакусаю крыж у вочы;
Марсэльезе ўжо ня зглушыцца,
Марсэльезе ужо ня змоўчаць.
Ад усходу на захад далёкі
Яе вокліч звоніць завуча:
Сустракай, Слуцак, новыя векі,
Шумі радасьней рэчкай Случчу.

22/III 1925

### III

### КАПЫЛЬ

З сівых вякоў выглядае даўнасьць:
Замчышча, роў, курганы...
Ў казках-байках туманная слаўнасьць
Дзеяў яго старыны...
Вёрсты адгону, межы-дарогі
Мералі гала-абшар;
Сэрца ня чула дбалай трывогі,
Жыцьце ня мела ахвяр...
Праўда таму, ці мо‘ дымная здань?
— Байкі ўсё гэта чыесь...
Ведама, ведама добра, што пан
Цёнгля меў муштры свае.
Меў тую дзікасьць, якую посьле
Доўгія векі ўжываў;
Долю пакутную едкаю бросьняй,
Долю яго спавіваў.
Ведама, замчышча князя-пана—
Гэта быў страшны куток!
Плён свае працы ў яго сяляне
Доўга насілі ў аброк.
Сьлесара браклі ў крыві мазолі,
Мучыла боль катляра.
Колькі пагарды, зьдзеку, няволі
Несьлі князём да двара!..
Белыя коні пекнае княжны—
Чорная праца сялян.

Чуе-чуе андарак сярмяжны
Болі старых капылян.
Нёс свае хвалі бурлівы Нёман,
Мыў замкавы сьцены ён.
Ліпы-ж нашэптвалі: будзе зломан,
Будзе, ой, зломан прыгон...
Капля за капляй точаць каменьні,
Іскра разводзіць пажар...
Колькі свабодзе ўжо пакаленьні
Колькі прынесьлі ахвяр!
Ўгору высока расьлі магілы,—
Нёман у бок пахіліў,
Покуль над сівым буйным Капылем
Волю вяшчун пратрубіў.
Дымам на лес сухастой спусьціўся
Блутнае байкі павер...
Яў прыгажэйшы яе нарадзіўся,
Яў, які бачым цяпер.
Ў Янкавым лесе хвоі шапочуць
Новаму часу напеў...
Ўзрокам як зьмерыць, ня бачаць вочы,
Дзе-бы палац забялеў.
Роўнымі стужкамі поле-нівы,
Ворыва, сеўба, жніво...
Плёны ад працы ратай руплівы
Звозіць сабе у гумно.
Едзеш дарогай—пан не староніць—
Проста, хай курыцца пыл!
Чуе ўсё-ж, чуе і добра помніць
Горкую праўду Капыль.
Помніць ён: вось канчаецца поле —
Ранай крывавай мяжа;
Там-жа, там за ёю—няволя,
Панскага зьдзеку цяжар.
Топчуць капыты ніву-збажыну,
Рэжуць сялянскі загон.

Мараць дашчэнту зьнішчыць краіну,
Тую, што наша спакон.
Помніць Капыль, і поўны трывогі
Ўголас пытае: калі
Зьвяжуць суцэльна шляхі-дарогі
Часткі парванай зямлі?
Покуль-жа будуць з гэтым гадзіцца
Родныя Слонім, Нясьвіж?
Ціха, нядоўга! Можна дзівіцца—
Промін чырвоны імжыць.
Паліць ён, паліць краты-завесы,
Туліць ён... чорную быль...
Скора руку працягне на крэсы,
Грозную руку, Капыль...
Мые-мые граніцу рэчка Мажа,
Рэжа, як грунт капачы...
Час прадраканьні добрыя кажа...
Хто ў іх ня верыць, ждучы?
З сівых вякоў выглядае даўнасьць,
Нікне на сьветлай мяжы...
Беражы, беражы, Капыль, дбайнасьць,
Волю сваю беражы!

Менск, 22/VII 1927

## БЕЛАРУСКА

Як ідзе—
Шнур кладзе
Лёгкае хады.
Роўны стан
Увабран
Стужкаю ўсягды.
Сьвежы жар
Крые твар—
Сьвеціцца пагляд.
Валасы
Ў дзьве касы
Спушчаны назад.
Паглядзіць—
Адарыць,
Сэрца ўскалыхне.
Падыйсьці
Ў пачуцьці
Да яе кожны мкне.
У руках
Рэзвы мах,
Праца, як гульня.
Ці з сярпом,
Ці з цапом—
Ўсё пяе яна.
Ні жуды,
Ні нуды
Ў песьнях ня чуваць.

Сонца, квет,
Цэлы сьвет
Рада-б абнімаць.
Кожын верць
Паглядзець—
Погін каласоў.
Сіла, рух,
Вольны дух
З поля ды лясоў.
Хто маляр
Яе чар,
Строю, пекнаты?
Край з вякоў
Ніў, лясоў
Беларусь—то ты!

Капыль, 16/VI 1923

# УРАЧЫСТАСЬЦЬ РЭВОЛЮЦЫІ

## Я ЖЫВУ...

Я жыву таму, што маю
Веру моцную у тое,
Што загіне доля злая,
Чорнай сілаю якая
Землю вокал аблягае,
Бы жалезнаю рукою.
Я жыву таму, што сэрца
Спадзеў ясных ня губляе,
Як улетку лісьцяў дрэўцы,
І ў надзеях, бы праз дзьверцы,
Наглядае спацар сьмерці,
Што нядолю скрозь зьнішчае.
Я жыву таму, што чую
Душой чулаю адроду,
Тую пору, хвілю тую,
Баганосную, сьвятую,
Што нясе ў сьвет дарагую
Сьветазарную Свабоду.
Я жыву таму, што бачу
Панаваньне лепшай долі,
Дзе ня будзе хутка плачу,
За якую й я даў дачу,
Што адроду прыназначыў
На крывавым збройным полі
Ў барацьбе за шчасьце й волю.

Смаленск, 1920

## ГОДЗЕ!

Доўга гнулі свае сьпіны,
Доўга пот мы свой лілі
Ля фабрычнае машыны
І ля панскае зямлі.
Паднявольна мы маўчалі
Паслухмянымі ўсягды,
Другіх вечна збагачалі,
Ня вылазячы з бяды.
Доўга-доўга, але потым
Гром свабоды абудзіў
Нас ад цяжарнае слоты
І да бойкі даў прызыў.
Сіла спаўшая паўстала,
Волі промень стаў міргаць
І сям'я працоўных стала
Жыцьцем краю кіраваць...
Гэй, дарогу! Ўзрокі ўгору!
Сіле творчай вольны ход!
Хто дагэтуль жыў ў пакоры
Хто ля іншых ліў свой пот,—
Прышоў жыцьця адбудову
Неадкладную рабіць!
Устрой вольны, устрой новы
Пад хундамант залажыць!
Дзе ліліся пот з крывёю,
Дзе стаяў працоўных стон,

Над свабоднаю зямлёю
Пераможны ўдарыў звон.
    І зьнямелі злыя сілы,
    І заціх іх дзікі рух! —
    Сонца вокал засьвяціла,
    Творчы пэнт паўстаў наўкруг.
Сьвет адчынен людзям новым,
Будаўнічым маладым,—
Для вялікае будовы
Жыцьце шлях адкрыла ім!

Менск, 1921

## ЧЫРВОНЫ МАК

Чырвоны мак пылае у гародзе
І, к сонцу звонікі працёгшы,
У сэрцы сподзеў сьветлы родзе
Ў таго, хто духам занямогшы.
Чырвоны мак, пасаджаны на градах,
З зямлі выносіць чырвань кроўны
Людзкіх, праліўшых кроў грамадаў
Ў прыгон цяжкі, многавякоўны.
Чырвоны мак—чырвоная надзея,
Красу наступных дзён мулюе,
Жывым штандарам пламянее
Прад тым, хто к гэтым днём кіруе.
Чырвоны мак—нязьменная расьліна—
Абойме кветам яркім, чыстым
Свабоды вечную айчыну
Ў нястухным сонцы, прамяністым.
Чырвоны мак пылае у гародзе
І, к сонцу звонікі працёгшы,
Заве ўсіх к Сонцу ды к Свабодзе,
Хто сьпіць, няволі 'шчэ ня змогшы.

Менск, 1921

## РАСЬСЬВІТАНЬНЕ

Над гаем зьвіс чырвоны полаг
І ўбраў адзеньнем надзвычайным
Абшары вольныя вакола.
Падняўся сьпеў і гоман раньні
На ўзвышшы дрэў, ў кустох, у жыце,
—Устаньце, йдзіце!
Пранёсься зоў трубы галоснай
Да хат панурых, фабрык шумных
І рух развойны,
І вокліч моцны,
Людзей устаўшых
І гоман ўзьняўшых
З пяяньнем птушак шчыльна зьліўся.
А промень палы
Па-над галам
Пекным, дзіўным,
Рэўлюцыйным
Сьцягам вольнасьці спусьціўся.

Менск, 13/V 1921

## ГАДАВІНЫ 25 КАСТРЫЧНІКА 1917 г.

Абляцеў поўны круг
Сонца вечнага ход,
Скончыў бурны свой рух
Рэволюцыі год.
Пад кіпучым чуцьцём
Прагучэў зоўны ўдыр,
І мільённым гуртом
Працаўнік багатыр
Размахнуў навакол
Колькі меў у сабе сіл,
Й неба высь, й зямлі дол
Ўзялі новы пахіл.
На мяжы раздарог
Ўстаў, пячатку адбіў:
„Гэтта будзе парог
Тых вялікіх зьяў-дзіў,
Што працоўны народ
Палажыў імі лік
Новым часам!" і год
Рэволюцыі узьнік.
Струхлы выраз вякоў
Над гвалтоўным гняцьцём.
Ў глыб бяздонны зышоў
Перад новым жыцьцём.
І на постаць зямлі
На свабодны прастор

З неба промень зьлілі
Сотні, тысячы зор.
    Закіпеў-загучэў
    Абудзіцельны рух
    Там, дзе ў шчылінках мрэў
    Днёў канаючых дух.
Ў творчым віры жыцьця
Ён будынак узьвёў
Волі вольнай, быцьця,
Ўчорых мар, ўчорых сноў.
    Дні за днямі ішлі,
    Мацавалі хадой
    На свабоднай зямлі
    Соцыяльны устрой.
І цяпер паглядзець—
Сэрца пыша агнём!
Якім гмахам расьце
Маладое зярнё!
    Па руцянай сяўбе
    Пламяніся, усход!
    Я вітаю цябе,
    Рэволюцыі год!

Масква, 1918

## НАРАДЖЭНЬНЕ

### I

### ШЛЯХ

Пісах празрыстай бліскавіцы
Разрэзаў цемні небасхілу
І гром прамчаўся з навальніцай,
Магутнай жыўнай сілы.
Ў нямерным сполаху вакола
Абшар зямлёвы затрусіўся,
Віхор завыў, задміў па долу
І ў даль з трывогай пакаціўся.
Здалёк, з праменнага туману
Пачуўся водгук ўстаўшай буры,
І лес, вякамі нясхіляны,
Схінуў карону к нізу, хмуры...
Так гібне вокал без спагады,
Пад віхраў згібных завываньне,
Сіберны век людзкое здрады,
Часы няволі панаваньня.
Так ў сьвет з трывогаю абуднай
У прам'і бліскавіц, у грому,
Свабода ў бляску яркім, цудным
Сыходзіць ўзьмен прыгону злому.

## II

### РАЗЬЛІЎ

Шырыцца промінам, бляскам расьце,
Вогнішчам зыркім палае,
Іскры вакол раскідае,
Ў змрочных кутох, ў цемнаце;
Духам чароўным зьнішчае пакор—
Гэту нявольнічу хворасьць—
Ў сэрцы раняе бадзёрасьць
Рвацца з турмы на прастор.
Рве ланцугі, што скаваў іх прыгон,
Глушыць нядолю, стагнаньне,
К помсьце за мукі, к паўстаньню
Вокал гучыць яе звон.
Й там, дзе зароніць яскравы прамень
Й там, дзе прайдуць яе крокі!
Змрок непраглядны глыбокі
Ў міг абяртаецца ў дзень...
Ў бляску маланак, у груку пярунаў
Гінуць да волі прашкоды...
Гэтак для сьвету Свабода
Людзям раджае Комуну!

III

## ПАЗЫЎ

З павіслых склонаў небасхілу
На ўступы роўныя разлогаў
Сплылі праменьні й апалілі
Абшары вокал і дарогі.
    Па ўзьвівах вузенькіх сьцяжынак,
    Прабітых босаю ступою,
    Пукі палаючых іскрынак
    Пабеглі хуткаю ракою.
І ўсе куткі і ўсе прытулкі
Сьвятлом палаючым абмылі,
Ўзбудзіўшы пэнт жыцьцёвы, гулкі,
Узьняўшы рух людзкі на крыльлі.
    Ў празрыстым вобліку паветра,
    Бы ў люстры, чырвань заіграла,
    Што з кроўю згубленаю ў нетра
    Зямля халодная ўбірала.
І вострасьць тонкая праменьняў
Хапіла каплі для укола,
Й людзкія душы, іх цярпеньне
Наскрозь рашуча пракалола.

Менск, 20/IV 1921

## IV

### ПАЎСТАНЬНЕ

Над сьветам рэе Сьцяг Чырвоны,
Вакол ўздымаючы паўстаньне
Супроць вяковага прыгону,
Супроць няволі панаваньня.
Кіпучай хваляю, бурлівай
Маўчлівы гнеў людзкі рухае,
Шырокі шлях да мэт шчасьлівых
Агнёвай помстай пракладае.
Пакорны раб ўстае да бою,
Рвучы вакол свае аковы,
І ўжо вітае над зямлёю
Жыцьця уклад свабодны, новы.
Глыбокай ночы гінуць стоны,
І сьвет стары пры тым канае.
А Сьцяг паборы, Сьцяг Чырвоны,
Дарогу новаму ўбірае.
Настрэчу-ж, гэй, яго прыходу
Нясеце шчырае вітаньне,
Няхай вакола за Свабоду
Расьце кіпучае паўстаньне!

Менск, 1921

## РАНЬШ І ЦЯПЕР

Сякеру, молат, серп і плуг
Нам доля з роду даручыла,
За працай цяжкай крэп наш рух,
Расла за працай наша сіла.
Ад золку к цёмнаму, ў працяг
Сяклі мы, гваздалі й аралі,—
Ў крывавым поце ды ў сьлязах
Сваіх тыранаў збагачалі.
Ад працы нашай сьвет паўнеў,
Таміўся, здэцца, ад багацьця,
Хто смачна піў, хто смачна еў,
Хто жыў у роскашы, ў палацах—
Той быў павінен толькі нам,
Ад нас залежаў той ад роду...
А нам, працоўнікам, майстрам
Ня мецъ было й на міг свабоды...
Нуда і голад, недахват,
Нядоля й зьдзекі ў цесным сплёту,
Вянчалі працы наш пасад,
Прыгонам гналі на работу.
І мы рабілі... Ці-ж цяпер,
Калі свабодная краіна,
Патухне палкі наш намер
К рабоце ўпартай ды няўпыннай?
Ці мы ня знойдзем сьвежых сіл,
Старэньняў новых не дастанем?

І наш магутны творчы ўздым
Свабодным духам не ап'янім?
О, не, бурляць ужо ў душы
Пазыў, імкненьні ды ахвота
Стальной колёнаю рушыць
На адбудоўчую работу.
Сякера, молат, серп і плуг
Ў руках свабоднага ня тое,
Чым раньш тамілі гарды дух,
Ды цела ранілі худое.
Наш кожны ўзмах, наш кожны стук,
І ў ніве кожная разора,—
Ў жыцьці працоўных меней мук,
Жыцьцю свабоднаму падпора.
Дзе будзе праца наша йсьці,—
Адна служыцьме нам дарука
Нядолю цяжкую зьвясьці,
Паставіць крыж над цяжкай мукай.
За працу-ж ўсе! К зямлі, ў завод,
Размах яе шырэй раскіньма,
Комуны хай яна прыход
Кіпучай творчасьцю абдыме.

Менск, 11/І 1921

## СЕЛЬСКІ РЭЎКОМ

Найлепшы ў вёсцы цэлай дом,
Нібы знарок, стаіць здалёку,
Вакол абнесены садком,
Каб цешыць станам сваім вока.
Над стрэхай жоўтаю вісіць
Чырвоны сьцяг і дні і ночы.
І пры ваходзе паглядзіць
Яго вясковец ды рабочы.
Ад ранку к вечару ў той дом
З усіх канцоў шнуруюць людзі,
Пытацца рады аба ўсём,
Адказ знаходзіць ў перасудах.
Паёк, раскладка,—дроў насеч—
На ўсё тут знойдзеш тлумачэньне.
І цэлы дзень гудзе ў ім рэч
І цэлы дзень к яму імкненьне.
У сьвітках шэрых, ў кажухох,
Відаць, начальства шпацыруе,
Дае адказы па бакох,
Прашэньні піша і дыхтуе;
Тлумачыць пільна, як каму
Якую можна мець падмогу,
Прыслухна, міла к усяму,
Ня крыўдзіць й каліва нікога.
І ўсё так простасьцю нясе,
Свабодным духам вокал вее,

Народ, яго начальства, ўсе,
Што ў гэтым доме ўкол віднее.
Пад сьцягам, зьвіслым над страхой,
Над лепшым ў вёсцы цэлай домам,
Комуны час куе сабой
Работа сельскага рэўкому.

Менск, 3/III 1921

## ШЛЯХ ПАЎСТАЎШЫХ

З вякоў даўгіх пранесеныя мукі,
Людзёў працоўных пад прынукай—
Зямлю сьлязамі чыста змылі
І кроўю спрэс пачырванілі,
Як леза склюду ката руку.

На глебе тэй, аздобленай крывёю,
Ўзрасло ядрана-буйна маладое
Агнём апаленае мкненьне
Да помсты гардай за глумленьне
Над жыцьцятворчай грамадою.

А промень сонца зыркага, што зьзяла
І кроў пралітую ў сябе ўбірала,
Сышоў к зямлі чырвонай муляй,
Якой палотны спаласнулісь
Для сьцягаў тых, што ўстаўшыя паднялі.

І там, дзе лужы з сьлёз вакол віднелі—
Зямлі слаі, бы камень, здрацьвянелі,
Падставу цьвёрдую заклаўшы
Пуціне той, якой пастаўшы
Працоўны йдзе настрэчу цэлі,
Комунай зорнай засіяўшай.

Менск, 21/VII 1921

## ГЛЯДЖУ НА ПОЛЕ Я...

Гляджу на поле я, на дол,
На нівы вузкія шнурамі,
Што скрозь ляжаць перад вачамі
Раўнінай чорнаю вакол—
І сэрца радасьцю гарыць,
Душа жаданьнямі адзета—
Прасторы ўсе, што ўбачыш гэтта,
Абшар увесь, што тут ляжыць—
То плён упартай барацьбы,
Дастатак цяжкага змаганьня,
Якім валодаюць сяляне,
Нядаўна бедныя рабы.
Вякамі марылі яны
Дажыць тае шчасьлівай хвілі,
Калі-б падаткі не давілі,
Калі-б драпежныя паны
Іх працай цяжкай не гнялі-б
На трэбах цяглага прыгону,
Даючы ім заглушваць стоны
У сьцянах пануранах сяліб.
Ой, колькі-б—марылася ім—
Яны ўкладалі-бы стараньня,
Каб ўся зямля—то дастаяньне
Была-б працоўнікам усім...
Цяпер вось мары у жыцьці!
Зямля—дзяржаўнае багацьце...

Пахайце-ж гэй, яе вы, брацьця,
Пасеў вялікі багаціць.
    Няхай парэжа востры плуг
    Абшары гэты на разоры,
    І збожжа ядрае, бы мора,
    Ўсхвалюе ветрыкам наўкруг.
За працу-ж ўсе, ўжо час насьпеў!
Зямля вызьвеўшая чакае,
Калі над ёю залунае
Вясны вялікай ваш пасеў!

Менск, 23/III 1921

## ДА СОНЦА!

Дзе быў пустыр, дзе рос палын,
Дзе ветры сіверу стагналі,
І шыр прывольную раўнін
Туманам змрокі адзявалі,—

Дзе енк цяжарнае жальбы
Народу змучанага чуўся,—
Ў вагні вялікай барацьбы
Ўстаў край — Савецкай Беларусі.

З глыбін абуджанай душы,
Бы з буйна вірнае крыніцы,
К жыццю свабоднаму рушыў
Імпэт працоўных бліскавіцай.

Кіпіць, хвалюе ды раве
Уздым адноўленай радзімы
І к чыньню вечнаму заве
Працоўных строй непабядзімы;

Прад ім расчынены прастор
На постаць вызьвеўшае нівы;
І яснасьць сонца й пекнасьць зор,
І бег жаролцаў гаманлівых,

Дубоў вяковых сплёт карон,
І шыр нязьмераных абшараў —

Схінулі шчыра нізкі ўклон,
Яму, як жыцьця гаспадару.

Стальною цьвёрдаю ступой —
Ён к мэтам зблiжаным кіруе
І жыцьце поўнае красой
Сабе й радзіме ён будуе.

Менск, 24/VIII 1924

## БУДАВАНЬНЕ

То ня вецер у пушчы гудзе
То ня хвалі на моры бушуюць —
То грамады працоўных людзей
Сабе лепшую долю будуюць.
Ўкол руйнуюцца ўцiску муры
Ападаюць жалезныя краты;
Дні прыгонныя цяжкай пары
Адыходзяць у вечныя страты.
А сьлядамі Комуна ідзе,
Панаваньне навекі будуе...
І жыцьцё, нібы пушча, гудзе
І жыцьцё, нібы мора, бушуе.

Менск, 12/VI 1921

# РОЖА

Ў саду ірдзіцца чырвань рожы
І сад зялёны па-над ёю
Сваёю рутнаю шатою
Уклоны ветлыя ёй ложыць.
    Лісты шапочуць, як павее
    Нячутны ветрык з вольных ніў:
    „Як дзіўна, рожа, чырванееш,
    Бы кроўю хто цябе наліў“.
А рожа гоман лісьця чуе
І шэпт адказны падае:
„Ў адзежы вогненай маей
Сапраўды кроў ваяк існуе.
    У доўгай бойцы іх мільёны,
    Пасьцёкшы кроўю, паляглі,
    А я кроў выссала з зямлі
    Сабе на колер на чырвоны.
І новы цуг ваяк прыходзіць
Братом пагінуўшым на зьмен,
З маёю кветкаю узводзіць
Комуны сьветлай вечны дзень“.

Менск, 1921

## ВЕЧНАЕ

Ўперадзе сьвецяць агні—
Лашчаць праглівыя ўзрокі,
Надзяць!
Чорныя цяжкія дні
Дзесьці далёка-далёка
Ўзадзе.
Думак рашучых пласты
Скрэплены кроўю, жалезам
Зьвіты.
Сочаць руінай масты,
Шлях да ўзвароту адрэзан—
Квіта!
Стальлю расплаўленай гмах
Скрэпім. Палкія душы—
Гартам.
Хто перапыніць наш шаг,
Толькі паходняю рушым
Ўпарта?
Сілы ўжо гэткай няма,
Радаў ніякіх ня стане—
Годзе!
Ў сьвеце грамада сама
Волю ў жыцьці-акіяне
Родзіць.
Полымем зыркіх агнёў
Ў далі блакітныя мкненьні—
Стрэлам.

Шэраг наступных вякоў
Сьветлай Комуны квяценьнем
Ўбелім.
Чорныя, нудныя дні
Цемрывам вечным паталі
Ў нетры...
Вышай, уздымней грымі,
Гімн Інтэрнацыяналу,
Крэпні!

Менск, 12/XII 1923

## ХТО МЫ?

Мы—сыны
Новых дзён!
Мы пракокі—ваякі за волю.
Пяруны
З бліскавіцамі значаць наш шлях
Ад нядолі мінуўшых вякоў
На чырвоны лунаючы сьцяг
Усясьветнай Комуны.
Нас вядзе
Да яе нястухаючы імпэт адвагі,
Як пяўца—слухаць гучныя струны
Няўміраючай сагі,
Як сьцярпеўшага мукі ад смагі—
К вадзе.
Цьвёрды грунт
Нам вабіла па шляху цярпеньне;
Дакранемся нагамі — ўлягае каменьне,
Ночы змрок разьлятаецца чорны,
І гуляе пrасторны
Вялікі, упорны
Наш бунт.
Дзе відаць,
Дзе стаяць
Векавыя устоі няволі,
Дзе яе уміраюць ахвяры,—
Туды шлём

Буру й гром!
Без спагады-патолі
Аддаем мы заслужныя кары!
        Мы—сыны
        Новых дзён!
Сьветлай долі працоўным—тварцы.
Мы Ўсясьветнай Комуны ганцы —
            Вястуны!

Менск, 9/V 1923

## БУДАВАНЬНЕ

Зьлітна, згушчана, зьяднана,
Як цамэнтам, прагным пэнтам
Да змаганьня,
Будаваньня
Скалыхнулася грамада
Промэтэем —
Вяліканам!
І кранула
З громам, гулам,
Нястрыманым
Вадаспадам,
Паднялася
Пяруновай агнявеяй!
І ўздыбіла
Перад намі
Прытаёнае вякамі —
Трохвярстовымі хібамі
Хваль узбуранае мора...
Вочы ўгору!
Гучней стукі!
Зьлітна, згушчана, зьяднана
Пад націскам вялікана
Стогне-рвецца слой цалінны
Векавечнае дзярніны
Загартованым нарогам...
І грымоча бурна, строга

Раскалыханай грамады
Падлятаючае рэха
Волятворчага пасьпеху.
Непарухныя пасады
Нікнуць, гінуць, прападаюць...
Толькі вогнішчам палаюць
Разгарачаныя вочы!
        Ды ляскоча
Молат важкі сілай грому...
        І сьмяюцца маладому
        Аднаўленьню,
        Будаваньню
Сонца яснага праменьні
Й зор бліскучае мірганьне.

23/IV 1923

## КОМУНАР

У задуме строгай яго твар,
У ваччу празрыстыя узрокі;
У руках жалеза, з сталі крокі,
Гартуе сэрца палкі жар.
Агонь гармат і візаг куль
Падцьмілі крэпкую загару,
Ўлілі у сэрца комунару
Надзеі цьвёрдай яснасьць муль;
У поступ ўвераны ўлілі
Цамэнтнай цьвёрдасьці—паходы
На бойку з ворагам Свабоды
Радзімай вольнае зямлі.
І повен ўвесь адвагі ён,
І дышуць грудзі яго верай;
Ў хвіліны ўтомы, ў момант шэры,
Ад слоў яго ідзе агонь.
Далёкі шлях і цяжкі пуць
К Комуне вечнай панаваньню
Яго ня страшыць ані званьня —
Й назад ня ў сілах павярнуць.
Упарты крок пад цемню хмар
Ступае гарда ў яснасьць даляў,
І ўступ яго — як выбух хваляў
Што будзяць сьцішаны абшар.

Менск, 13/V 1924

## ЧАТЫРЫ

Адзін, другі... чатыры, як адзін,
Мігнулі яснай, выркай бліскавіцай.
І час жыцьця — гісторык паладзін —
Ізноў чатыры новыя страніцы
Гістор'і краю ўзад перагарнуў.

І ў нудным шэрагу яе пісьма,
Што тая ўсё-ж рука павывадзіла,
Страніцы гэтыя, бы кроў-тасьма,
Эпоху новую сабой адкрылі,
Якой дасюль ніхто ня бачыў і ня чуў.

Народ працоўны доўгія вякі,
Няволю нянчачы сваю і краю,
Размахам пруткім цьвёрдае рукі
На іх сваю свабоду адбівае —
Будуе жыцьця казку дзіўную, як сон.

Няхай прышлец ад будучых гадоў,
К жыцьцю свайму цярэбячы дарогу,
Даткне узрок свой да радкоў
Ужо яму мінулага, былога
І ўгледзіць вобраз чыннасьці прай-
шоўшых дзён.

Ён ўгледзіць ўсё, бо ставуць перад ім
Агнёвай, бурнай, зьлітнай чарадою
Здарэньні тыя, што быцьцём сваім
Краіну спаўшую вялі к развою,
Да волі променнай працоўнікаў вялі.

Крывёй аблітая, як жар, чырвонь,
Гады-страніцы бурай гартавала,
Праз зыркі ўсьпенены агонь
Радзіны сьветлыя перапускала
Савецкай вольнай Беларускае зямлі.

Адзін, другі... чатыры, як адзін,
Ужо здалёк гаворыць гучным яхам:
Глыбі, краіна, волі свае плынь,
Ляці к Комуне рэзвым птахам!

Менск, 29/XII 1922

## ДЭЛЕГАТКА

Дэлегаткай вясковаю? —
Чаму-ж не — сход намечвае!
Трэба йсьці жыцьцю новаму,
Трэба йсьці насустрач яму!

Прыкрапіліся цёмныя
Да кудзелі, да кужалю,
Век сядзелі бязмоўнымі,
У бядоце нядужалі.

Да політыкі — дзе табе!
Гэта рэч — не жаночая.
Толькі з кухняю, з дзеткамі,
Толькі к хаце прыўрочана.

Зацірала натужная
Мізгатня кожнадзённая;
Вазганіна лапцюжная,
Калатніна суконная...

А цяпер, годзе, будзе ўжо!
На пуціну шырокую
Стаць кабеціне суджана...
Покуль быць збоку ёй?

Што цярпела — ня здарма то,
Крэпла ўсё-ж пераконаньне...

Рэволюц'я пажарамі
Папаліла спаконнае.

Рачаіснасьцю новаю
Час пуціну адмечвае...
Дэлегаткай вясковаю?—
Мне адказвацца нечага!

Менск, 1924

## ДАПРЫЗЫЎНІКІ

Сьпеў галосны раньнім-раньнем
Перагудамі гудзе
Пра паўстаньне, пра паўстаньне
Заняволеных людзей.

Вулкай роўнай шэраг стройны,
Акрыляюць сотні рук;
Прыціскае поступ войны
Пад дажджом размыты брук.

На пажары, на усходнім
Хібам бочацца штыхі;
Пацінаюцца лагодна
Хмар калматыя вярхі.

Рознастайныя калёры
Сьвітак шэрых, кажухоў
Абвіваюць пераборы
Галасістых галасоў.

Далей-далей, на спатканьне
Ждучым зьявам іх паход.
Сьпеў галосны раньнім-раньнем
П'е палаючы усход.

З шэрых вёсак, з хатак курных
Дапрызыўнікі прайшлі.
З палкай верай, з думкай бурнай
Кліч прызыўны пранясьлі.

Урэчча, 1925

## СЕЛЬСКІ МІТЫНГ

Запоўнены стадол, як яблыку упасьці,—
Грамада прагная варушыцца, шуміць;
Пытаньне носіцца вакола, а што ўдасца...
Што будуць тут прамоўцы гаварыць?

Ці ўловіць што настроенае пільна вуха
У прамовах тых, што мусяць скора пачынаць?
Што скажуць скліканым аб сконе галадухі,
Аб праднalogу, аб рэволюцыйным руху

За межамі, аб тым, як землю падзяліць?
Мо' новых йшчэ навін паслухаці пазвалі —
Пара-ж бурлівая і віхрам ходзіць сьвет,
Авось цару якому голаў абламалі,

А ўладу краем пераняў сабе савет.
Мо' трэба ружжа браць і йсьці сваю краіну
Ад новых варажных нападаў бараніць?..
Напэўна будзе нейкая асобная навіна —
Ня здарма-ж сход, як мора бурнае, кіпіць...

Ня здарма гушча прагная жаданьнем палкім дыша
І сотні йграючых маланкаю вачоў
Кідаюць бліскамі праглівымі туды, к узвышшу,
Адкуль к ім сыпне зараз дождж завучых слоў.

„Пашоў, вунь-вунь, як быццам ён!“—прайшло
стадолам,
І потым раптам зьнік той зычны медны гуд...
Й сьціша глыбокая, нярушная вакола,
Скавала жданьнем гострым мітынговы люд.

„Браты-таварышы! Сюды вас ўлада пасклікала!“
Прамоўца голасна людзям пачаў казаць:
„Краіну вольную, што панства разбурала,
Павінны мы сумесна, разам аднаўляць“...

стройна з вуст прамоўцы словы палкія прызыву,
Бы іскры зыркія, разносяцца наўкруг;
І зноў стадол, прыўцішаны, прытоены, маўчлівы—
Ўшчынае гуць пад рупны, выбухнуўшы рух...

І ў гудзе тым клякоча помста тысячнай грамады
Да тых, каму ўспадзе на думкі йшчэ калі
Падняць руку узбройную сваю ці меч панаду
Зрушаць аднову роднай, вольнае зямлі.

Менск, 29/X 1922

## ДЭМОНСТРАЦЫЯ

Адзін, другі, дзесятак будзе
Чырвоных сьцягаў з надпісамі,
Лунаюць ўповерсе, дзе людзі
Йдуць вёскай стройнымі радамі.

Ў сярмягах, ў лапцях, ў белых сьвітках.
Старыя, юныя й кабеты,
Парадкам, чынна, нібы ў зьвітках,
Вясёлым настраем адзеты.

З адкрытых губ нясуцца зыкі
Галоснай трэльлю, стройна, ўдала:
„Вакол абдыме сьвет вялікі
Чырвонь Інтэрнацыянала.

Паўстануць сьпячыя к змаганьню,
Парваўшы скрэпы злой няволі
І будзе вечна панаваньне
Па ўсёй зямлі шчасьлівай долі“.

Пяюць, і здэцца, ў песьню душы
Яны ад радасьці ўкладаюць,
Клапоты буднічныя глушаць,
Чуцьцё самотнае зганяюць.

Абданы скрозь адным пазывам,
Які ўсіх лучыць і гуртуе
І прагу ў сэрцах к днём шчасьлівым
З адвагай крэпкай ў іх гатуе.

З канца ў канец сяла, сьвятошня
Ідуць яны сягоньня к пляцу
Ваякам згібшым дань апошню
Аддаць натхненнай дэмонстрац'яй.

Менск, 16/XII 1920

## РАБФАКАВЕЦ-ВЯСКОВЕЦ

Ў вакно маленькае імжыць
Сьвятло пахмурнае надворку,
І шарым выглядам глядзіць
Сырая цесная каморка.

Нясе смуродам цьвіль і плесень,—
Астыўшы печ ўжо тыдняў з пяць,
Пацёкаў брудных вільжны дэсень
Выводзіць рэзную пячаць.

Прамозглы дух—калеюць рукі,
Здаецца к печы-б прытуліць...
Нялёгка мудрыя навукі
Ў жыцьці часамі прыдабыць.

Ня раз, ня два ўстаюць пытаньні,
Ці хопе сілы дацягнуць?
І млосна-цяжка разам стане,
І дні, як месяцы, паўзуць.

Ў ваччу пярэсьцяцца радкі,
Ня йдзе у голаў сэнс таемны,
Кіўком павабнае рукі
Утома знак дае прыемны—

Пайсьці за ёй—вярнуць назад,
Закінуць цягу к ведам-знаньню.
О, не! Цярпець лепш буду ў
дзесяць крат,
А ўсё-ж дайду свайго жаданьня.

Зьнясу агонь я з высяй горных
У долы цёмныя нізін,
Ўвальлю цярпеўшым і пакорным
Пазываў сьветлых бацыльлін.
Дзе сон бацькоў хаваў нядолю,
Дзе змоўк дзядоў пладзіў прыгон,—
Разьвею я па вольным полю
Жыцьця сьвядомага агонь.
Па вузкіх межах пройдуць чынна
Да плёнаў ядраных жняцы,
З вясёлай песьняю дзяўчына
Складзе багатыя капцы;
Струною роўнаю прарэжа
Маўклівы кут равун-цягнік,
Бярлог абудзіцца мядзьведжы
І ў багне згіне лесавік.
Над дахам хат, над змрокам вечным
Затуліць смольны дымагар
Яскравым променем стосьвечным
Электры яркае ліхтар.
Багатым полагам разьляжа
Пад цяжкім дзятлікам мурог;
Якая-ж здань мне перавяжа
К навуцы гладзь крывых дарог?
Хто ў сэрцы носіць цень надзеі
На скрутны зьбег маіх умоў,
Хто хоча зыркім сонцавеем
Асьветліць лік старых багоў—
Той зломіць наглае увер'е,
Той скрытны сподзеў разаб'е
Аб сталь напружнага намеру,
Што я ўзахоп узяў сабе.
Знайду я сілу, стане гарту—
Іх мукі доўгія далі—
Працоўнай здольнасьцю упартай
Вярнуцца з ведамі к зямлі...

Утома знак дае прыемны
Махнуць рукой на гэты шлях,
Але я цьвёрды! І дарэмны
Прашкоды ўсе—спыніць мой шаг.

Менск, 1924

# УРАЧЫСТАСЬЦЬ ЖЫЦЬЦЯ

## СПАКОЙ

Сьціх вятрыска. Хвалі годзе
Ў бераг стромы з пенай біцца;
Заспакоена глядзіцца
Чарот стройны ў верхаводзе.
    Памінутна спадам мошка
    Вадзяністы круг ўздымае,
    Які, шырачысь патрошку,
    Незварухнасьць парухае.
Ўзрок ўталопны востра рэжа
Болей локця слой вадзяны
І ў глыбі, імшарай ўбранай,
Сустракае бераг-межу.
    Над вадою, у паветры,
    Пыл узьняты ня рухнецца
    І у кропках ціха мкнецца
    Да люстранай цёмнай нетры.
Нібы чары ахапілі,
Закаваўшы ўсё ў зьнярушшы,
Ждучы новай ўрочнай хвілі,
Калі вецер зноў ўзваруша.

Вількамір, 1912

* * *

Ўзышоў месяц і паўкругам
Ў цёмным небе засьвяціўся,
Па дубраве і над лугам
Срэбным праменем разьліўся.
    Ў зачараваным адзеньні
    Сьпіць трава і сьпяць кусточкі,
    І замёрлі ў шалясьценьні
    Руцяністыя лісточкі.
Ўкрадкай, ціханька гамоне
Мовай сьвежай і рачыстай,
Нібы грае, нібы звоне,
Ручаёк вадою чыстай.
    І ні песьні, і ні зыку
    Круг-вакол не раздаецца.
    Нямой сьцішы зыркім блікам
    Месяц весела сьмяецца.

Капыль, 31/X 1912

## НАД ПАЛЯНАЮ

Белы месяц над палянаю
Кругам срэбным расьсьцілаецца.
Траўка зеленьню руцянаю
Ў небе сінім адбіваецца.

Як пялёнкаю празрыстаю,
Лунь зьвісае, к долу сьцелецца,
І трава кругом расістая
Луньню-мглою белай беліцца.

Як вянком, дубы куповыя
Нярухомы над палянаю
Свае ралы стогадовыя
Апускаюць, лісьцем ўбраныя.

Цені сеткамі паплецены
Пазамёрлі, ня рухаюцца;
Прамя к галу ўсё адмецена
І вярнуцца не стараецца.

А чуць шамне ветрык повеем—
Зашапоча лісьцё з траўкаю,
Быццам гутаркай бязмоўнаю,
Нейкай мяккаю і плаўкаю.

Вількамір, 1912

# АДВЯЧОРАК

Над гаем відна
Чырвоная хмарка адна,
Як тая сьцяжына
На сіняй даліне...
Сьпеў пташак замоўк
І ціха наўкола.
Над поплаўным долам
Высокае неба, як шоўк,
Ад гаю да гаю лажыцца.
На небе зарніца
Разьвіста мігціцца,
Сьвятла раскідаючы восьці...
Зямлі яна першая госьця!
У белым тумане
Вабраныя ланы
Вакол серабрацца.
Расінкі на прам'і іскрацца,
Як пэрлы ў каронцы...
Бяз сонца, а з сонцам?..

Смаленск, 1920

## НАЧНЫЯ ЧАРЫ

Сьціш пануе наўкруг,
Ўсё замоўкла і сьпіць;
Толькі месячны круг
Ў сінім небе гарыць.
І чароўны спакой
Залягае кругом:
Штось шапоча з кустом
І гуляе з травой;
А ў празрыстай вадзе
Ручайкоў і балот
Байкі-казкі вядзе
І цалуе чарот.
Маніць з глыбі вады
Ўсіх русалак-дзяўчат,
Каб на твар іх бляды
Кінуць ласкі пагляд,
Абмяняцца з якой
Мілым ўзрокам вачэй,
Прытуліцца шчакой
Да халодных грудзей...
Далей сьцеле ён цень
Ад калматых дзярэў,
А на кол і на пень
Белы насаў узьдзеў...
Ўверсе-ж, збоку яго,
Цеснай роднай сям'ёй

Зоркі з неба ўсяго
Міргацяць над зямлёй.
Усё-усё на зямлі
Ў начных чарах жыве,
Няжывое здалі—
Весяліцца, пяе!

*Жлобін, 17/IV 1910*

## ІЗНОЎ ВЯСНА

Ізноў вясна, зноў зелень руцянее...
Ізноў вясна, і сэрца прагай млее,
І сэрца ў грудзях палыхае...
    Ізноў вясна, ізноў зіяе
    Праменьнем творчым з неба сонца,
    І смага тне душу бясконца;
    Ўздымае цягу буйна жыць—
    Змагацца з ворагам, тварыць...
    Расквітшай сілаю, мяцежнай,
    Зьнішчаць адвечныя прашкоды...
Ізноў вясна, ізноў свабоды
    Істота прагне маладая
І думкі рдзістыя кідае
    Насустрач сьветлай палкай волі...
Ізноў вясна, ізноў мне поле
Нячутны окліч пасылае:
    „Прыходзь сюды—цябе чакае
    Наліты кубак жыўнай п'яні,
    Які ты вып'еш на спатканьні
    Шчасьлівых хвіль тварйго быцьця—
    Руцяных ніў маіх, дзіця—
    Поэта вольны, гаманлівы"...
І йду я гарды ды зухлівы
    Вясну чароўніцу спаткаць,
    Каб з ёю, пахкаю-шумлівай,
    Жыцьцё самотнае зьвязаць...

Смаленск, 1916

## Я ЖЫЦЬ ХАЧУ

Я жыць хачу, як піць ад смагі;
Я жыць хачу, як сонца ў холад!
Я жыць хачу і повен прагі
Жыцьця, бо ‘шчэ здароў і молад.
Бягучы час, дзянькі, хвіліны
На пальцы пільна я лічу.
І шкода кожнай мне часіны,
Што ўжо прайшла, бо жыць хачу.
Я ў даль глухую пазіраю,
За зданьнем выдумным лячу,
Аб днёх шчасьлівейшых гадаю
І жду іх, жду, бо жыць хачу!
Хачу квятоў, хачу вясельля,
Хачу прыгожых абразоў,
Любошчаў палкіх, хмелю-зельля,
Забыўнай ласкі-кайданоў,
Ўсю зелень поля, сьветласьць сонца,
Весь пах квятоў, весь рэчак цёк
Вабраць ў сябе і ў іх бясконца
Купацца дні—ў сьвятло і ў змрок.
Каб знаць, што я жыву, як трэба,
Ня доўг, ня службу валачу,—
Я зораў бляск, прастораў неба,
Свабоды буйнае хачу.
Як вецер вольны, рэзвы, моцны—
Па галу вольнаму лятаць,

Хто жыць ня хоча—таго злосна,
Таго бяссэрдна праклінаць.
Ўвесь страх, ўвесь сум аб часе сьмерці
Прад думкай сьветлай распыліць,
Душой шчасьлівы, палкі сэрцам
Хачу я жыць, кіпуча жыць!

Пецярбург, 30/IV 1914

* * *

Мілы мне бясконца,
Любы тыя хвілі,
Калі сонца ў небе
Падыходзе к гаю.

І ў абачным воку,
Сінім небасхіле
Ўкрадкаю Вэнэра
З неба мне міргае.

На лугох зялёных
Траўка не шахнецца,
Ветрыкам нізваньня
Ніадкуль ня вее,

Толькі, як ні глянеш,
Вока дзе ні мкнецца—
Жыта ядраное
Вокал палавее.

А ў баку, пры гаі,
Дзе лугоў граніца,
Ліп, вярбін дарожка
Зеленьню руцянай

Закрывае сонцу
Срэбную вадзіцу
Ручайка, што мчыцца
Стужкаю зламанай.

У паветры чыстым
Ўецца над зямлёю
І крычыць-галосіць
Сваю песьню каня,

Быццам-бы з гарачай
Шчыраю мальбою
Просіць кагось ўчуці
Яе крык-праханьне.

Паглядзіш вакола—
Сіла маладая
Ў стомленай істоце
Ўстане-скалыхнецца,

І ты рвешся ўгору
Рвешся ты да гаю,
А парушыць з месца
Не хацеў-бы, здэцца.

Пецярбург, 1915

* * *

Мая хата—постаць нівы,
Ўбранай жытам руцяністым,
Гай зялёны і разьвісты,
Гай высокі і шумлівы;

Луг, шаўковай ўсланы шатай—
Траўкай рутнаю, паёмнай;
Над ім неба круг чароўны,
Сіняй дымкай разапяты.

Мая песьня—шум вятрыскі
Ў гэтым полі, ў гэтым гаю,
Дзе ад краю і да краю—
Шум і гоман, шум і піскі;

Ручайкова пляскатаньне
Аб каменьні, аб карэньні
Ў сваім шыбкім, бурным мкненьні,
Ў сваім хуткім пасьпяваньні.

Мае думкі—блыскі сонца,
Яго промень жыцьцяносны,
Зор мірганьне, бісэр росны,
На квяцянай на каронцы,

Нязжытое праяўленьне
Сілы творчай ў вечным лёце,
Што захована ў істоце
Размаітнага тварэньня.

Магілеў н/Д, 1910

* * *

Белым матылёчкам,
Лёгкім ды вяртлявым,
Па зялёных травах,
Па густых кусточках,
Ў руцяных лісточках,
Ясным днём і ночкай
Я-б хацеў лятаці,
Я-б хацеў лятаці!
Ўвышы і над долам,
Ўперад ды наўкола,
З рэзвасьцю вясёлай
Я-б хацеў насіцца,
Пчолкай рэзвай віцца.
І ў квятох пахучых
Мёдам саладжавым,
К кропелькам бліскучым,
К кропелькам расяным
Я-б хацеў спускацца,
Імі напівацца.
А напіўшысь ўволю,
Ў рожы ды ў куколю,
Ў паплавох і ў полі
З ветрам калыхацца,
З ветрам калыхацца;
З ветрыкам нячутным.
Ў промені мільгутным,

Цёплым залацістым
Над травою рутнай
    Доўга аставацца—
    Сілы набірацца.
Ў гэтых зьявах-цудзе,
Ў гэтым жыўным пудзе,
Пакуль жыцьце будзе,
    Я-б хацеў разьвіцца,
    Я-б хацеў разьвіцца...
Матыльком вяртлявым,
Белым матылёчкам,
Ясным днём і ночкай,
Вечарам і раньнем
Ў лёце нясьціханным.

Пецярбург, 1915

## Я ЖЫВУ

Я жыву ў квятох валошкі,
Ў сьпелым жыце між дарожкі,
У пшаніцы спалавелай,
Ў грэчцы пахкай, ў грэчцы белай.

Жыву ў рэчцы, ў яе мкненьні,
Ў лісьцях вербных шалясьценьні,
У вятрыску ціхавейным.

Я жыву у ясных зорах,
Ў неаглядных тых прасторах,
Што павісьлі парасонам
Над квітучаю зямлёю,
Нібы сходзячыся з ёю.

Я жыву у ясным сонцы,
Ў яго праменнай каронцы
Ў яго сіле незьмяранай;
У вясёлцы, ў зордарожжы,
Ў іх нязьмераным разложжы.

Я жыву у шчабятаньні
Пташак рэзвых цёплым раньнем,
Ў шумным боры, ў калыханьні,
Дрэў стогодніх ў стройным гудзе.

Жыву ў кожнай зьяве-цудзе,
Няпрыкметным і бягучым,
Жыцьцятворчае прыроды,—
Бо я сын яе свабоды,
Зоркаблісная і магучай!

Капыль, 1/IX 1912

## ЗІМНЯЕ

Ў шэрані мяккай дзярэўцы
Гойдаюць ціха галінкі,
Ў сонечным променьні мкнуцца
Лётам павольным сьняжынкі;
Зайца сьляды, як сьцяжынкі,
Сплётам заблытаным ўюцца...

Поле ў бялюткай сукенцы
Мёртвую ціш пераймае...
Сонца ўсё ніжай ступае—
Цені лахматыя доўжыць,
Промень чырвоную ложыць
Стужкамі доўгімі к сьнегу...

Вецер, схаваўшы адлегу,
Туліцца к кусту, у нетры...
Зырка-блішчастым галёнам
Рэзьвяцца кропкі-сьняжынкі,
Сонцу сьмяюцца, а ветру
Шлюць свае шэпты, уклоны.

Змоўклі крыкухі-вароны,
Заяц залез у гушчэчу,
Дрэўцы стаяць, не трапечуць
Ўбраных сьвятошне галінак:
Шкода махнатых сьняжынак—
Гэтага стройнага ўбраньня...
Хто яго нанаў апране?..

Тухне ўжо сонца сіяньне—
Сіняе неба празрысьцей,
Зорка за зоркай ірдзісьцей,
Сьвечкамі ў вечным ліхтары
Сьвецяць на лес, на абшары,
Сонцу шлючы удагонку
Срэбнага сьветла палойку...

16/1 1924

## МНЕ СЭРЦА РАНІЛА СТРАЛА

Мне сэрца раніла страла
І каплю яду зараніла.
Ці знойдзе сэрца маё сілу,
Якая-б рану зажыла?
Ці кроў гарачая ў хадзе,
Ў нястрымным вёрткім павароце
Атруты гэтай не зьвядзе
З нутра ў халодным лёгкім поце?
І будзе пастаць, як раней,
Жывой бурліваю крыніцай
Паіць наніз маіх надзей
І сеяць думкі бліскавіцай?
Я чую-чую, хопе сіл—
Ў крыві гарачай многа жыцьця—
Разгорне дух мой цёмны пыл
Пры стрэчы к радаснаму выйсьцю.
Памкне нястрыманай ракой,
Бурлівай хваляю пагоніць
Пазыў да сонца; й буйны бой
Зноў сэрца палкае зазвоніць...

25/VII 1924

## У МАІМ НУТРЫ...

Ў маім нутры—любові мора
Да вас, зялёныя гаі,
Да вас, міргаючыя зоры,
Да вас, захмарныя краі!

Вялікай сілай сьветавою
Мая істота ўся гарыць,
І прагне сэрца маладое
З прасторам вечным моцна зьвіць.

Бо тыя дзівы, тыя чары,
Якімі поўна неба сінь,—
Па ўсім разгорнутым абшары,
Куды узрокам ты ні кінь,—

Трывожыць сэрца, родзяць зовы,
Ляцець-ляцець, зьнябыўшы жаль,
Шукаць красы ва-векі новай,
Здымаць заслону з цёмных даль;

І гай зялёны, й луг шырокі
Хадой няўпыннай абмяраць,
Ад нізу ўгору, ў гал высокі
Крылатай птушкай узьлятаць;

І ў моры променнага сонца,
Ў мірганьні срэбраным сузор
Лятаць, насіцца там бясконца,
Вакол зьмяраючы прастор;

Лятаць і сэрцам гартавацца
І душу ўзмоцніваць ў агні,
Каб сілу мець ва-век змагацца
За волю й шчасьце на зямлі.

Ў маім нутры —любові мора
Да шыры поля, да гаёў,
Да ўсіх нязьмераных прастораў,
Да ўсіх захованых краёў!

Пецярбург, 1914

## ПАКУЛЬ ЖЫЎ—ДЛЯ МЯНЕ

Зоры й месяц ў вышыне—
Для мяне, для мяне!
Пекнасьць дзіўная палёў,
Песьні пташак, шум гаёў,
Неба сіняе наўкруг,
Увабраны травой луг,
Сьвежы ветрык, што сапне
Над палямі—для мяне,
Для мяне!
Ўзрок дзяўчыніных вачоў,
Зыкі песьняў яе й слоў,
Першай любасьці пазыў,
Што прыветны ўзрок ўлажыў
Ды ўскалыхнуў раптам кроў;
Наша першая любоў
Ўся ў праменьні, ўся ў агне.
Для мяне, для мяне!
Кветкі ў садзе, зелень, пах,
Мак чырвоны на градах,
Срэбнасьць раньняе расы,
Сьвіст сярпа і звон касы,
Рэзвы стук цапоў ў гумне—
Для мяне, для мяне!
Ўсё, што бачыцца вакол:
Неба сінь, зялёны дол,
Рэчка, горы, гай між ніў—

Для мяне, пакуль я жыў,
Пакуль сэрца ў грудзях б'е,
Ўсё красуе, ўсё пяе;
Ўсё гаворыць мне бяз слоў,
Каб я жыў, як гул лясоў
Каб на хвілю я ня нік,
А на кожны жыцьця зык
Змог-бы чула адгукнуць...
Бо, пакуль ня ўсьпеў заснуць
На сьмяртэльным тапчане,
Ўся прыгожасьць для мяне,
    Для мяне!
Там за мною—берагі,
Сьвет інакшы, сьвет другі,
З якім буду гаманіць,
Як жыцьця парвецца ніць,
Як на зьмену днём жывым
Нябыцьцё расьсьцеле дым,
І разьляжа нада мной
Змрок сьмяртэльнаю шатой.
    А цяпер, калі жыву,
    Калі рухаю, лаўлю
Кожны подых, кожны ўзьвей
Жыцьця радаснага дзей
На зямлі і ў вышыне,
    Ўся прыгожасьць—для мяне,
    Для мяне!

Пецярбург, 1915

## ЗЬЛ ТАСЬЦЬ

Я лягу, як у шоўку, у сьвежай траве
І гляджу у бяздоннае неба, у далі,
А разьвістыя думкі снуюць ў галаве
І плятуць сеткі мар, што у сэрца запалі,
І кіпіць пачуцьцё, як бурлівыя хвалі.
        Матылькі нада мною трасуцца, снуюць,
        З сьцябялькоў на лісточкі гасьцінна садзяцца,
        Паяскі свайго лёту мінутныя ткуць,
        І вось-вось прагнуць скрыдламі твару кратацца,
        Каб са мною, прышэльцам да іх, прывітацца.
Мне пяюць незгамонна, мне граюць наўкол
Перапёлкі, цьвіркунчыкі, стрэлкі і восы,
І зьяўляецца з песьнямі іх лёгкакрылы Эол,
Рассыпаючы сонца махрастыя косы
На зялёныя травы, на жыта палосы;
        Ён вядзе па траве нячуваны вятрок,
        І былінкі, і кветкі, і мохрык мятліцы
        На мяне пахіляюць уважліва ўзрок—
        За аднэю адна ка мне мкнуцца туліцца,
        Ўсё завуць, ўсё маняць да сабе прыхіліцца.
І я кідаю ўзрок навакол, як дзіця,
Прагна рвуся аддацца бяскрайнай свабодзе,
Каб быць там, дзе дрыжыць калыханьне жыцьця,
Дзе нябачны, а моцны развой яго ходзе,
І ня чуць ад нікога ніколі сібернага „годзе“.

Сьляпянка, 31/V 1923

## ВОСЕННАЕ

### I

Па зялёнаму лугу блішчастымі плямамі
Кінула восень чырвоныя талеры;
Залацяцца тканіны узорныя хвалямі,
Цешацца вочы дзяўчыніны карыя.
Ці ня там, у дуброве, шумелі бярозамі
Цёплыя летнія ветрыкі-повеі?
Разьвіналіся думкі агністымі рожамі,
Сьпелі жаданьні званкамі, куколямі?
Перапёлкаю рэзваю песьня кацілася,
Мяккай кудзеляю косы спускаліся...
Дратавалася сэрца, аж нікла ў ім сіла ўся:
„Прыдзе ён, прыдзе! Вунь штось паказалася!“
Ў раскалыханых думках—жаданьні праглівыя
Ўсьпеняцца вірам, ўсклякочуць крыніцаю...
Па прагаліне шэрай, пад вольхай санлівою
Пройдуць дзьве поступі сьвежай травіцаю...
Ці ня там? Ці ня тут? Ці даўно? Ўжо за хмарамі
Рэзвы гай нікне бязьлісьнай каронаю...
У аддзяку за тое, што сонца за талеры
Восені стрэчу ўвабрала трызвонамі.

Менск, 1924

## II

Мне кажуць: нудзіць лес згалелы,
І вецер песьняю сумлівай
Над івай шэрай, амярцьвелай
Жуду пяе над соннай нівай;
Гракі крычаць, як б'юць у труны
Цьвякі, каб ўзьдзець на доньнік века.
Жалейка лье нястрымным сумам,
І плача тым-жа сумам рэха.
Мне кажуць: гіне ўздым душэўны
У тумане слотным, ў хмарах шэрых,
Настрой ападае няпэўны,
Няпэўных думак будзіць шэраг.
Мне кажуць: восеньню завецца
Вось гэны вобраз, гэты тэрмін...
А я кажу: то вам здаецца,
То боль у вас сапсутых нэрваў.
Бо ў чым нудлівыя калёры,
Што сэрца ваша так сумуюць?
Ў зялёнай руні, што прасторы
Палёў раскінутых ліцуе?
Ў дажджы, што нівы разьвільжае
Ды глебу поіць жыўным сокам?
У хмарах мяккіх, што зганяе
Іх вецер рэзвы к нам здалёку?
Ці ў шоўку шамкім—ў пухкім лісьці,
Што лес разьдзеў і дол стаптаны

Старэнна ўбраў, гасьцінна выслаў,
А сам пяе зіме вітаньне?
　　Ці ў стуку гучным ў поўных гумнах
　　Цапоў сялянскіх па збажыне,
　　Ці ў песьнях стройных, ў песьнях шумных
　　Вячоркі, дбайнае дзяўчыны?
Мне кажуць: восень—заміраньне,
Жуды глыбокай час ўрачысты...
А я кажу: хто глыбей гляне,
Той жыцьця ўгледзіць промень, іскры!

Менск, 1924

## СЫМФОНІЯ

Мята, ружа, півонь,
Вішань сьпелых чырвонь—
Пах, міланяньне...
Ветру повей ў лісткох,
Дрэўца ціхенькі ўздох—
Рух, калыханьне...
Пчолка, стрэлка мігнуць,
Нітку лёту саўюць—
Струн трапятаньне...
Кропку-роску ў сату
Ўгледзяць і на ляту—
Спуск, ападаньне...
Золата-луч пральле
Сонца на ліст, гальле—
Спор, пукаваньне...
Мошка, мушка, жучок
Сонца рвуць касьнічок—
Рай, лікаваньне...
Зложаны, зьліты сьпеў
Іх між кветак, між дрэў—
Жыцьце, іграньне...
Радасьць, уздым, благадаць,
Прага ў паху растаць—
Вечнасьць яднаньня...

Капыль, 20/VI 1923

## ВОДЫРАМ ПАХКІМ

Водырам пахкім павеялі вішні,
Песьнямі рэзвымі—гоман лясоў;
Сочныя руні палотнішчам пышным
Постаць ўвабралі азьвеўшых палёў.

Поплаў утыкаўся жоўтым янтарам,—
Вочкамі кветак мігнуў курасьлеп;
Жаўранак вёрткі над шэрым папарам
Песьняю славіць квітнеючы сьвет.

Верціцца ломанай стужкай рачулка
Срэбныя ніткі ў ёй шые прамень;
Гаем пазвоньвае водгалас гулкі
Пташак, сплятаючых песьню-дасэнь.

П'янаю хваляю коціць-трапеча
Рагі вясновага трунку эфір;
Голас дзявочы і лёкат авечы
Гоняцца, бегаюць ўдоўжкі і ўшыр.

Полагам тонкім апалі паземы—
Потайкам кінулі ў зрэнкі вачоў—
Вечна нярэшаннай путнай дылемай
Глянула ў душу вакханка-любоў...

Менск, 21/V 1924

## Я ЙДУ ДА ЎСХОДУ...

Я йду да ўсходу вузкай сьцежкай;
Абапал рунь цішком шуміць;
А далей, там, за тонкай межкай,
Абшар лугоў, бы ток, ляжыць.

Супроць мяне на многа гоняў
Сьцяною стаў пануры бор,
І бачу я, як сноп чырвоні
Над борам сьцеле пекны ўзор.

Праз купы дрэў, праз голкі сосен,
Праз лісьці трэплыя дубоў
Лаўлю я ніткі яго кросен
І мяккі выгіб касьнікоў.

Лаўлю і чую, як паволі
У маё нутро праходзіць дух
Якойсьці прагнай буйнай волі,
Пазыў нястрыманы на рух.

Ўстаюць чаргою чыннай, цеснай
Жаданьні палкія, задзёр—
Абняць увесь той гал прадлесны,
Расьлінай высланы прастор.

І чырвань зыркую з-пад бору
Зьнясьці цалком на пахкі дол,
Каб сеяць шчодра мерай спорай
Па ўсёй зямлі, як ёсьць, вакол...

Я йду ўсё далей вузкай сьцежкай,
А ў сэрцы крэпне мой намер,
Ї сонца ласкавай усьмешкай
Мяне вітае з вышніх сфэр.

3/II 1923

## КАЛЯ БОРУ СОНЦА ХОДЗІЦЬ

Каля бору сонца ходзіць
На высокіх ценкіх дыбах,
Чарадою цені водзіць
Па кустох—густых сядзібах—
Доўгакосых,
Тоўстаносых,
Цёмнатварых,
Грозных, ярых
Лясуноў.
З-пад кустоў,
З тайных сховаў,
Вабам, зовам
На палянкі,
На гулянкі,
Насустрэчу сьветлай ночы
Духаў скрытных зазывае,
І ў сьляпыя цемні-вочы
Сітам промень расьсявае.
Вузкіх шляхаў выгіб ломкі
Машастовай руньню ўбраны,
І шнуруюць скокам ёмкім
Німфы-ведзьмы, феі-панны—
На граніцу,
Да крыніцы,
На гуляньне,
Як загляне
Маладзік;

Як з-пад пік
Стройных ёлак
Рысаў голак
Ў блутнай сетцы
Напляцецца

І ўбярэ ваду крыніцы.
Гэй, хавайся, сонца, з неба!
Дай-жа ночы-маладзіцы
Адчыніць сваю бяседу!

Вось і месяц
З крэмню крэсіць—
Сыпле крэйду,
Меліць пэндлем
Воду, бор.
Стада зор
Ў гала гоніць
І гамоніць
Шэптам лісьцяў:
Гэй-жа, выйсьце

На гулянку, на вясельле!..
Бор змаўкае—не шапоча,
Ралкай жаднай не шавеліць,—
На крыніцу ўстраміў вочы.
Ў вярбалозах, ў пухкім моху
Завіліся карагоды;
Вадзянік адставіў лёху
У крыніцы спадысподу.

Вір віруе,
І шнуруе
Градкай лёгкай,
Лентай вохкай
Грэбень хваль.
Плецень-валь
Дымкай шарай
Туліць твары

Фей-русалак,
Што ў прагалак
Між кустамі над крыніцай
Распусьцілі бросьні-косы;
З хітрай мінаю глядзіцца
Ў іх лясун доўгавалосы.
Жаб капэля
Іх вяселіць
Многалікім
Хорам-крыкам
Пявуноў,
Покуль зноў
З па-над бору
Кроўным морам
Пачне ўсходзіць
І заводзіць
Сонца спацыр жыцьцявейны,
Стаўшы ціха ўверх на дыбы...
І пражэцца крохкай ценьню
Усё начовае—ў сядзібы.

Капыль 31/V 1924

# ЗЬМЕСТ

*Стар.*

ПЕСЬНІ ПРАЦЫ Ў ПРЫГОНЕ

Песьні гарбара . . . 49
Гарбар на вандроўцы . . 58
Песьня грабара . . . 61
Каваль . . . . 63
Песьня жняі . . . 64
Калысная песьня . . . 66
Пазыў . . . . . 68
На збанок і йдзі... . . 70
Я ня маю срэбра... . . 71
Касьба . . . . 72
Ткачыха . . . . 74
Без работы . . . 76
Сявец . . . . . 78
Новая хатка . . . 79
За вакном . . . . 81
Хаценьне . . . . 83

ПЕСЬНІ ВОЛЬНАЙ ПРАЦЫ

Панства працы . . . 87
Да працы . . . . 88
Праца . . . . . 89
Пераплёт . . . . 92

РАСЬСЬВІТАНЬНЕ

Жаданьне . . . . 97
Я люблю... . . . . 98
Мая сгыхія . . . 99
Мая хатка . . . . 100
Таварышу . . . . 101
Ня траць часу ні хвіліны... . 102
Званар . . . . 103
Бачыў раз я, як з-пад хмары 104

*Стар.*

*** Ня хістайся, дуб зялёны... 106
Озірк . . . . . 107
Вецер, падуй . . . 108
*** Не хачу забыцьця... . 109
Да надзеі . . . . 110
Бачыў я... . . . . 111
Напярэдадні . . . 113
Клянінка . . . . 114
Калысная песьня . . 115
Змагайся! . . . . 117
Просьба . . . . 118
Дружна з ахвотай... . . 120

ПЕСЬНІ ЗМАГАНЬНЯ

Свабода . . . . 125
Йдзі дарогаю заросшай... . 127
Ня сумі, брат . . . 128
Звон . . . . . 130
Бунт . . . . . 131
Я хацеў-бы. . . . 132
*** Над шумным палацам... 134
Сьцешся! . . . . 136
Маёй песьні далі тоны . 138
Я хацеў-бы пяяць . . 139
Будзь пярэднім . . . 140
На варце . . . . 142
Ад сахі, ад станкоў . . 144
Замацуйма! . . . . 146
Будаўнікі . . . . 147
Далакопам рэволюцыі . . 148
Праца . . . . . 149
Чырвоны сьцяг . . . 150
Наперад, гэй! . . . 152
Чырвонаармейцы . . . 154
Дар . . . . . 156

Стар.

Першае мая . . . . . 158
Песьняру . . . . 160
Ідуць гады . . . . 162
Сьцяна фэдэралістых . . 164

НАСТРОІ

Пазыў . . . . . 169
Мой верш . . . . 170
У дарозе . . . . 171
Хмурынка . . . . 173
Загудзі ты, вецер . . 174
Дзяўчыне . . . . 175
Не сьпявай . . . . 176
Хочацца мне... . . . 177
Хочацца жыць . . . 178
Забушуй ты, рака! . . 180
З цыклю „Горад" . . . 181
Бэрлін . . . . . 183

ВАКОЛА І ЎДАЛЬ

Восеньню . . . . 193
Ручаёк . . . . . 194
Межкі . . . . . 196
Трэба жыць . . . . 197
Пажарыска . . . . 199
Ноччу . . . . . 201
Разьвітаньне . . . . 203
Браты-дубкі . . . . 206
Бежанцы . . . . 208
Поэта, маці і муза . . 211

БЕЛАРУСЬ—БССР

К зорам . . . . . 235
Да Нёмна . . . . 236
Красуй, збожжа! . . . 237
На зьезд . . . . 238
Па дарозе да будучыні . . 240
Ня скрыць сузор'яў цемні ночы... . . . . 242
Працоўнік . . . . 243
БССР . . . . . 245
Радзіма працоўных . . 247
Маладая Беларусь. . . 249
Чырвоная радзіма. . . 251
Беларуска . . . . 257

Стар.

УРАЧЫСТАСЬЦЬ РЭВОЛЮЦЫІ

Я жыву... . . . . 261
Годзе! . . . . . 262
Чырвоны мак . . . 264
Расьсьвітаньне . . . 265
Гадавіна 25 кастрычніка 1917 266
Нараджэньне. . . . 268
Раньш і цяпер . . . 272
Сельскі рэўком . . . 274
Шлях паўстаўшых. . . 276
Гляджу на поле я... . . 277
Да сонца! . . . . 279
Будаваньне . . . . 281
Рожа . . . . . 282
Вечнае . . . . . 283
Хто мы? . . . . 285
Будаваньне . . . . 287
Комунар . . . . 289
Чатыры . . . . 290
Дэлегатка . . . . 292
Дапрызыўнікі . . . 294
Сельскі мітынг . . . 295
Дэманстрацыя . . . 297
Рабфакавец-вясковец . . 299

УРАЧЫСТАСЬЦЬ ЖЫЦЬЦЯ

Спакой . . . . . 305
*** Узышоў месяц... . . 306
Над палянаю . . . 307
Адвячорак . . . . 308
Начныя чары . . . 309
Ізноў вясна . . . . 311
Я жыць хачу . . . 312
*** Мілы мне бясконца... . 314
*** Мая хата—постаць ніва . 316
*** Белым матылёчкам... . 317
Я жыву. . . . . 319
Зімняе . . . . . 321
Мне сэрца раніла страла . 323
У маім нутры . . . 324
Пакуль жыў—для мяне . . 326
Зьлітасьць . . . . 328
Восеннае . . . . 329
Сымфонія . . . . 332
Водырам пахкім . . . 333
Я йду да ўсходу... . . 334
Каля бору сонца ходзіць . 336

ЦАНА 3 р. 60 к.